Г. С. Глушчанка
К. І. Сцепанцэвіч

БЕЛАРУСКАЯ МУЗЫЧНАЯ ЛІТАРАТУРА

Мінск
"Беларусь"

Г. С. Глушчанка, К. І. Сцепанцэвіч

БЕЛАРУСКАЯ МУЗЫЧНАЯ ЛІТАРАТУРА

Дапушчана
Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь
у якасці метадычнага дапаможніка
для выкладчыкаў дзіцячых музычных школ

Мінск "Беларусь" 1993

ББК 74.266.7
Г 55
УДК 372.878

Рэцэнзенты доктар мастацтвазнаўства Г. Р. КУЛЯШОВА,
кандыдат мастацтвазнаўства Б. С. СМОЛЬСКІ

Г 55 Глушчанка Г. С., Сцепанцэвіч К. І.
Беларуская музычная літаратура: Метад. дапам. — Мн.: Беларусь, 1993 —86 с.

ISBN 5-338-00977-3.

Метадычны дапаможнік для выкладчыкаў дзіцячых музычных школ. Складзены адпаведна Праграме па курсу беларускай музычнай літаратуры для музычных школ, зацверджанай Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь.

Г 4905000000—034 58-92
М 301(03)—93

ББК 74.266.7

ISBN 5-338-00977-3

© Г. С. Глушчанка,
К. І. Сцепанцэвіч, 1993

ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Беларуская музычная літаратура — самастойны вучэбны курс у сістэме адукацыі вучняў дзіцячых музычных школ рэспублікі. У задачу курса ўваходзіць азнаямленне вучняў з беларускай прафесійнай і народнай музыкай. Вялікая ўвага ў курсе ўдзяляецца вывучэнню найбольш яркіх твораў беларускай музыкі, іх ідэйна-мастацкага зместу, асаблівасцей музычнай формы і выяўленчых сродкаў.

Гэты дапаможнік складзены з улікам пераемнай сувязі з асноўнымі палажэннямі Праграмы па курсу беларускай музычнай літаратуры для музычных школ, зацверджанай Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь.

Дапаможнік пачынаецца гістарычным аглядам музычнага мастацтва Беларусі (тэма I). Асноўная частка дапаможніка ўключае 15 манаграфій, у якіх разглядаецца жыццёвы і творчы шлях кампазітараў старэйшага і сярэдняга пакаленняў (тэма II). Тут жа праводзіцца разбор і ацэнка найбольш значных твораў гэтых кампазітараў.

Тэма III прысвечана кампазітарам, чыя творчасць сфарміравалася ў 1970—80-ыя гады, пры гэтым у падачы матэрыялу выкарыстаны жанравы прынцып.

У дапаможніку змешчаны наступныя дадаткі:

№ 1. Змест фона- і нотных хрэстаматый для класнай і пазакласнай работы.

№ 2. Дадатковая літаратура ў дапамогу педагогу.

№ 3. А. Народная песня — аснова беларускай музычнай прафесійнай творчасці;

Б. Кароткі пералік беларускіх народных песень і танцаў, выкарыстаных у некаторых творах беларускіх кампазітараў.

№ 4. Беларускія кампазітары старэйшага і сярэдняга пакаленняў (дапаўненне да тэмы II для вывучэння ў пазаўрочны час).

№ 5. Рэкамендацыі па пазакласнай рабоце.

Пры вывучэнні курса беларускай музычнай літаратуры выкладчыку трэба апірацца на нотную літаратуру і запісы беларускай музыкі на пласцінках і магнітафоннай стужцы, якія ёсць у ДМШ.

У якасці вучэбнага матэрыялу можа быць выкарыстаны падручнік Г. Глушчанкі, К. Сцепанцэвіч «Белорусская советская музыкальная литература» (Мн., 1981); фонахрэстаматыя па беларускай музычнай літаратуры для дзіцячых музычных школ (складальнікі Г. Глушчанка, К. Сцепанцэвіч); камплект з дзесяці дыскаў з запісамі нацыянальнай музыкі, выдадзены Усесаюзнай фірмай «Мелодыя» (М71-39235-54. М., 1977); дадатковыя крыніцы, спіс якіх змешчаны ў Дадатку № 2.

Дапаможнік прадугледжвае магчымасць вар'іравання ў выкладанні асноўных тэм курса, свабоднае творчае іх планаванне, разнастайныя формы заняткаў — лекцыйнае выкладанне, гутарку, расказ, «дзелавую гульню», праслухоўванне і разбор музычнага твора з тлумачэннямі і інш.

У канцы кожнай тэмы даюцца пытанні і заданні. Яны могуць відазмяняцца або дапаўняцца ў залежнасці ад падрыхтоўкі вучняў і наяўнасці ў школе вучэбнай літаратуры. Гэту форму работы трэба ўсяляк развіваць, паколькі яна актывізуе творчую дзейнасць вучняў, абуджае ў іх цікавасць да беларускай музыкі.

Прыкладны пералік тэм і сетка гадзін па курсу «Беларуская музычная літаратура» (у двух варыянтах — на 70 і 35 гадзін)

Назва тэмы	Колькасць вучэбных гадзін	
	з разліку 70 гадзін	з разліку 35 гадзін
1	2	3
Тэма I. **Музычнае мастацтва Беларусі (гістарычны агляд)**		
§ 1. Беларуская народная музычная творчасць	2	2
§ 2. Вытокі беларускай прафесійнай музыкі	2	0,5
§ 3. Станаўленне беларускай прафесійнай музыкі	2	0,5
Тэма II. **Беларускія кампазітары старэйшага і сярэдняга пакаленняў ***		
М. М. Чуркін (1869—1964)	3	1
В. А. Залатароў (1873—1964)	3	1
М. І. Аладаў (1890—1972)	4	2
Я. К. Цікоцкі (1893—1970)	3	2
П. П. Падкавыраў (1910—1977)	2	1
Л. М. Абеліёвіч (1912—1985)	4	2
А. В. Багатыроў (1913)	3	2
У. У. Алоўнікаў (1919)	3	1,5
Г. М. Вагнер (1922)	4	2
Ю. У. Семяняка (1925—1990)	3	1
Я. А. Глебаў (1929)	4	2

* Творчасць іншых кампазітараў старэйшага і сярэдняга пакаленняў (А. Туранкоў, М. Крошнер, Г. Пукст, Д. Лукас, Э. Тырманд, Д. Камінскі, І. Кузняцоў, Я. Дзягцярык, К. Цесакоў, Ф. Пыталеў, Р. Сурус) у сувязі з недахопам вучэбных гадзін у праграме рэкамендуецца абавязкова вывучаць пад кіраўніцтвам педагога ў творчых гуртках у пазакласны час.

1	2	3
С. А. Картэс (1935)	4	2
Д. Б. Смольскі (1937)	4	2
А. Ю. Мдзівані (1937)	4	2
І. М. Лучанок (1938)	3	1,5

Тэма III. Творчасць беларускіх кампазітараў малодшага пакалення (кароткі агляд па жанрах)

§ 1. Сімфанічная музыка	2	1,5
§ 2. Камерна-інструментальная музыка	1	0,5
§ 3. Камерна-вакальная музыка	1	0,5
§ 4. Песня	0,5	0,5
§ 5. Хор, араторыя, кантата, вакальна-сімфанічная паэма	2,5	1
§ 6. Музыка для тэатра (опера, балет, музычная камедыя)	2,5	1,5
§ 7. Музыка для аркестра беларускіх народных інструментаў	1,5	0,5
§ 8. Эстрадная музыка	1	0,5
З а к л ю ч э н н е. Сучасны стан беларускай прафесійнай музыкі. Праблемы і перспектывы развіцця	1	0,5

ТЭМА I
МУЗЫЧНАЕ МАСТАЦТВА БЕЛАРУСІ
(гістарычны агляд)

§ 1. БЕЛАРУСКАЯ НАРОДНАЯ МУЗЫЧНАЯ ТВОРЧАСЦЬ

Агульная характарыстыка традыцыйнай беларускай народнай песні*

Адлюстраванне ў песеннай і інструментальнай народнай творчасці жыцця і быту беларускага народа. Меладычная, рытмічная і ладавая своеасаблівасць беларускай народнай вакальнай і інструментальнай музыкі. Глыбіня зместу беларускіх народных песень, разнастайнасць іх відаў і жанраў. Стылістычныя асаблівасці песеннага фальклору. Народнае шматгалоссе (контрапунктычнае 2-, 3-галоснае харавое спяванне з «падводкай»).

Тры асноўныя гістарычна-стылявыя пласты ў народнай музычнай творчасці: старажытны, або раннетрадыцыйны, слой сялянскай класікі; познатрадыцыйны, або познакласічны, стылявы слой; парэформенны гістарычны слой. Іх асаблівасці. Агульнасць стылявых каранёў, пераемнасць сродкаў мастацкай выразнасці пры ўсёй разнастайнасці жанраў і стыляў песеннага фальклору, якая абумоўлена гістарычным развіццём.

Каляндарна-абрадавыя і сямейна-абрадавыя песні

Характарыстыка каляндарна-абрадавых (вяснянкі, валачобныя, юр'еўскія, купальскія, пятроўскія, жніўныя, дажынкавыя, калядныя, масленічныя, троіцкія) і сямейна-абрадавых (вясельныя, радзінныя, пахавальныя) песень.

Музычная літаратура для вывучэння

Вясна-красна	У зб.: Беларускія народныя песні і танцы. Мн., 1949. № 3,
Ой, рана на Йвана	Анталогія беларускай народнай песні. Укладанне, прадмова і каментарыі Г. Цітовіча. Мн., 1968. Вып. 1, № 35
Перапёлка	Анталогія. № 45
Па гарохаўю, па ячанню	Анталогія. № 53
Кума мая, кумачка	Анталогія. № 95
Да дубу, зязюлька	Г. Ширма. Двести белорусских народных песен. М., 1958. № 58

* Пры вывучэнні гэтай тэмы рэкамендуецца разглядаць не менш як дзве песні кожнага жанру (на выбар педагога).

Сямейна-бытавыя, любоўна-лірычныя песні

Кола вобразаў, змест, жанры. Лірычныя, калыханкі, дзіцячыя, жартоўныя, сатырычныя, застольныя, танцавальныя, ігравыя песні, лічылкі, балады, прыпеўкі.

Музычная літаратура:

Люлі, люлі, люлі	У зб.: Беларускія народныя песні і танцы. Мн., 1949. № 76
Камар лазню тапіў	Анталогія. № 109
Ой, рэчанька, рэчанька	Анталогія. № 414
Ох, і сеяла Ульяніца лянок	Анталогія. № 336

Песні няволі і барацьбы за свабоду

Свабодалюбства беларускага народа, нянавісць да прыгнятальнікаў і іншаземных захопнікаў. Вобразы барацьбы і героікі. Батрацкія, казацкія, чумацкія, турэмныя, рэкруцкія, салдацкія песні.

Музычная літаратура для вывучэння:

Ой, палын мой, палыночак	Анталогія. № 279
Прыляцелі гусі	Анталогія. № 153
Павей, ветрык, павей	Анталогія. № 266

Беларуская народная інструментальная музыка

Агульная характарыстыка народнай інструментальнай музыкі. Жанры, выяўленчыя сродкі. Інструментальная музыка ў беларускіх народных абрадах. Цымбалы — аснова беларускага народнага інструментарыя. Іншыя народныя інструменты: ліра, гуслі, дудка, жалейка, дуда, басэтлі, гітара, бубен. Асаблівая роля скрыпкі ў музычным быце. Народныя інструментальныя ансамблі, іх саставы. Пастухоўскія і вясельныя найгрышы, танцавальныя мелодыі.

Музычная літаратура для вывучэння:

Мяцеліца	Анталогія. № 329
Юрачка	Анталогія. № 330
Антон маладзенькі	Анталогія. № 342
Лявоніха	Анталогія. № 327
Бульба	Анталогія. № 332

Пытанні і творчыя заданні па тэме:

Пералічыце асноўныя віды традыцыйных беларускіх народных песень, дайце іх кароткую характарыстыку.

Назавіце і ахарактарызуйце старадаўнія беларускія народныя інструменты.

Якія вы ведаеце беларускія народныя танцы? Раскажыце пра іх.

Пазнаёмцеся са зборнікамі Р. Шырмы «Беларускія народныя песні» (Мн., 1959—1976. Т. 1—4) і ахарактарызуйце іх.

Вывучыце і ахарактарызуйце выданне: Анталогія беларускай народнай песні. Укладанне, прадмова і каментарыі Г. І. Цітовіча. Мн., 1975.

Літаратура для чытання:

Мухаринская Л. Белорусская народная песня. Историческое развитие: Очерки. Мн., 1977.

Можейко З. Песенная культура белорусского Полесья. Мн., 1971.

Цитович Г. О белорусском песенном фольклоре: Сб. избранных очерков. Мн., 1976.

Назина И. Белорусские народные музыкальные инструменты. Мн., 1979. Вып. 1. 1982. Вып. 2.

Чурко Ю. Белорусский народный танец. Мн., 1972.

§ 2. ВЫТОКІ БЕЛАРУСКАЙ ПРАФЕСІЙНАЙ МУЗЫКІ

Разнастайнасць вытокаў прафесійнай музычнай культуры, якія ўваходзяць каранямі ў народную творчасць.

Мастацтва скамарохаў, жанравая разнастайнасць іх творчасці; скамарохавыя «спектаклі», якія ўключаюць драматычную ігру, танцы, інструментальныя найгрышы; «ілюстрацыйная» роля музыкі ў скамарохавых гульнях. Удзел скамарохаў у абрадавых дзействах — калядах, вяселлях і інш.

Адраджэнне на тэрыторыі Беларусі ў канцы XV—XVI стст. нацыянальнай культуры, узмацненне гуманістычных ідэй у жыцці грамадства, з'яўленне прагрэсіўных тэндэнцый у літаратуры і грамадскай думцы. Дзейнасць беларускіх асветнікаў: Францыска Скарыны (1490—каля 1551), Міколы Гусоўскага (1480—1533), Сымона Буднага (каля 1530—1593) і інш. Устанаўленне культурных і эканамічных сувязей Беларусі з іншымі краінамі. Павышэнне ролі праваслаўных царкоўных брацтваў у жыцці беларусаў.

Асаблівая роля XVI і XVII стагоддзяў у станаўленні на беларускіх землях прафесійных традыцый у галіне музычнага мастацтва.

Шырокае распаўсюджанне з канца XVI і ў XVII—XVIII стст. народнага лялечнага батлеечнага тэатра, сувязь з традыцыямі скамарохавых дзействаў, уключэнне жартоўных і сатырычных песень. Папулярызацыя батлейкі ў шырокіх масах шкалярамі і семінарыстамі. Сюжэтная двухпланавасць батлейкі: рэлігійнае дзейства (біблейскія казанні, звязаныя з тэмай стварэння свету і нараджэння Хрыста) і камічныя эпізоды з народнага жыцця (а ў некаторых выпадках інсцэніроўкі народных песень, напрыклад, «Антон з казой і Антоніха з даёнкай») у антрактах паміж дзействамі.

Эвалюцыя сюжэтаў батлейкі, паступовы адыход на другі план рэлігійнай тэмы і ўзмацненне народна-бытавых камічных матываў, а таксама музычнага суправаджэння. Удзел у паказах батлейкі ў якасці суправаджэння ансамбляў: адна або дзве скрыпкі і бубен; скрыпка, цымбалы, дуда (або бубен). Выкарыстанне ў батлейках народных мелодый, танцаў, інструментальных найгрышаў (ва ўступах да дзействаў і ў інтэрмедыях), унісоннага спявання (або дуды), харавога спявання

кантаў і псалмоў (у традыцыйным рэлігійным дзействе). Драматургічна арганізуючая роля музыкі, асабліва танцаў, такіх, як полька, «Лявоніха», «Казачок», і інш., а таксама песень. Некаторая агульнасць батлейкі з традыцыямі народнага заходнееўрапейскага тэатра і прынцыпамі школьнага тэатра Беларусі. Батлейка як папярэднік прафесійных форм тэатральнага мастацтва.

Функцыяніраванне на тэрыторыі Беларусі з апошняй трэці XVI ст. школьнага тэатра ў навучальных установах каталіцкіх калегіумаў. Агульны напрамак дзейнасці гэтага тэатра. Школьныя драмы і оперы, іх змест, структура, аўтары.

Драматургічная і ілюстрацыйная роля музыкі. Уключэнне ў спектаклі хораў, арый, рэчытатываў, вакальных дыялогаў, камерна-інструментальных інтэрлюдый (або інтэрмедый), «хораў-балетаў», іх чаргаванне з дэкламацыяй і танцамі. Пераламленне ў музыцы школьных спектакляў стылявых асаблівасцей культавай, свецкай і народнай музыкі. Эвалюцыя школьнага тэатра к сярэдзіне XVIII ст., узмацненне ў ім дэмакратычных, свецкіх элементаў. Засваенне школьнай сцэнай вопыту прафесійнага музычнага тэатра. З'яўленне з канца XVIII ст. школьнай оперы, якая захоўвала традыцыі школьных драм і ў той жа час мела рысы, уласцівыя для опер XVIII ст.

Камічная опера «Апалон-заканадаўца, або Рэфарміраваны Парнас» (1789 г.) Р. Вардоцкага — адзіны ўзор жанра школьнай оперы са значнай роллю музыкі ў драматургіі твора, які захаваўся да нашых дзён. Пераламленне ў оперы прафесійных традыцый еўрапейскага музычнага тэатра і дасягненняў беларуска-польскага мастацтва канца XVIII ст.

Кароткая характарыстыка оперы. Яе нумарная структура, роля рэчытатываў, арый і ансамблевых сцэн. Аркестравае суправаджэнне, выкарыстанне ў ім традыцый сучаснай інструментальнай музыкі. Прастата меладычных абрысаў, народна-нацыянальны каларыт музыкі.

Значная роля ў развіцці прафесійных традыцый беларускай музыкі ў XVI—XVII стст. царкоўна-пеўчага выканальніцкага мастацтва. Падрыхтоўка прафесійных кадраў царкоўных пеўчых у праваслаўных брацтвах, а таксама ў кафедральных, езуіцкіх і пратэстанцкіх школах. Дзейнасць Афанасія Філіповіча (1597—1648) і Сімяона Полацкага (1629—1680). Высокі ўзровень развіцця царкоўнага спявання. З'яўленне ў другой палове XVI стагоддзя першых друкаваных нотных зборнікаў — «Брэсцкі канцыянал», «Нясвіжскі песеннік».

Культура кантаў і псалмоў — вакальна-харавой творчасці, якая зарадзілася ў гарадскім і сялянскім быце Беларусі ў другой палове XVI ст. З'яўленне свецкай народна-бытавой музыкі. Стылявыя рысы кантаў і псалмоў. Іх змест і разнастайнасць. Беларуская кантавая культура — сведчанне высокага ўзроўню развіцця песнятворчасці ў перыяд уздыму нацыянальнай самасвядомасці; распаўсюджанне беларускіх кантаў і псалмоў у Расіі ў другой палове XVII—пачатку XVIII ст.

Важная роля ў развіцці прафесійных музычных і культурных традыцый у Беларусі прыватнаўласніцкіх тэатраў, якія ўзніклі ў

другой палове XVIII ст. Іх сувязь з традыцыямі агульнаеўрапейскай тэатральнай культуры.

Дзейнасць прыватнаўласніцкіх тэатраў у Нясвіжы, Слоніме, Гродне, Шклове і іншых гарадах. Адлюстраванне мастацкіх густаў дваранскіх і разначынных колаў насельніцтва.

Оперна-балетны рэпертуар тэатраў, яго пацяшальны характар. Пастаноўка камічных опер італьянскіх, французскіх і нямецкіх кампазітараў. Дэмакратычныя і антыфеадальныя тэндэнцыі некаторых твораў. Удзел у спектаклях побач з замежнымі артыстамі мясцовых спевакоў і інструменталістаў — выхадцаў з прыгонных і мяшчан. Падрыхтоўка выканаўцаў музычных тэатраў у спецыяльных школах. Высокі прафесійны ўзровень оперных труп Беларусі.

Паяўленне першых оперных твораў у рэпертуары прыватнаўласніцкіх тэатраў у сярэдзіне і другой палове XVII ст. Аднаактная опера «Шчаслівае няшчасце» (1752 г., аўтар тэксту княгіня У. Ф. Радзівіл; імя кампазітара невядома, музыка не захавалася).

Стварэнне гамбургскім кампазітарам І. Д. Голандам, кіраўніком нясвіжскай капэлы, рада камічных опер у традыцыях зінгшпіля. Сярод іх — «Агатка, або Прыезд гаспадара» (прэм'ера 1784 г., лібрэта ў вершах М. Радзівіла). Кароткая характарыстыка оперы. Рознастылёвасць яе музыкі (уплыў кампазітараў-мангеймцаў, камічных опер А. Грэтры і інш., а таксама польскага і беларускага фальклору).

Роля прыватнаўласніцкіх тэатраў у фарміраванні нацыянальных кадраў музыкантаў-выканаўцаў, у засваенні імі дасягненняў замежнага мастацтва, у фарміраванні ў Беларусі слухацкага асяроддзя — адукаваных аматараў музычнага мастацтва.

Роля ў народным і прыдворным быце Беларусі XVII—XVIII стст. паратэатральных дзействаў (рознага роду гарадскіх святкаванняў, урачыстасцей, відовішчаў, маскарадаў, шэсцяў) — важнага атрыбута культурнага жыцця гарадоў, якое ўзнікла да музычнага тэатра, а ў далейшым існавала паралельна з ім. Выкарыстанне ў паратэатральных дзействах элементаў тэатралізацыі і розных відаў мастацтва — выяўленчага, дэкаратыўна-прыкладнога, архітэктурнага і інш. Разнастайнасць функцый і віды музыкі ў паратэатральных дзействах, яе абумоўленасць зместам дзействаў. Удзел у гарадскіх святочных цырымоніях прафесійных выканаўцаў — капэл, касцёльных і прыватнаўласніцкіх аркестраў, воінскіх аркестраў. Значэнне свецкіх паратэатральных дзействаў у развіцці музычнага тэатра і ў фарміраванні слухацкага асяроддзя.

Развіццё ансамблевага выканальніцкага мастацтва ў Беларусі ў другой палове XVIII—пачатку XIX ст.

Распаўсюджанне свецкага музіцыравання ў маёнтках дваран, магнатаў; арганізацыя аматарскіх канцэртаў. Функцыяніраванне прыгонных аркестраў у Слоніме, Нясвіжы, Гродне, Ружанах, Шклове, Віцебску, іх рэпертуар і высокае прафесійнае майстэрства.

Беларускія скрыпачы-аматары: кампазітар гетман Міхал Казімеж Агінскі (Слонім), кіраўнік гарадскога магістрата Антоній Цізенгауз

(Гродна), Міхаіл Клеафас Агінскі (Смаргоншчына), Рудольф Цізенгауз (Жалудок, Гродзенскай губерні) і інш. Уклад прыгонных аркестраў, ансамбляў і скрыпачоў у развіццё нацыянальных традыцый выканальніцкай культуры.

Распад Рэчы Паспалітай у выніку трох падзелаў у апошняй трэці XVIII ст. Уключэнне Беларусі ў склад Расіі ў 1795 годзе. Узмацненне цікавасці грамадскіх колаў Беларусі XIX ст. да нацыянальнай гісторыі, народнай творчасці. Развіццё адукацыі, кнігадрукавання. Актывізацыя творчай дзейнасці беларускіх літаратараў, драматургаў, мастакоў. Ажыўленне музычнага жыцця. Арганізацыя аркестравых і харавых калектываў, прыватных музычных школ, канцэртаў з удзелам вядомых рускіх і замежных музыкантаў і інш. Далейшае развіццё музычна-тэатральнага мастацтва; дзейнасць перасоўных оперна-драматычных антрэпрыз, іх арыентацыя на гарадскія разначынныя слаі насельніцтва. Рост дэмакратычных тэндэнцый у музычным быце, стварэнне мясцовых тэатральна-мастацкіх традыцый. Музычна-драматычны гурток пад кіраўніцтвам В. Дуніна-Марцінкевіча (пачатак 40-ых гадоў XIX ст.).

Беларускія кампазітары XIX ст.: Карл Ельскі (Дудзічы, Мінскай губерні) — стваральнік скрыпічных канцэртаў і інструментальных п'ес; І. Глінскі (Гродна) — арганіст, аўтар рамансаў і інструментальных мініяцюр; Канстанцін Кржыжаноўскі — педагог і скрыпач, які разам з С. Манюшкам стварыў аперэту «Рэкруцкі набор» і камічную оперу «Сялянка» (Мінск); Іеронім Памарнацкі (скрыпач са Слуцка) — стваральнік скрыпічнай музыкі; Міхаіл Ельскі — скрыпач-віртуоз, аўтар каля ста твораў для скрыпкі, у тым ліку двух канцэртаў, фантазіі на тэмы польскіх народных мелодый, канцэртнай мазуркі «Успаміны аб Варшаве» і інш.; А. Абрамовіч — педагог, аўтар фартэпіяннай паэмы «Беларускае вяселле», апрацовак народных мелодый для фартэпіяна, а таксама для голасу з аркестрам (Пецярбург); П. Карафа-Корбут (з Нясвіжа) — стваральнік танцавальных п'ес і інш.

Актывізацыя дзейнасці фальклярыстаў у другой палове і ў канцы XIX ст., выданне зборнікаў тэкстаў і народных мелодый.

Рубеж XIX—XX стст. Грамадска-дэмакратычны рух у Беларусі, цяга да нацыянальнага самасцвярджэння. Абнаўленне форм музычнага быту, сцвярджэнне ў творчай практыцы ідэй дэмакратызацыі. Інтэнсіўнасць канцэртна-выканальніцкага жыцця; гастролі оперных і музычна-драматычных труп; правядзенне сімфанічных канцэртаў. Актыўнасць мясцовых выканальніцкіх сіл. Творчая дзейнасць кампазітараў Л. Рагоўскага, М. Кімант, І. Шадурскага, С. Шымкуса, М. Анцава.

Прапаганда беларускіх народных песень і танцаў першым нацыянальным драматычным тэатрам, якім кіраваў І. Буйніцкі.

Выканальніцкая і музычна-грамадская дзейнасць у Мінску скрыпачоў Е. Чыжэўскага (стварэнне музычнага таварыства, сімфанічнага аркестра, інструментальных ансамбляў, работа ў якасці дырыжора) і М. Рубінштэйна (адкрыццё ў Мінску ў 1907 г.

музычнага вучылішча, у 1912 годзе — таварыства сяброў музыкі; кіраўніцтва сімфанічным аркестрам).

Музычнае жыццё ў Гродне, Віцебску, Магілёве, Брэсце, Гомелі і іншых гарадах Беларусі.

Гістарычныя карані музычнага мастацтва беларускага народа. Стварэнне фундаменту прафесійнай музычнай культуры ў Беларусі на працягу рада стагоддзяў. Пераемная сувязь традыцый музычнага мастацтва мінулага з беларускай сучаснай музыкай.

Пытанні і творчыя заданні па тэме:

Што вы ведаеце аб Сафійскім саборы і Спаса-Ефрасіньеўскай царкве ў Полацку?

Раскажыце аб Адраджэнні ў Беларусі XVI—XVII стст.

Да якога перыяду гісторыі беларускага народа адносяцца школьныя тэатры і батлейкі? Коратка ахарактарызуйце іх.

Хто такі Сімяон Полацкі? Якая яго роля ў развіцці беларускай культуры?

Што вам вядома аб прыгонных тэатрах і аркестрах Беларусі XVIII ст.?

У кнізе А. Капілава «Скрипка белорусская» (Мн., 1982) прачытайце нарыс аб беларускім скрыпачу XIX ст. Міхаіле Ельскім і падрыхтуйце пра яго паведамленне ў класе.

Наведайце краязнаўчы музей вашага горада (раённага цэнтра) і вывучыце помнікі культуры вашага краю.

Знайдзіце ў гарадской (раённай) бібліятэцы альбомы, кнігі, гравюры, дзе паказаны музыканты, народныя святкаванні і абрады. Ахарактарызуйце іх.

Літаратура для чытання:

История белорусской музыки /Под общ. ред. *Г. С. Глущенко*. М., 1976.

Барышев Г. Театральная культура Белоруссии эпохи феодализма (историко-хронологический очерк) // Вопросы культуры и искусства Белоруссии. Мн., 1983. Вып. 3.

Смольский Б. Белорусский музыкальный театр. Мн., 1963.

Костюковец Л. Кантовая культура в Белоруссии. Мн., 1975.

Капилов А. Скрипка белорусская. Мн., 1982.

Масленікава В. Музычная адукацыя ў Беларусі. Мн., 1980.

Музычная літаратура для вывучэння:

Песнапенні пра Ефрасінню Полацкую (расшыфроўка Н. Сяргінай).

Беларускія канты.

«Полацкі сшытак» — помнік музычнай культуры Беларусі XVI—XVII стст. (2—3 нумары).

Р. Вардоцкі. Опера «Апалон-заканадаўца, або Рэфарміраваны Парнас» (2—3 фрагменты).

Нясвіжская меса (фрагмент).

І. Д. Голанд. Опера «Агатка, або Прыезд пана»: арыя Валянціны.

Міхаіл Клеафас Агінскі. Паланез «Развітанне з Радзімай».

І. Шадурскі. Музычная камедыя «Тарас на Парнасе»: «Лявоніха». М. Ельскі. П'есы для скрыпкі.

§ 3. СТАНАЎЛЕННЕ БЕЛАРУСКАЙ ПРАФЕСІЙНАЙ МУЗЫКІ

Станаўленне беларускай музычнай культуры на аснове мастацкага вопыту мінулага і новых з'яў.

Супярэчлівы шлях развіцця беларускай музычнай культуры ва ўмовах таталітарнага рэжыму СССР.

Музычнае жыццё Беларусі 1920—30-ых гадоў. Плённае, хоць і не пазбаўленае супярэчнасцей і складанасцей, развіццё музычнай культуры рэспублікі ў гэты перыяд.

Стварэнне ў Беларусі культурных цэнтраў і навукова-даследчых устаноў. Узнікненне масавай мастацкай самадзейнасці, харавых, танцавальных і аркестравых калектываў, опернай студыі, беларускага музычнага радыёвяшчання. Работа па эстэтычнаму выхаванню.

Роля кампазітараў М. Чуркіна, М. Аладава, Я. Цікоцкага, А. Туранкова ў станаўленні беларускай прафесійнай кампазітарскай школы.

Творчыя вынікі дзейнасці беларускіх кампазітараў 1930-ых гадоў. Стварэнне Саюза кампазітараў БССР (1932). Першая дэкада беларускага мастацтва і літаратуры ў Маскве (1940).

Беларуская музыка ў перыяд Вялікай Айчыннай вайны (1941—1945). Творчы ўклад беларускіх кампазітараў у агульную справу разгрому ворага. Стварэнне патрыятычных песень, рамансаў, кантат, сімфанічных твораў і оперы «Алеся» Я. Цікоцкага. Удзел кампазітараў і выканаўцаў у франтавых канцэртных брыгадах.

Інтэнсіўная творчая работа кампазітараў пасля вайны ў жанрах оперы, балета, сімфоніі, кантаты, араторыі, рамансa, інструментальнай і харавой музыкі, масавай і сольнай песні. Адлюстраванне ў музычнай творчасці разнастайнай тэматыкі гістарычнага мінулага народа (оперы «Кастусь Каліноўскі» Д. Лукаса, «Яснае світанне» А. Туранкова, «Надзея Дурава» А. Багатырова, балет «Князь-возера» В. Залатарова, «40 год» М. Аладава і інш.); Вялікай Айчыннай вайны (оперы «Марынка» Р. Пукста, «Дзяўчына з Палесся» Я. Цікоцкага, сімфанічныя паэмы «Партызанская быль» У. Алоўнікава, «Вечна жывыя» Г. Вагнера, кантаты «Беларускім партызанам» А. Багатырова, «Памяці Канстанціна Заслонава» Ю. Семянякі, песні У. Алоўнікава аб мужных воінах і партызанах і інш.); мірнай стваральнай працы людзей (песні У. Алоўнікава, П. Падкавырава, кантата «Поля степные» І. Кузняцова і інш.); барацьбы за мір і дружбу паміж народамі (Чацвёртая сімфонія Я. Цікоцкага, Трэцяя сімфонія П. Падкавырава, сімфанічная сюіта «Песні міру» У. Алоўнікава і інш.); патрыятызму і любові народа да Радзімы; вобразаў беларускай прыроды і інш. Стварэнне Н. Сакалоўскім Дзяржаўнага гімна БССР (1955).

1960—80-ыя гады — новы этап у развіцці беларускай музыкі,

значных якасных змен, узбагачэння традыцый, жанраў, форм, сродкаў музычнай выразнасці. Удзел у гэтым працэсе кампазітараў усіх пакаленняў.

Узмацненне ўвагі кампазітараў да сучасных тэм. Праяўленне новых тэндэнцый, у першую чаргу ў сімфанічнай музыцы (Л. Абеліёвіч, А. Багатыроў, Я. Глебаў, М. Аладаў, Д. Смольскі, Г. Вагнер, С. Картэс, А. Мдзівані, Ф. Пыталеў, У. Дарохін, У. Дамарацкі, В. Войцік, Э. Зарыцкі, Р. Сурус і інш.) і ў балетным жанры (Я. Глебаў, Г. Вагнер, У. Кандрусевіч і інш.). Абнаўленне традыцый у жанрах кантаты і араторыі (А. Багатыроў, С. Картэс, Д. Смольскі, В. Войцік, Л. Шлег, Г. Гарэлава, В. Помазаў і інш.); вакальнай (Ю. Семяняка, С. Картэс, Э. Тырманд, І. Лучанок, Э. Ханок, В. Іваноў, Э. Зарыцкі, Л. Захлеўны) і камерна-інструментальнай музыкі (С. Картэс, Д. Смольскі, К. Цесакоў), а таксама ў радзе опер (С. Картэс, Г. Вагнер, Ю. Семяняка, У. Солтан).

Прыход у беларускую музыку новага пакалення кампазітараў. Развіццё ў іх творчасці традыцый беларускай, рускай, а таксама замежнай музыкі (Г. Гарэлава, Н. Літвін, В. Сярых, У. Солтан, А. Бандарэнка, А. Елісеенкаў, В. Кандрусевіч, В. Кузняцоў, У. Кур'ян, А. Залётнеў, А. Сонін, Л. Мурашка і інш.).

Складанасць і супярэчнасць развіцця беларускай прафесійнай музыкі ў канцы 1970 — першай палове 80-ых гадоў ва ўмовах застойнага перыяду, панавання аўтарытарнай, адміністрацыйна-бюракратычнай сістэмы кіраўніцтва мастацтвам.

Некаторае зніжэнне мастацкага ўзроўню творчасці беларускіх кампазітараў.

Выканальніцкае мастацтва беларускіх музыкантаў і артыстаў, іх актыўная музычна-асветніцкая дзейнасць. Прафесійныя калектывы Беларусі: Дзяржаўны акадэмічны Вялікі тэатр оперы і балета, Дзяржаўны акадэмічны сімфанічны аркестр, Дзяржаўны народны хор імя Г. І. Цітовіча, Дзяржаўная акадэмічная харавая капэла імя Р. Р. Шырмы, Дзяржаўны народны аркестр імя І. І. Жыновіча, Акадэмічны хор Беларускага радыё і тэлебачання, Дзяржаўны камерны аркестр Беларусі, Беларускі дзяржаўны ансамбль «Песняры» і інш.

Шырокі паказ нацыянальнай музыкі за межамі рэспублікі. Удзел беларускіх выканаўцаў у фестывалях, аглядах, дэкадах.

Творчыя кантакты і ўзаемасувязь беларускіх кампазітараў з іншымі музычнымі культурамі — крыніца плённага развіцця нацыянальнай прафесійнай музыкі ў пасляваенны перыяд. З'езды і пленумы беларускіх кампазітараў.

Беларуская музыка на сучасным этапе.

Пытанні і творчыя заданні па тэме:

Што вам вядома аб музычным жыцці Беларусі 1920—30-ых гадоў?

Якое адлюстраванне ў творчасці беларускіх кампазітараў атрымала тэма Вялікай Айчыннай вайны?

Раскажыце аб вядомых беларускіх музыкантах і выканальніцкіх калектывах пасляваеннага перыяду.

Назавіце беларускіх кампазітараў, чыя творчая дзейнасць пачалася ў канцы 1970-ых гадоў.

Пад кіраўніцтвам выкладчыка падрыхтуйце па кнізе К. Сцепанцэвіч «Новыя тэндэнцыі ў развіцці беларускага музычнага мастацтва канца 50—першай паловы 70-ых гадоў» (Мн., 1981) невялікае паведамленне-даклад аб новых з'явах у беларускай музыцы 1960—70-ых гадоў.

Зрабіце ў класе паведамленне аб вобразна-тэматычным змесце беларускіх кантат і араторый, створаных у 1960—80-ых гадах.

Літаратура для чытання:

Нисневич И., Нисневич С. Очерки по истории советской белорусской музыкальной культуры. Л., 1969.

Нисневич С. Белорусская музыкальная литература. Мн., 1981.

Степанцевич К. Новые тенденции в развитии белорусского музыкального искусства конца 50 — первой половины 70-х годов. Мн., 1981.

История белорусской музыки /Под ред. *Г. Глущенко*. М., 1976.

Г. Цітовіч ва ўспамінах сучаснікаў: Зб. матэрыялаў. Мн., 1990.

Жураўлёў Д. Генадзь Цітовіч. Біяграфічны нарыс. Мн., 1969.

Нисневич И. Григорий Романович Ширма. Л., 1964.

Песня на ўсё жыццё: Успаміны аб Р. Р. Шырме /Склад. *В. Сізко*. Мн., 1983.

Рыгор Шырма /Аўтар-склад. *В. Ліцвінка*. Мн., 1990.

Чурко Ю. Белорусский балет в лицах. Мн., 1988.

Загородний Г. Музыки высокое призвание. Мн., 1988.

Романовская Л. Хор белорусского радио и телевидения. Мн., 1975.

ТЭМА II
БЕЛАРУСКІЯ КАМПАЗІТАРЫ СТАРЭЙШАГА І СЯРЭДНЯГА ПАКАЛЕННЯЎ

МІКАЛАЙ МІКАЛАЕВІЧ ЧУРКІН (1869—1964)

Жыццёвы і творчы шлях М. Чуркіна. Гарачая любоў да музыкі ў дзіцячыя гады. Вучоба ў Тыфліскім музычным вучылішчы ў класе кампазіцыі М. Іпалітава-Іванова (1888—1892); далучэнне да традыцый рускай музычнай класікі. Работа пасля заканчэння вучылішча ў якасці настаўніка музыкі і кіраўніка музычных гурткоў у г. Баку.

Пераезд у 1903 г. у Паўночна-Заходні край; выкладанне музыкі ў Каўнасе, Вільнюсе і іншых гарадах; праяўленне жывой цікавасці да беларускай народнай песні. Першыя запісы нацыянальнага фальклору, выданне іх у 1910 г.

Творчая і музычна-грамадская дзейнасць М. Чуркіна ў г. Мсціслаўлі пасля 1917 г.; напісанне песень, хораў для самадзейных калектываў. Стварэнне першай беларускай прафесійнай оперы «Вызваленне працы». Апора на традыцыі рускай класічнай музыкі ў оперы, выкарыстанне беларускіх народных мелодый і тэм рэвалюцыйных песень.

Пераезд М. Чуркіна ў 1924 г. у Магілёў, яго ўдзел у музычным жыцці горада. Стварэнне рада значных твораў (сімфаньета «Беларускія карцінкі», «Калыханка» для струннага квартэта, рамансы на вершы беларускіх паэтаў).

Мінскі перыяд жыцця М. Чуркіна (з 1935 г.); творчая актыўнасць кампазітара (музычная камедыя «Кок-сагыз», дзіцячая радыёопера «Рукавічка», дзве сюіты для сімфанічнага аркестра, цыкл рамансаў і песень на вершы Я. Купалы і Я. Коласа). Творчасць М. Чуркіна ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Творы кампазітара, напісаныя ў апошняе дзесяцігоддзе жыцця.

Характарыстыка творчасці М. ЧУРКІНА

М. Чуркін — народны артыст Беларусі, адзін з заснавальнікаў нацыянальнай музыкі, стваральнік першай беларускай оперы і першых сімфанічных твораў. Шырокі жанравы дыяпазон яго творчасці, пераемная сувязь з традыцыямі класікаў рускай музыкі — М. Рымскага-Корсакава, М. Балакірава, А. Лядава, а таксама А. Арэнскага і М. Іпалітава-Іванова. Адлюстраванне жыцця і быту беларускага народа (опера «Вызваленне працы»). Глыбокае веданне эстэтычнай сутнасці нацыянальнага песеннага і танцавальнага фальклору як асновы прафесійнай творчасці. Кантыленнасць музыкі, веданне прыроды беларускага меласу, яго рытмічных і ладавых асаблівасцей, уменне перадаць манеру ігры народных выканаўцаў, тонкі мастацкі густ і фантазія — адметныя стылёвыя рысы музыкі цудоўнага беларускага майстра. М. Чуркін — фалькларыст. Яго збіральніцкая дзейнасць. Характарыстыка зборніка «Беларускія народныя песні і танцы». Мн., 1949.

Сімфаньета «Беларускія карцінкі»
Сі-бемоль мажор (1925)

«Беларускія карцінкі» — першы нацыянальны сімфанічны твор. Адлюстраванне ў ім вобразаў народнага быту. Выкарыстанне ў творы мелодый шаснаццаці народных беларускіх песень (у запісе аўтара). Сувязь сімфаньеты з праграмна-аркестравай музыкай рускіх кампазітараў. Роля творчасці М. Чуркіна ў развіцці беларускага праграмнага сімфанізму.

«Калыханка»
для струннага квартэта (1927)

Паэтычны, лірычны характар адначасткавай мініяцюры. Выкарыстанне ў творы фальклорных мелодый — «Не хадзі, коцік» і «Люлі, люлі, спаткі». Маляўнічае варыянтнае іх развіццё.

Пытанні і творчыя заданні па тэме:

Назавіце мелодыі песень і танцаў, выкарыстаных М. Чуркіным у Сімфаньеце Сі-бемоль мажор.

У якой музычнай форме напісана кожная з частак Сімфаньеты?

Па якіх крыніцах сёння можна ахарактарызаваць оперу «Вызваленне працы»; на чыё лібрэта яна створана?

Хто з беларускіх музычных дзеячаў працаваў у Магілёве ў перыяд пастаноўкі оперы М. Чуркіна?

Над чым працаваў і што стварыў М. Чуркін у гады Вялікай Айчыннай вайны і ў пасляваенны перыяд?

Падрыхтуйце даклад-паведамленне аб жыццёвым і творчым шляху М. М. Чуркіна па брашуры Д. Жураўлёва «Большая дорога. Народный артист БССР Н. Н. Чуркин».

Правядзіце параўнальную характарыстыку «Калыханкі» М. Чуркіна і «Колыбельной» А. Лядава (для голасу і фартэпіяна).

Літаратура для чытання:

Журавлев Д. Большая дорога: Народный артист БССР Н. Н. Чуркин (биографический очерк). Мн., 1964.

Ширма Г. Глубокий след: К 100-летию со дня рождения Н. Чуркина // Сов. Бел. 1969. 22 мая.

Музычная літаратура для вывучэння:

Сімфаньета Сі-бемоль мажор (фінал).

Калыханка.

ВАСІЛЬ АНДРЭЕВІЧ ЗАЛАТАРОЎ
(1873—1964)

В. А. Залатароў — кампазітар, адзін з заснавальнікаў музычнай адукацыі ў Беларусі, выхавацель першых беларускіх кампазітараў, якія сталі пасля вядомымі майстрамі беларускай музыкі.

Жыццёвы і творчы шлях В. А. Залатарова. Гады вучобы ў Пецярбургскай прыдворнай капэле пад кіраўніцтвам А. Лядава і М. Балакірава і ў Пецярбургскай кансерваторыі ў класе кампазіцыі М.

Рымскага-Корсакава. Роля кампазітараў-класікаў у фарміраванні ідэйна-прафесійнага вобліку маладога музыканта.

Ранні перыяд творчасці. Стварэнне сімфанічных твораў (Элегія, уверцюра «Вясковае свята», Першая сімфонія), квартэтаў, кантаты «Рай і Перы». Прысуджэнне кампазітару прэмій імя М. І. Глінкі, М. М. Бяляева, С. І. Танеева.

Актыўная творчая дзейнасць В. Залатарова ў сталы перыяд. Работа над операй, балетамі, сімфоніямі, інструментальнымі п'есамі, хорамі, музыкай да драматычных спектакляў. Адлюстраванне ў творах жыцця і быту народа, падзей з гісторыі Радзімы.

Педагагічная дзейнасць В. Залатарова ў музычных ВНУ Масквы, Адэсы, Кіева.

Мінскі перыяд у жыцці і творчасці кампазітара (1933—1941), дзейнасць у якасці прафесара, загадчыка кафедры кампазіцыі Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі. Выяўленне вялікай цікавасці да гісторыі беларускага народа, вывучэнне народных песень і танцаў. Сачыненне апрацовак беларускіх народных мелодый для голасу і сімфанічнага аркестра (цыкл «Кантрасты», 1933), для хору а капэла («Ах ты, сад, ты, мой сад» і «Ох, і сеяла Ульяніца лянок», 1935).

Работа над Чацвёртай сімфоніяй «Беларусь» (1934). Паказ у ёй тэматыкі грамадзянскай вайны і працоўных будняў савецкага народа; выкарыстанне ў музыцы сімфоніі тэмы беларускай песні «Відзіць маё вока, што край недалёка». Стварэнне танцавальнай сюіты на тэматычнай аснове беларускіх народных мелодый («Юрачка», «Лявоніха», «Бульба», «Янка», «Ой, рэчанька, рэчанька»).

Творчая дзейнасць В. Залатарова ў гады Вялікай Айчыннай вайны ў Маскве. Уверцюра-фантазія на беларускія тэмы для сімфанічнага аркестра (1943) і «Святочная уверцюра». Вакальныя кампазіцыі паслявае-нных гадоў на тэксты беларускіх аўтараў.

Правядзенне ў Мінску ў 1958 г. ва ўрачыстай абстаноўцы юбілею В. Залатарова — 85-годдзя з дня нараджэння і 60-годдзя творчай дзейнасці.

Характарыстыка творчасці В. ЗАЛАТАРОВА

Жанравая разнастайнасць (оперы, балет, сімфонія, уверцюры, сюіты, камерна-інструментальныя творы, хоры, апрацоўкі народных мелодый і інш.). Развіццё ў творах кампазітара класічных традыцый.

Вялікая цікавасць да жыцця і культуры народаў Расіі, Украіны, Беларусі, Узбекістана, Таджыкістана. Прысвячэнне шэрага твораў тэматыцы брацкіх народаў. Глыбокае спасціжэнне стылявых асаблівасцей беларускага фальклору.

Асаблівая цяга кампазітара да сімфанічнай і оперна-балетнай музыкі: шэсць сімфоній, шэраг сімфанічных уверцюр і сюіт, оперы «Дзекабрысты» і «Хвясько Андыбер», балет «Князь-возера».

Роля В. Залатарова ў фарміраванні беларускай нацыянальнай кампазітарскай школы. Яго ўклад у развіццё розных жанраў беларускага балета і сімфанічнай музыкі.

Балет «Князь-возера» (лібрэта В. Вайнонена, М. Смірнова па сцэнарыю М. Клімковіча, 1948).

Аснова сюжэта «Князь-возера» — барацьба беларускага народа з прыгнятальнікамі за шчасце і свабоду. Выкарыстанне ў балеце беларускіх народных легендаў. Канфліктнасць драматургіі твора. Музычная характарыстыка народа. Выкарыстанне ў масавых сцэнах беларускіх народных мелодый («Юрачка» і «Крыжачок»). Музычныя характарыстыкі Васіля, Надзейкі, Хмары, Князя. Роля аркестра ў балеце.

Пытанні і творчыя заданні па тэме:

Раскрыйце ідэйна-мастацкую задуму балета «Князь-возера».

У чым выявіўся ўплыў творчасці М. Рымскага-Корсакава на музыку балета В. Залатарова?

Запомніце асноўныя лейтматывы балета. Якія тэмы праходзяць ва уверцюры?

Назавіце беларускія народныя мелодыі, выкарыстаныя кампазітарам у балеце.

Па клавіры балета «Князь-возера» прасачыце развіццё асноўных лейтматываў.

Прачытайце кнігу В. Залатарова «Воспоминания о моих великих учителях, друзьях и товарищах». Коратка ахарактарызуйце творчыя прынцыпы кампазітара, яго погляды на мэты і задачы мастацтва, ролю мастацкага асяроддзя г. Пецярбурга і рускіх кампазітараў-класікаў — М. Балакірава, М. Рымскага-Корсакава, А. Глазунова і інш. у фарміраванні В. Залатарова.

Як паказаны ў балеце адмоўныя персанажы? Назавіце ў музыцы балета складаныя гарманічныя комплексы (гукарад Рымскага-Корсакава, цэлатонную гаму).

Літаратура для чытання:

Нисневич С. В. А. Золотарев. М., 1964.

Золотарев В. Воспоминания о моих великих учителях, друзьях и товарищах: Автобиографический очерк. М., 1957.

Музычная літаратура для вывучэння:

Балет «Князь-возера» (дуэт Надзейкі і Васіля з I дзеяння; адажыо Надзейкі і Князя з II дзеяння).

МІКАЛАЙ ІЛЫЧ АЛАДАЎ (1890—1972)

М. І. Аладаў — адзін з заснавальнікаў нацыянальнай прафесійнай музыкі і арганізатараў музычнай адукацыі ў Беларусі, прафесар, народны артыст Беларусі.

Дзіцячыя і юнацкія гады, самастойнае вывучэнне музычнай граматы, авалоданне ігрой на фартэпіяна, стварэнне першых п'ес.

Роля ў выхаванні маладога музыканта рускага этнографа і кампазітара Я. Прохарава, вучня М. Рымскага-Корсакава. Заканчэнне гімназіі і здача экстэрнам у 1910 годзе экзаменаў за поўны курс

кампазітарскага факультэта Пецярбургскай кансерваторыі. Пачатак творчага шляху: сачыненне фартэпіяннай санаты, двух цыклаў рамансаў на вершы А. Кальцова і інш.

Гады работы М. Аладава ў Пецярбургу (1917—1919), у Казані (1919—1923) і ў Маскве (1923—1924). Стварэнне Першай сімфоніі, апрацовак чувашскіх і марыйскіх народных песень для голасу і фартэпіяна. Работа ў Маскве ў Дзяржаўным інстытуце музычных навук. Вывучэнне шматнацыянальнага песеннага фальклору народаў СССР. Цікавасць да беларускіх народных мелодый. Сустрэча ў Маскве з Я. Купалам, стварэнне на яго тэксты рамансаў «Сасонка», «Лета», а таксама апрацовак беларускіх песень.

Запрашэнне М. Аладава ў 1924 г. у Мінск на работу ў музычны тэхнікум. Пачатак педагагічнай дзейнасці ў Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі з моманту яе адкрыцця (1932).

Творчая дзейнасць М. Аладава ў 1920—30-ыя гады. Цікавасць да жанраў апрацоўкі беларускай народнай песні, раманса, камерна-інструментальнай музыкі. Стварэнне камічнай оперы «Тарас на Парнасе», сімфанічных твораў (Другая сімфонія, паэма «Мацней за смерць», фантазія «Казка-быль», Сімфаньета і інш.), кантаты «Над ракой Арэсай», хораў.

Творчая дзейнасць М. Аладава ў гады Вялікай Айчыннай вайны ў Сарататве; напісанне рада патрыятычных твораў, у тым ліку сімфанічнай паэмы «З дзённіка партызана», сімфанічнай балады «У суровыя дні».

Пасляваенны перыяд творчасці М. Аладава (Мінск, 1944—1972). Актыўны ўдзел у музычным жыцці рэспублікі, стварэнне значных твораў розных жанраў (у тым ліку оперы «Андрэй Касценя» — аб барацьбе народа з фашысцкімі акупантамі, аб бессмяротным подзвігу беларускага народа-героя).

Уклад кампазітара ў музычную адукацыю рэспублікі, выхаванне вялікай групы кампазітараў і музыказнаўцаў.

Характарыстыка творчасці М. АЛАДАВА

Цесная сувязь кампазітара з жыццём народа, яго бытам і гісторыяй; адлюстраванне ў творах важнейшых падзей сучаснасці. Разнастайнасць тэматыкі і жанраў: дзесяць сімфоній, дзве оперы, балет, уверцюры, паэмы, сюіты для сімфанічнага аркестра, кантаты і араторыі, камерна-інструментальныя творы, хоры, рамансы, апрацоўкі народных песень.

Вялікая ўвага кампазітара да песеннага фальклору. Захапленне прыёмам цытавання ў ранніх творах. Глыбокае пранікненне ў стылістыку народна-песеннай творчасці, выкарыстанне яе асаблівасцей у кампазіцыях пасляваеннага перыяду.

Пераважныя адносіны да жанру сімфоніі. Адлюстраванне ў сімфоніях розных бакоў жыцця беларускага народа, яго духоўнага свету, стваральнай працы, карцін прыроды. Выкарыстанне ў сімфоніях традыцый класікаў. Трактоўка сімфоніі як драматычнага музычнага апавядання. Функцыі частак цыкла, якія паслядоўна раскрываюць мастацкую задумку твораў. Прынцып праграмнасці. Па-

каз у сімфоніях жанравых, лірычных, скерцазных, гераічных, драматычных вобразаў. Разнастайнасць прыёмаў развіцця музычных форм.

Выяўленне народна-нацыянальнага пачатку, прыёмы аркестравага пісьма (супрацьпастаўленне аркестравых груп, вылучэнне чыстых тэмбраў).

Актуальнасць тэматыкі кантат і араторый кампазітара: «Над ракой Арэсай» (1933), «40 год» (1957), «Па шляху барацьбы і перамог» (1967). Развіццё ў творчасці М. Аладава класічных прынцыпаў. Тэндэнцыя ўзбагачэння традыцый у позняй творчасці М. Аладава (Дзевятая і Дзесятая сімфоніі).

Фартэпіянны квінтэт (1925)

Разнастайнасць музычнага зместу: жанравыя і лірычныя вобразы — у першай частцы, драматычныя — у другой, жанравыя — у трэцяй (фінал). Шырокае выкарыстанне ў квінтэце напеваў беларускіх народных песень.

Сімфаньета До мажор (1936)*

Светлы, жыццярадасны характар твора. Адлюстраванне карцін народнага быту, беларускай прыроды. Яркасць тэматычнага матэрыялу, выразнасць музычнай структуры частак цыкла.

Песенна-лірычныя вобразы першай часткі; настрой суму, роздуму і танцавальныя вобразы — у другой; святочны, радасны настрой — у трэцяй. Інтанацыйная сувязь фіналу з музыкай другой і першай частак сімфоніі.

Дзевятая сімфонія Соль мажор (1967)

Прысвячэнне сімфоніі 50-годдзю БССР. Развіццё ў сімфоніі некаторых рыс лірыка-драматычнага сімфанізму П. Чайкоўскага. Увасабленне ў музыцы, побач з вобразамі аб'ектыўнага жанрава-бытавога плана, суб'ектыўнага псіхалагічнага пачатку.

Своеасаблівасць драматургічнага плана сімфоніі: ад змрочных роздумаў (уступ да сімфоніі) да вобразаў святла і жыццесцвярджэння (фінал).

I частка — дынамічная, імклівая музыка, якая малюе гераічныя вобразы (санатная форма);

II частка — светлая, пастаральная; лірычны цэнтр сімфоніі (складаная трохчасткавая форма);

III частка — скерца, якое раскрывае вобразы негатыўных сіл (складаная трохчасткавая форма);

IV частка — урачысты, радасны фінал (санатная форма).

Стылістыка сімфоніі: наяўнасць мудрагелістых, падкрэслена гуллівых тэм, актыўнай мелодыка-рытмічнай, варыяцыйнай і поліфанічнай распрацоўкі; уключэнне ў развіццё імправізацыйных пабудоў, вылучэнне чыстых тэмбраў інструментаў і інш., тэндэнцыя да асучаснівання музычнай мовы, перадачы эмацыянальнага музычнага тонусу, аптымістычнага настрою.

---

* Твор прызначаны для самастойнай работы вучняў.

Пытанні і творчыя заданні па тэме:

Раскажыце аб творчай дзейнасці М. І. Аладава ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

Ці ёсць адрозненне ў падыходзе да фальклорнага матэрыялу ў ранніх і пазнейшых творах кампазітара?

Хто з беларускіх кампазітараў вучыўся ў М. І. Аладава?

Якія вы ведаеце апрацоўкі беларускіх народных песень у М. Аладава?

Якія мелодыі беларускіх народных песень выкарыстаны ў фартэпіянным квінтэце М. Аладава?

Прачытайце брашуру Г. Куляшовай «Николай Ильич Аладов» (Л., 1970). Падрыхтуйце даклад аб оперы «Андрэй Касценя».

Самастойна вывучыце рамансы М. Аладава «Леў і кот» (сл. М. Слабодскага), «Лета» (сл. Я. Купалы). Ахарактарызуйце іх вобразна-паэтычную задуму і сродкі музычнага ўвасаблення.

Азнаёмцеся з партытурай сімфаньеты До мажор. У класе разам з настаўнікам вызначце характар яе музыкі, своеасаблівасць аркестроўкі (устанавіце, якім інструментам даручаюцца асноўныя тэмы), прасачыце інтанацыйную сувязь музыкі фіналу з музыкай першай і другой частак.

Літаратура для чытання:

Нисневич С. Народный артист БССР Н. И. Аладов. Мн., 1959.

Степанцевич К. Шестая симфония Н. Аладова // Советская симфония за 50 лет. Л., 1967.

Кулешова Г. Николай Ильич Аладов. Л., 1970.

Шчарбакова Т. Дзевятая сімфонія М. Аладава // Музыка нашых дзён. Мн., 1975.

Голикова Л. К вопросу о претворении принципа программности в симфонической поэме Н. Аладова «Из дневника партизана» // Вопросы культуры и искусства Белоруссии. Мн., 1984. Вып. 3.

Музычная літаратура для вывучэння:

Фартэпіянны квінтэт (ч. II).
Сімфаньета До мажор (ч. I).
Дзевятая сімфонія (ч. III, скерца).

ЯЎГЕН КАРЛАВІЧ ЦІКОЦКІ (1893—1970)

Я. К. Цікоцкі — народны артыст СССР, адзін са стваральнікаў асноў нацыянальнай прафесійнай музыкі.

Жыццёвы і творчы шлях кампазітара. Дзіцячыя і юнацкія гады Я. Цікоцкага ў Пецярбургу, вучоба ў прыватным музычным вучылішчы і медыцынскім інстытуце. Першыя творы ў студэнцкія гады (рамансы, п'есы для фартэпіяна, гарманізацыя народных песень). Прызыў у армію ў гады Першай сусветнай вайны; удзел у вызваленні Беларусі ад белапалякаў. Дэмабілізацыя Я. Цікоцкага з Чырвонай Арміі ў 1924 годзе, работа ў музычна-мастацкіх установах г. Бабруйска.

Паяўленне першых буйных музычных твораў — Першай сімфоніі (1929), музычнай камедыі «Кухня святасці» (1931), узмацненне цікавасці да беларускага песеннага фальклору.

Росквіт кампазітарскай дзейнасці Я. Цікоцкага ў 1930-ыя гады, пераезд у г. Мінск (1934). Стварэнне фартэпіяннага трыо, балады для голасу і фартэпіяна, вакальных маналогаў на вершы А. Пушкіна, музыкі для радыёпастановак і для спектакляў драматычных тэатраў. Напісанне оперы «Міхась Падгорны» ў садружнасці з паэтам П. Броўкам (1938), Другой сімфоніі (1940—1941).

Творчая дзейнасць Я. Цікоцкага ў гады Вялікай Айчыннай вайны ва Уфе, у Горкім і Маскве; стварэнне патрыятычных песень, рамансаў, балад для голасу і фартэпіяна, новай рэдакцыі вакальна-сімфанічнай паэмы «Буравеснік» на тэкст М. Горкага; работа над операй «Алеся» (1943) і пастаноўка яе ў канцы 1944 г. у вызваленым Мінску.

Інтэнсіўная творчая дзейнасць Я. Цікоцкага ў пасляваенны перыяд. Стварэнне новай рэдакцыі оперы «Алеся», чатырох сімфоній, дзвюх уверцюр, канцэртаў для фартэпіяна і сімфанічнага аркестра, музыкі да драматычных спектакляў («Паўлінка» Я. Купалы, «Трэцяя патэтычная» М. Пагодзіна і інш.) і кінафільмаў; хораў, песень, рамансаў, твораў для духавога аркестра і аркестра беларускіх народных інструментаў.

Актыўная музычна-грамадская дзейнасць Я. Цікоцкага ў якасці мастацкага кіраўніка Беларускай дзяржаўнай філармоніі, старшыні Праўлення Саюза кампазітараў Беларусі і інш.

Характарыстыка творчасці Я. ЦІКОЦКАГА

Маштабнасць мастацкіх задум, грамадзянская гуманістычная накіраванасць твораў Я. Цікоцкага. Апора на традыцыі класікаў рускай і замежнай музыкі; творчае выкарыстанне сучасных фальклорных крыніц, а таксама песень рэвалюцыі і грамадзянскай вайны. Даніна Цікоцкага гераічнаму стылю, прыўзнятасці, аратарскаму пафасу, плакатнасці, маршавым рытмам і інтанацыям.

Дэмакратызм і аптымістычная накіраванасць творчасці кампазітара.

Вакальна-сімфанічная паэма «Буравеснік» (1920, другая рэдакцыя — 1936, трэцяя рэдакцыя — 1946)

Выкарыстанне аднайменнай паэмы М. Горкага, ускоснае адлюстраванне ў трэцяй рэдакцыі твора героікі Вялікай Айчыннай вайны. Вобразны змест кампазіцыі, выкарыстанне ў музычным развіцці лейтматываў, характэрных тэм у адпаведнасці з тэкстам («вобраз Буравесніка», «бліск маланак», «ракатанне мора», «крык чаек» і інш.). Асаблівасці музычнай кампазіцыі вакальна-сімфанічнай паэмы (санатная форма).

Чацвёртая сімфонія Фа мажор (1955—1956)

Праграмная задума сімфоніі — прысвячэнне твора барацьбітам за мір. Сувязь музыкі з беларускім фальклорам.

Увасабленне ў першай частцы драматычных вобразаў (санатная форма), у другой — лірычнага зместу (складаная трохчасткавая форма; выкарыстанне ў сярэдняй частцы песні англійскіх маракоў), у

трэцяй — жанравага пачатку (ронда). Чацвёртая частка — фінал (санатная форма з эпізодам замест распрацоўкі), дзе даецца характарыстыка абаронцаў міру.

Адзінства тэматычнага матэрыялу, значэнне лейтматываў у сімфоніі.

Опера «МІХАСЬ ПАДГОРНЫ» (лібрэта П. Броўкі, 1938)

Народна-музычная драма на рэвалюцыйны сюжэт. Раскрыццё ў оперы грамадскага канфлікту і асабістай драмы. Яркая роля хораў, звязаных з характарыстыкай народа. Хоры «Па гарохаўю, па ячанню» (дзеянне I), «Дзе ты быў, салавейка?» (дзеянне II), «Няхай сабе, пойдзем мы ў салдаты» (дзеянне III). Выкарыстанне ў оперы мелодый і інтанацый беларускіх народных песень. Вобразы Міхася і Марысі. Песня Міхася з хорам (дзеянне III), арыя Марысі «Плача рэчка з ручайкамі» (дзеянне II).

Роля аркестра ў оперы. Значэнне лейтматываў вайны, народнага гора, кахання Міхася і Марысі. Праграмны змест уверцюры.

Пытанні і творчыя заданні па тэме:

Раскажыце аб раннім этапе творчай дзейнасці Я. Цікоцкага, першых яго буйных музычных творах (1920—30-ыя гады).

Як праходзіла работа Я. Цікоцкага над операй «Дзяўчына з Палесся» («Алеся»)? Колькі ёсць рэдакцый гэтай оперы?

Што вам вядома аб беларускай сімфанічнай музыцы даваеннага перыяду? Якая ў ёй роля сімфоній Я. Цікоцкага?

Якія вы ведаеце рамансы і хоры, апрацоўкі беларускіх народных песень Я. Цікоцкага?

У якіх творах Я. Цікоцкага выкарыстоўваюцца тэмы народных песень? Якая сэнсавая роля гэтых тэм у творах?

Па клавіры вакальна-сімфанічнай паэмы «Буравеснік» вывучыце і пакажыце на фартэпіяна асноўныя тэмы.

Самастойна прааналізуйце трэцюю частку Чацвёртай сімфоніі Я. Цікоцкага.

Азнаёмцеся з песняй Марфачкі «Вечар, вечар» з оперы «Алеся». Раскрыйце яе вобразна-сэнсавы змест і драматургічную функцыю ў оперы.

Літаратура для чытання:

Гусин И. Евгений Карлович Тикоцкий. М.,— Л. 1965.

Глущенко Г. Четвертая симфония Е. Тикоцкого // 55 советских симфоний. Л., 1961.

Нисневич И. Новое рождение «Міхася Падгорнага» // Сов. муз., 1958. № 5.

Нісневіч С. Яўген Цікоцкі. Мн., 1972.

Кулешова Г. Вопросы драматургии оперы. Мн., 1979.

Музычная літаратура для вывучэння:

Асноўныя тэмы вакальна-сімфанічнай паэмы «Буравеснік».

Чацвёртая сімфонія (ч. III).

Опера «Міхась Падгорны»: арыя Марысі з II дзеяння; песня Міхася з хорам з III дзеяння; хор «Па гарохаўю, па ячанню» з I дзеяння.

ПЁТР ПЯТРОВІЧ ПАДКАВЫРАЎ (1910—1977)

П. П. Падкавыраў — заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі, вядомы кампазітар і педагог Беларусі.

Дзіцячыя і юнацкія гады ў Чэлябінску. Вучоба з 1928 г. у Свярдлоўскім музычным тэхнікуме ў класе прафесара В. Залатарова. Пераезд у г. Мінск у 1933 годзе і заканчэнне адукацыі ў Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі ў класе прафесара В. Залатарова. Работа інспектарам рэпертуарнай камісіі, а затым інспектарам Упраўлення па справах мастацтваў БССР. Стварэнне ў студэнцкія гады кантаты «Воевода» на вершы А. Пушкіна, санаты для фартэпіяна, струннага квартэта, Першай сімфоніі («Юнацтва»), оперы «Павел Корчагин» па раману М. Астроўскага «Как закалялась сталь», рамансаў і песень.

Эвакуацыя ў пачатку Вялікай Айчыннай вайны ў г. Майкоп. Вяртанне ў Мінск у 1944 г. Актыўная творчая дзейнасць: узнаўленне Першай сімфоніі, якая згарэла ў час вайны, работа над вакальным цыклам «Партызаны» на вершы беларускіх паэтаў, кантатай «Балада пра чатырох заложнікаў» на вершы А. Куляшова, творамі для розных інструментаў, у тым ліку канцэртамі для скрыпкі, віяланчэлі, фартэпіяна, сачыненнямі для аркестра народных інструментаў («Калгасная сюіта» № 1, «Беларуская рапсодыя»), для хору, камерных ансамбляў, песнямі для дзяцей.

Пасляваенныя гады — перыяд росквіту творчасці: завяршэнне новай рэдакцыі оперы «Павел Корчагин» (1958), клавір якой быў страчаны ў час вайны; напісанне твораў педагагічнага рэпертуару, якія сталі папулярнымі сярод маладых выканаўцаў. Плённая педагагічная дзейнасць у якасці дацэнта па класу кампазіцыі і музычна-тэарэтычных дысцыплін у Беларускай кансерваторыі. Шматлікія творчыя сустрэчы са школьнікамі, вучнямі ПТВ, студэнтамі вышэйшых і сярэдніх навучальных устаноў рэспублікі.

Характарыстыка творчасці П. ПАДКАВЫРАВА

Стварэнне П. Падкавыравым твораў рознага жанру: оперы, твораў для салістаў, хору і сімфанічнага аркестра, сімфоній (іх пяць), п'ес буйной і малой формы для духавога аркестра і аркестра народных інструментаў. Камерна-інструментальныя творы: пяць струнных квартэтаў, Квінтэт для фартэпіяна, Квінтэт для флейты, габоя, кларнета, фагота і валторны; Квартэт для 4 флейт; Квартэт-паэма для габоя, англійскага ражка і дзвюх віяланчэлей; Квартэт для 4 кларнетаў і інш. Арыгінальнасць і змястоўнасць фартэпіяннай музыкі, яе жанравая накіраванасць: 2 санаты, Санаціна-юмарэска, 24 прэлюдыі, 5 накцюрнаў, 8 эцюдаў, ансамблі для двух фартэпіяна і інш. Творы для скрыпкі, альта, віяланчэлі, кантрабаса, габоя, кларнета, валторны, трубы, трамбона, домры і інш.

Вакальныя творы: хоры («Добрай раніцы», «Заручыны» на сл. М. Танка, «Песня пра Гагарына», «Дарогі» на сл. А. Русака і інш.); для голасу з фартэпіяна («Алеся», «А зязюлька кукавала» на сл. Я. Купалы, «Ластаўкі-арлёнкі», «Песня пра мір» на сл. А. Дзеружын-

скага, сюіта «Дзіцячыя песні» на сл. Э. Агняцвет); рамансы на сл. Г. Гейнэ, Р. Бёрнса («Англійская сюіта») і інш.

Глыбіня зместу, разнастайнасць тэматыкі твораў; перавага юнацкай і дзіцячай тэматыкі (сімфонія «Юнацтва», сюіта «Піянерскі касцёр міру», «Дзіцячыя песні» і інш.). Даступнасць і вобразнасць музыкі, яе сувязь з беларускай народнай песняй (цытаванне мелодый, стварэнне ў народным духу, выкарыстанне каларыту народных інструментаў і інш.). Зварот да фальклорных інтанацый музыкі іншых народаў: грузінскай, азербайджанскай, таджыкскай, узбекскай, туркменскай (сімфонія № 3 «Дружба народаў»).

У ліку найбольш характэрных рыс музыкі П. Падкавырава — меладызм, арыгінальныя рытмічныя і аркестрава-тэмбравыя знаходкі, выразнасць і ўсхваляванасць, задушэўнасць і шчырасць. Выкананне рада твораў кампазітара (Другі скрыпічны канцэрт, 24 прэлюдыі для фартэпіяна) за межамі рэспублікі (Масква, Кіеў, Адэса, Вільнюс).

Другі канцэрт для скрыпкі з фартэпіяна Соль мажор (1955)

Прысвячэнне канцэрта моладзі. Жыццярадаснасць музыкі, прыгажосць мелодыі, лірызм пачуццяў. Класічныя традыцыі ў трактоўцы жанру канцэрта. Умелае выкарыстанне выяўленчых і тэхнічных магчымасцей скрыпкі. Тэмбрава-каларыстычныя знаходкі ў фінале канцэрта (напрыклад, імітаванне народнага інструмента — балалайкі). Меладычная і гарманічная свежасць музычнай мовы. Нацыянальная афарбоўка яго інтанацый. Выкарыстанне ў фінале тэмы беларускай народнай песні «Кума мая, кумачка».

Кампазіцыя канцэрта — тры часткі з уступам. Уступ — апавядальная мелодыя саліруючай скрыпкі; I частка — санатная форма з песенна-танцавальнай тэмай галоўнай партыі, песенна-лірычнай тэмай пабочнай партыі, жанрава-бытавой музыкай распрацоўкі і жыццесцвярджальнымі, валявымі інтанацыямі коды; II частка (трохчасткавая форма) — лірычны цэнтр твора з паэтычным гучаннем саліруючага інструмента (раманс) і «крыштальнасцю» аркестроўкі, заканчваецца кадэнцыяй, «сатканай» з музычных тэматычных ніцей усіх частак канцэрта; III частка — фінал (ронда-саната) — народна-бытавая сцэна, заснаваная на плясавых і песенна-танцавальных мелодыях.

24 прэлюдыі для фартэпіяна з аркестрам (1943)

Цыкл п'ес з праграмнай задумай, які ўключае вобразы рознага эмацыянальна-мастацкага плана. Выкарыстанне бытавых жанраў — марша, вальса, раманса, накцюрна, тарантэлы. Выразная роля гармоніі, рытму; прымяненне сродкаў імправізацыйнага і рэчытатыўнага пісьма, гукавыяўленчасці. Прэлюдыі № 6 (Ля мінор) і № 20 (Фа-дыез мажор) — найбольш яркія ўзоры цыкла.

Прэлюдыя № 6 — п'еса лірычнага настрою, дзе перадаецца свет мар, успамінаў; выразнасць у ёй верхняга голасу, які вядзе ўсхваляваную мелодыю з характэрным асцінатным рытмічным малюнкам і эмацыянальна-трывожнай, храматычна сыходнай лініяй баса; выразнасць падгалосачных папевак пры паўторным правядзенні музычнага матэрыялу.

Прэлюдыя № 20 — п'еса прамяністага тону з акордава-кампактнай фактурай выкладання, шырынёй і ўрачыстасцю тэмы, яркасцю кульмінацыі — выніку дынамічнага развіцця ўсяго твора.

Пытанні і творчыя заданні па тэме:

Якія музычныя жанры знайшлі найбольш шырокае адлюстраванне ў творчасці П. Падкавырава?

Якія вершы беларускіх паэтаў выкарыстаў П. Падкавыраў у вакальнай музыцы?

Назавіце найбольш папулярныя творы П. Падкавырава.

Складзіце пералік твораў П. Падкавырава, якія выконваюцца вучнямі ў класах па спецыяльнасці ў вашай музычнай школе.

Арганізуйце ў школе канцэрт з твораў П. Падкавырава.

Зрабіце даклад або ўступнае слова да канцэрта, выкарыстаўшы для гэтай мэты брашуру Д. Жураўлёва «Пётр Падкавыраў».

Літаратура для чытання:

Жураўлёў Д. Пётр Падкавыраў. Мн., 1971.

Нисневич И., Нисневич С. Очерки по истории советской белорусской музыкальной культуры. Л., 1969.

Глущенко Г., Степанцевич К. Белорусская советская музыкальная литература. 1-е изд. Мн., 1969. 2-е изд. 1981.

Сізко В. Опера П. Падкавырава «Павел Карчагін» // Музыка нашых дзён. Мн., 1970.

Глущенко Г. Белорусский концерт. Сов. муз., 1958, № 2.

Музычная літаратура для вывучэння:

Другі канцэрт для скрыпкі з аркестрам (ч. II і ч. III).
24 прэлюдыі для фартэпіяна: № 6, № 20.

ЛЕЎ МАЙСЕЕВІЧ АБЕЛІЁВІЧ (1912—1985)

Вядомы кампазітар Беларусі, сімфаніст, аўтар рада значных твораў камерна-інструментальнай і вакальнай музыкі, выхаванец В. А. Залатарова і М. Я. Мяскоўскага, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі.

Дзіцячыя і юнацкія гады Л. Абеліёвіча ў Вільнюсе. Глыбокая цікавасць да народнай музыкі, твораў рускіх і замежных кампазітараў-класікаў. Вучоба ў гімназіі і на юрыдычным факультэце Вільнюскага універсітэта. Паступленне ў 1936 годзе ў Варшаўскую кансерваторыю па класу фартэпіяна і кампазіцыі. Паяўленне першых твораў — песень на тэксты польскіх паэтаў, варыяцый для фартэпіяна.

Пераезд у 1939 г. у Мінск у сувязі з пачаткам Другой сусветнай вайны, паступленне на IV курс Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі па класу В. Залатарова. Паглыбленая работа па развіццю свайго таленту, праяўленне асаблівай цікавасці да твораў Д. Шастаковіча, Г. Малера.

Служба ў Савецкай Арміі (1941—1944). Сустрэча з вядомым савецкім кампазітарам М.Я. Мяскоўскім, вучоба пад яго кіраўніцтвам у Маскоўскай кансерваторыі па класу кампазіцыі (1944—1946). Ства-

рэнне рада твораў камерна-інструментальнай і вакальнай музыкі, у тым ліку фартэпіянных санат, варыяцый, дзвюх санат для скрыпкі і фартэпіяна, песень на вершы беларускіх паэтаў, дваццаці прэлюдый для цымбал і інш.

Вяртанне Л. Абеліёвіча ў Мінск у 1951 годзе. Пачатак новага этапу ў жыцці і творчасці кампазітара. Цікавасць да нацыянальнай паэзіі і беларускага песеннага фальклору; мастацка пераканаўчае выяўленне яго тыпалагічных асаблівасцей. Фарміраванне характэрных рыс стылю Л. Абеліёвіча ў радзе твораў 1950-ых гадоў — у Трэцяй санаце для фартэпіяна, рамансах на вершы Я. Коласа, А. Бачылы, М. Танка, Трыо для фартэпіяна, скрыпкі і віяланчэлі, вакальных цыклах на словы Р. Бёрнса, М. Багдановіча, Ф. Цютчава, дзвюх паэмах для хору а капэла па матывах вершаў М. Танка, «Сімфанічнай карціне» і інш.

Сталасць і росквіт таленту Л. Абеліёвіча ў другой палове 1950-ых гадоў. Узмацненне цікавасці да сімфанічнага жанру ў 1960—70-ыя гады. Стварэнне чатырох сімфоній, Канцэрта для фартэпіяна з аркестрам, Увертюры № 2, Арыі для скрыпкі з аркестрам, Вакалізу для голасу з аркестрам, а таксама рада камерна-інструментальных і камерна-вакальных твораў, у тым ліку двух сшыткаў фартэпіянных п'ес «Фрэскі», п'ес для аркестра беларускіх народных інструментаў, для ксілафона і фартэпіяна і інш.

Высокая ацэнка творчасці Л. Абеліёвіча музычнай грамадскасцю рэспублікі, прысуджэнне кампазітару Дзяржаўнай прэміі Беларусі.

Характарыстыка творчасці Л. АБЕЛІЁВІЧА

Філасофскае асэнсаванне кампазітарам рэчаіснасці ў творах сімфанічнага, камерна-інструментальнага і вакальнага жанраў.

Вядучая роля тэмы Вялікай Айчыннай вайны, пераасэнсаванне яе ў філасофскім і лірыка-псіхалагічным плане. Другая і Трэцяя сімфоніі, фартэпіянны цыкл «Фрэскі», балады: «Курганы», «Балада аб партызане» (сл. У. Дубоўкі), «Ваенныя балады» для жаночага голасу і фартэпіяна (сл. С. Яўсеевай), «Партызанскія балады» для голасу і фартэпіяна на вершы беларускіх паэтаў.

Шырыня вобразнага дыяпазону тэмы вайны: гераічная, драматычная, эпічная, трагічная, лірычная сферы. Гуманістычная трактоўка ўсенароднай трагедыі.

Вострадраматычнае ўспрыняцце кампазітарам вобразаў сучаснасці, адлюстраванне тэмы барацьбы з негатыўнымі сіламі. Наяў-насць канфліктнай драматургіі ў радзе твораў. Агульная аптымістычная накіраванасць іх канцэпцый.

Тэндэнцыя да ўзбагачэння сродкаў музычнай выразнасці ў творах 1960—80-ых гадоў: рэльефнасць і вобразнасць тэматычнага матэрыялу, абвастрэнне гарманічнай мовы, узмацненне ролі рытму, драматургічнай функцыі кантрастнай і падгалосачнай поліфаніі, распрацовачных прынцыпаў развіцця.

Эвалюцыя ў выкарыстанні народна-песеннага матэрыялу ў тво-

рах сталага перыяду, глыбокае пранікненне ў стылістыку нацыянальнага фальклору.

Сімфоніі ў творчасці кампазітара — жанр, найбольш паказальны з пункту погляду філасофскага тлумачэння вобразнага зместу.

Канфліктнасць драматургіі лірыка-драматычнай Першай сімфоніі, адлюстраванне ў ёй супярэчнасцей рэальнага жыцця, барацьбы чалавека з сіламі зла. Драматычны змест Другой сімфоніі, своеасаблівага маналога-роздуму. Глыбокая, трагічная канцэптуальнасць Трэцяй сімфоніі. Яркасць сучасных сродкаў сімфанічнай драматургіі Чацвёртай сімфоніі (мэтанакіраваная распрацоўка тэматычнага матэрыялу, разнастайнасць прыёмаў аркестравага пісьма, своеасаблівае пераінтанаванне нацыянальнага фальклору і інш.). Прынцыпы аркестравага мыслення, своеасаблівасць аркестроўкі сімфоній кампазітара.

Трэцяя сімфонія Сі мінор (1967)

Мастацкае значэнне сімфоніі; барацьба светлых сіл са змрокам і злом. Інтанацыйна-завостраны тэматычны матэрыял, яго дынамічнае развіццё. Роля монатэматызму ў трох частках цыкла. Фінал (Allegro molto, санатная форма) — носьбіт ідэйна-мастацкага зместу ўсяго твора. Трывожны характар пачатковых інтанацый скрыпак, якія падрыхтоўваюць тэму галоўнай партыі — мужную і энергічную; яе роднасць з асноўнымі музычнымі вобразамі I часткі. Паяўленне тэмы пабочнай партыі ў кульмінацыйнай зоне развіцця галоўнай партыі, адзінства іх эмацыянальнага строю. Дынамізм трагічных вобразаў у распрацоўцы і рэпрызе (жалобныя папеўкі, дысаніруючыя гармоніі, напружаная экспрэсія аркестроўкі). Драматургічная роля беларускай народнай песні «Перапёлачка», якая пераасэнсавана ў музыцы I часткі і з'яўляецца «ціхай кульмінацыяй» у фінале. Роля эпілога ў фінале, звязанага з музыкай пралога сімфоніі.

Вакальныя цыклы на вершы Р. Бёрнса, М. Багдановіча, Ф. Цютчава.

Лірыка-філасофскае «прачытанне» паэтычных сюжэтаў. Разнастайнасць музычных вобразаў у цыклах; выразнасць і багацце сэнсавых нюансаў вакальнай мелодыкі.

Вобразная функцыя фартэпіяннага суправаджэння. Выкарыстанне ў цыклах традыцый рускіх і замежных кампазітараў-класікаў. Высокая мастацкасць твораў.

Цыкл фартэпіянных п'ес «Фрэскі» (сшытак I, 1965)

Адлюстраванне ў цыкле тэмы Вялікай Айчыннай вайны. Канцэртны характар кампазіцыі. Кантрастны прынцып пабудовы, чаргаванне песенных, лірычных, драматычных, фантастычных вобразаў. Аналогія з фрэскавым жывапісам у замалёўцы музычных вобразаў.

Лаканізм п'ес, лінеарнасць фактуры, выкарыстанне складанай дысанантнай гармоніі, трытонавых інтанацый.

Праграмная задума цыкла, сэнс якой раскрываецца на аснове падзагалоўкаў да п'ес; разнастайнасць фартэпіяннай тэхнікі.

Пытанні і творчыя заданні па тэме:

Што магло прыцягнуць увагу Л. Абеліёвіча ў творчасці Д. Шастаковіча? Якія асаблівасці творчасці гэтага кампазітара яму былі блізкія?

Пералічыце рамансы, якія ўваходзяць у вакальны цыкл на словы Р. Бёрнса. Які з іх вам больш спадабаўся і чаму?

Што вы ведаеце аб Чацвёртай сімфоніі?

Па брашуры Н. Калеснікавай «Леў Абеліёвіч» падрыхтуйце даклад аб жыцці і творчасці кампазітара.

Самастойна зрабіце аналіз элегіі «Памяці Д. Шастаковіча» для скрыпкі і фартэпіяна.

Вывучыце цыкл фартэпіянных п'ес «Фрэскі» (сшытак II). Пастарайцеся вызначыць асаблівасці, якія дазваляюць гэту кампазіцыю называць цыклам.

Праслухайце і ахарактарызуйце рамансы на вершы М. Багдановіча «Завіруха», «Ноч» і «Тры рамантычныя эцюды для фартэпіяна».

Літаратура для чытання:

Калеснікава Н. Леў Абеліёвіч. Мн., 1970.

Степанская Н. О мелодическом мышлении Л. Абелиёвича (на примере симфонического творчества) // Вопросы культуры и искусства Белоруссии. Мн., 1982. Вып. 1.

Сцепуро Л. К вопросу обновления тематизма и приемов его развития в симфониях белорусских композиторов (60—70-е годы) // Белорусская музыка. М., 1978. Вып. 3.

Музычная літаратура для вывучэння:

Рамансы на вершы М. Багдановіча: «Завіруха», «Ноч».

Цыкл фартэпіянных п'ес «Фрэскі» (сшытак II): «Крокі ў начы»; «Жалобны час»; «Шэсце».

Трэцяя сімфонія (фінал).

АНАТОЛЬ ВАСІЛЬЕВІЧ БАГАТЫРОЎ (1913)

А. В. Багатыроў — народны артыст Беларусі, прафесар, выхавацель беларускіх кампазітараў сярэдняга і малодшага пакаленняў.

Юнацкія гады А. Багатырова — выхаванца Віцебскай музычнай школы. Гады вучобы ў Мінскім музычным тэхнікуме (1930—1932, клас кампазіцыі М. Аладава) і Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі (1932—1937, клас кампазіцыі В. Залатарова).

Першыя крокі на кампазітарскай ніве: кантата «Сказка о медведихе» на вершы А. Пушкіна (дыпломная работа, 1937). Работа над операй «У пушчах Палесся» аб падзеях грамадзянскай вайны ў Беларусі па аповесці Я. Коласа «Дрыгва» (1939). Пастаноўка оперы ў Маскве, у Вялікім тэатры Саюза ССР у час Першай дэкады беларускай літаратуры і мастацтва (1940). Прысуджэнне А. Багатырову Дзяржаўнай прэміі СССР.

Творчая дзейнасць А. Багатырова ў гады Вялікай Айчыннай вайны ў Свярдлоўску і Маскве; стварэнне рада значных твораў на

актуальныя патрыятычныя сюжэты, у тым ліку кантаты «Ленінградцы» (на вершы Джамбула Джабаева) і «Беларускім партызанам» (на вершы Я. Купалы). Адлюстраванне тэмы вайны ў фартэпіянным трыо (1943—1944).

Пасляваенны перыяд А. Багатырова. Росквіт яго таленту, інтэнсіўная творчая работа. Шырыня і рознабаковасць дзейнасці: кіраўніцтва Саюзам кампазітараў Беларусі, Беларускай дзяржаўнай кансерваторыяй, вядзенне класа кампазіцыі, музычна-грамадская дзейнасць.

Стварэнне лірыка-эпічнай оперы «Надзея Дурава» на тэматыку Айчыннай вайны 1812 г. (1946), дзвюх сімфоній — Першай (1946) і Другой (1947); Канцэрта для віяланчэлі, Канцэрта для кантрабаса і сімфанічнага аркестра, Уверцюры, Сюіты, рада камерна-інструментальных твораў, хораў, рамансаў, апрацовак беларускіх народных мелодый, музыкі да драматычных спектакляў і кінафільмаў.

Праяўленне асаблівай цікавасці кампазітара да кантатнага і аратарыяльнага жанраў, хораў: кантаты «Беларускім партызанам» (сл. Я. Купалы, 1942), «Беларусь» (сл. Я. Купалы, П. Броўкі і П. Труса, 1947), «Беларускія песні» (на мелодыі і словы беларускіх народных песень, а таксама Н. Гілевіча, 1962), «Юбілейная кантата» (на вершы Я. Коласа, 1973) і інш., араторыя «Бітва за Беларусь» (на словы Г. Бураўкіна, Н. Гілевіча, А. Куляшова, 1984).

Характарыстыка творчасці А. БАГАТЫРОВА

Шырыня жанравага дыяпазону, актуальнасць тэматыкі. Перамнасць традыцый рускай музычнай класікі, іх развіццё на нацыянальнай глебе.

Глыбокае пранікненне ў стылістыку беларускага музычнага фальклору, арганічнае выкарыстанне меладычных, ладавых, рытмічных асаблівасцей. Праяўленне ў позніх творах А. Багатырова характэрнай для беларускай музыкі 1960—80-ых гадоў тэндэнцыі ўзбагачэння музычнай мовы. Мастацкасць, стрыманасць, высакароднасць, эстэтычная прывабнасць музыкі кампазітара.

Стварэнне А. Багатыровым школы беларускіх кампазітараў.

Кантата «Сказка о медведихе» (тэкст А. Пушкіна, 1937)*

Музычнае ўвасабленне паэтычнага тэксту А. Пушкіна. Лірыка-драматычны характар твора. Народны склад музыкі (арыёза Мядзведзіхі «Ах, вы, детушки, медвежатушки!»); актыўная драматургічная роля хору, які нібы вядзе расказ ад аўтара: празрыста-светлае гучанне ў замалёўцы карціны прыроды («Как весенней теплой порою»), трывожна-ўсхваляванае — у сцэне паяўлення паляўнічага і гібелі Мядзведзіхі («Медвежатушки испугалися»), журботна-сумнае — у хвіліны трагічнага перажывання Мядзведзя («Не звоны пошли по городу»).

Каларытнасць аркестравай партыі, якая тонка перадае сэнсавы змест паэмы.

---

* Твор прызначаны для самастойнай работы вучняў.

Своеасаблівыя рысы музычнай мовы кантаты — задушэўнасць, прастата, лаканізм, рэльефнасць.

Кантата «Беларускім партызанам» (тэкст Я. Купалы, 1942)

Патрыятычны змест твора. Музычная драматургія. Роля аркестравага ўступу. Нацыянальны характар музыкі, інтанацыйная блізкасць асноўнай тэмы кантаты з беларускімі традыцыйнымі народнымі песнямі. Характарыстыка трох раздзелаў кантаты (крайніх — харавых і сярэдняга — сола мецца-сапрана). Першае выкананне кантаты ў Маскве ў 1944 г. на канцэрце беларускай музыкі.

Фартэпіяннае трыо Ля мінор (1943—1945)

Прысвячэнне твора тэме Вялікай Айчыннай вайны. Кантрастнасць музычных вобразаў. Сувязь музычнай мовы з інтанацыямі беларускіх народных мелодый («Бачыць маё вока», «Зазвінелі новыя ключы») і масавых песень.

Роля поліфанічных прыёмаў перадачы зместу (кантрастная і імітацыйная поліфанія) у кульмінацыйных раздзелах. Асноўны драматычны цэнтр Трыо — трэцяя частка — балада (санатная форма з уступам і кодай).

Першая сімфонія Соль мінор (1946, другая рэдакцыя 1956)

Адлюстраванне ў музыцы сімфоніі патрыятычнай тэмы, падзей Вялікай Айчыннай вайны; лірыка-драматычныя вобразы сімфоніі; другая частка — паэма аб родным краі, роздум аб перажытым (трохчастковая кампазіцыя); трэцяя частка — фінал — урачыстасць перамогі (санатная форма). Роля ўступу да сімфоніі, тэматычнае адзінства. Выкарыстанне ў музыцы інтанацый беларускіх і рускіх народных песень (плачаў, лірычных).

Кантата «Беларускія песні» для салістаў, змешанага хору і сімфанічнага аркестра (1967)

Узор творчага падыходу кампазітара да нацыянальнага фальклору: свабоднае мастацкае асэнсаванне сапраўдных народных тэм у адпаведнасці з патрабаваннямі сучаснасці.

Выкарыстанне розных песенных жанраў: салдацкай («Зашумела сасонушка», I ч.), рэкруцкай («Ой, не вылятай», II ч.), казацкай («А ў полі азярэчка», III ч.); любоўна-лірычнай («Там, дзе круты явар ўецца», V ч.; «Зялёны гай», VII ч.). Аб'яднанне песенных мелодый стылістычным і сюжэтным стрыжнем, інтанацыйнымі арамі, якія ўзмацняюць мастацкую цэльнасць кампазіцыі.

Будова кантаты: сем частак, скампанаваных па прынцыпу кантрастнага чаргавання харавых, сольных і аркестравых эпізодаў. Кульмінацыя кантаты — VI частка «Край мой, беларускі край» (на сл. Н. Гілевіча). Разнастайнасць форм і музычных вобразаў кантаты — эпічных, драматычных, ламентозных, жанравых, пейзажных.

Выкарыстанне розных прыёмаў харавога гучання: вылучэнне з харавога tutti саліруючых галасоў, прымяненне элементаў народна-падгалоснай поліфаніі, класічнай імітацыі, харавога скандзіравання, рэ-

чытацыі, а таксама натуральна-ладавых гармоній, мажорна-мінорных сугуччаў, храматызмаў і інш.

Расшырэнне ў радзе выпадкаў страфічнай формы песні да трохчасткавай шляхам уключэння ўступных і абагульняючых раздзелаў; выкарыстанне прыёму дынамізацыі музычнага развіцця.

Мастацкая закончанасць кампазіцыі, якая раскрывае багацце народна-песенных традыцый і своеасаблівасць таленту кампазітара.

Пытанні і творчыя заданні па тэме:

Раскрыйце змест оперы «Надзея Дурава». На чыё лібрэта яна створана?

Які літаратурны твор ляжыць у аснове оперы «У пушчах Палесся»?

Якія творы напісаў А. Багатыроў у гады Вялікай Айчыннай вайны?

Якая роля музыкі А. Багатырова да кінафільма «Канстанцін Заслонаў»?

Якія вы ведаеце хоры і рамансы А. Багатырова?

Прачытайце брашуру Т. Дубковай «Анатоль Багатыроў» (Мн., 1972) і падрыхтуйце даклад-паведамленне аб жыцці і творчасці кампазітара.

Праслухайце кантату «Сказка о медведихе» і раскажыце аб яе музычна-выяўленчых сродках.

Вызначце, якія беларускія народныя мелодыі і якія жанры выкарыстаны ў кантаце «Беларускія песні» А. Багатырова. Знайдзіце іх у зборніках Р. Р. Шырмы і параўнайце арыгіналы песень з іх апрацоўкай у кантаце.

Літаратура для чытання:

Багатыроў А. «Надзея Дурава»: Лібрэта оперы. Мн., 1956.

Нисневич С. Опера «В пущах Полесья» А. Богатырева // Белорусское искусство. Мн., 1957. Вып. 1.

Степанцевич К. Первая симфония А. Богатырева // 55 советских симфоний. Л., 1961.

Кулешова Г. Белорусская советская опера. Мн., 1967.

Дубкова Т. Анатоль Багатыроў. Мн., 1972.

Музычная літаратура для вывучэння:

Хоры: «Праляцелі вятры» (сл. У. Дубоўкі), «Шумелі бярозы» (сл. М. Лужаніна).

Першая сімфонія (ч. I).

Опера «У пушчах Палесся» (арыя Кузьміча з I дзеяння, хор партызан «Гэй, у лесе» з III дзеяння).

Фартэпіяннае трыо (ч. III, балада).

Кантата «Сказка о медведихе» (сола Мядзведзіхі «Ах вы, детушки, медвежатушки», хор «Медвежатушки испугалися»).

Кантата «Беларускім партызанам».

Кантата «Беларускія песні» (ч. VI — «Край мой, беларускі край», вершы Н. Гілевіча).

УЛАДЗІМІР УЛАДЗІМІРАВІЧ АЛОЎНІКАЎ (1919)

Вядомы беларускі кампазітар-песеннік, адзін з выхаванцаў В. Залатарова; народны артыст Беларусі, прафесар, музычна-грамадскі дзеяч, ветэран Вялікай Айчыннай вайны, ганаровы грамадзянін горада Мінска.

Жыццёвы і творчы шлях кампазітара. Раннія музычныя ўражанні, сур'ёзныя адносіны да заняткаў музыкай у дзіцячыя і юнацкія гады. Вучоба ў музычнай школе па класу фартэпіяна ў г. Бабруйску. Першыя вопыты ў галіне кампазіцыі.

Паступленне ў 1934 г. у Мінскі музычны тэхнікум. Узмацненне цікавасці да музычнай творчасці. Гады вучобы ў Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі (1937—1941) на фартэпіянным і кампазітарскім аддзяленнях. Роля В. Залатарова ў фарміраванні маладога музыканта.

Паяўленне першых твораў камернага жанру: рамансаў на вершы В. Брусава, фартэпіянных п'ес, струннага квартэта. Стварэнне лірыка-драматычнай сімфоніі (1941, дыпломная работа).

Удзел у Вялікай Айчыннай вайне. Дэмабілізацыя з арміі (1946).

Новы этап у жыцці і творчасці кампазітара. Інтэнсіўныя заняткі кампазіцыяй, росквіт творчай дзейнасці ў 1950—60-ыя гады. Стварэнне Другога струннага квартэта, цыкла фартэпіянных прэлюдый, твораў для сімфанічнага аркестра і аркестра народных інструментаў, музыкі да кінафільмаў і драматычных спектакляў, Кантаты для дзіцячага хору. Асаблівая ўвага да жанраў вакальнай музыкі — хораў, рамансаў на патрыятычныя сюжэты, песень аб Вялікай Айчыннай вайне і барацьбе за мір («Песня о Брестской крепости», «Песня о Гастелло», «Песня о Доваторе», «Песня о Карбышеве», «Песня пра Заслонава», «Лясная песня», «Партызанскія акопы», «Нам не трэба вайны» і інш.).

Педагагічная і музычна-грамадская дзейнасць, аказанне дапамогі пачынаючым кампазітарам і калектывам мастацкай самадзейнасці, творчыя сустрэчы з працоўнымі.

Назначэнне ў 1962 г. У. Алоўнікава рэктарам Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі. Плённая праца па стварэнню кадраў беларускіх музыкантаў, павышэнню іх прафесійнай культуры.

Характарыстыка творчасці У. АЛОЎНІКАВА

Перавага жанраў вакальнай і сімфанічнай музыкі. Героіка-патрыятычная лінія твораў кампазітара, шырокае адлюстраванне ў іх тэмы Вялікай Айчыннай вайны, любві да Радзімы. Грамадзянская накіраванасць рада яго песень. Праграмнасць сімфанічнай музыкі.

Праяўленне лірычнага таленту кампазітара ў сольных і харавых песнях, рамансах.

Нацыяльна-стылявыя рысы творчасці У. Алоўнікава, сувязь з беларускім песенным фальклорам і традыцыямі савецкіх масавых песень. Меладызм, цеплыня, задушэўнасць, эмацыянальная адкрытасць музыкі У. Алоўнікава, яе рамантычная ўзнёсласць; даходлівасць і па-

пулярнасць многіх яго твораў. У. Алоўнікаў — адзін са стваральнікаў асноватворных прынцыпаў беларускага песеннага жанру.

Сімфанічная паэма «Партызанская быль»
(1952, другая рэдакцыя — 1954, трэцяя — 1960)

Паэма — узор беларускага праграмнага сімфанізму. Адлюстраванне ў паэме тэмы партызанскай барацьбы ў Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Гераічныя, драматычныя і трагічныя вобразы паэмы.

Праграмна-выяўленчыя моманты музыкі. Праламленне ў музычнай мове інтанацый савецкіх масавых і сучасных беларускіх народных песень.

Кампазіцыя твора (санатная форма).

Роля драматургіі дзвюх тэм уступу (мужнай і песеннай).

Сімфанічная сюіта «Песні міру» (1958)

Маналітнасць вобразна-сэнсавага зместу сюіты: I частка — «Песня смутку» — даніна памяці савецкім людзям, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны; II частка — «Песня гневу» — выяўленне пачуцця нянавісці да падпальшчыкаў вайны; III частка — «Песня адзінства» — паказ імкнення народаў усёй Зямлі да мірнага, шчаслівага жыцця.

Выкарыстанне ў III ч. сюіты песеннай тэмы рускага складу, кітайскай мелодыі і тэмы «Песні адзінага фронту» нямецкага кампазітара-антыфашыста Г. Эйслера. Яркасць, выразнасць музыкі сюіты.

«Лясная песня» (словы А. Русака)

Адлюстраванне тэмы ўспамінаў аб днях баявых паходаў беларускіх партызан. Героіка-лірычны настрой песні. Інтанацыйна-ладавая, метра-рытмічная характарнасць музыкі, яе блізкасць да беларускага фальклору (натуральны мінор, ладавая пераменнасць, «перабіўнасць» метра (двух-, трох- і чатырохдольнасць). Народнае прызнанне песні, яе папулярнасць не толькі ў нашай краіне, але і далёка за яе межамі.

«Радзіма мая дарагая» (словы А. Бачылы)

Увасабленне ў песні патрыятычных пачуццяў кампазітара. Лірыка-эпічны эмацыянальны строй песні (гімнічны характар, павольнасць, размеранасць руху). Двухчасткавая куплетная форма песні (сольны запеў і харавы прыпеў). Гучанне ў мелодыцы асобных інтанацый народнай лірычнай песні «О, не кукуй, зязюленька».

Папулярнасць песні «Радзіма мая дарагая» ў выканаўцаў і слухачоў. Выкарыстанне пачатковай інтанацыі ў якасці пазыўнога сігналу Беларускага радыё, цытаты ў творах іншых кампазітараў (напрыклад, у песні «Памяць сэрца» І. Лучанка).

Пытанні і творчыя заданні па тэме:

Назавіце песні У. Алоўнікава, прысвечаныя тэматыцы Вялікай Айчыннай вайны; на чые тэксты яны напісаны?

Што вы ведаеце аб сімфанічнай паэме У. Алоўнікава «Нарач»?

Якая праграма ляжыць у аснове сімфанічнай паэмы «Партызанская быль»?

Хто з беларускіх кампазітараў, акрамя У. Алоўнікава, напісаў песню аб Брэсцкай крэпасці?

Вывучыце на памяць «Лясную песню».

Успомніце музыку У. Алоўнікава да кінафільма «Міколка-паравоз». Ахарактарызуйце яе.

Па брашуры І. Зубрыч «Уладзімір Алоўнікаў» пазнаёмцеся з пералікам выдадзенай літаратуры пра кампазітара.

Літаратура для чытання

Зубрыч І. Уладзімір Алоўнікаў. Мн., 1970.

Ракава А. Тэма партызанскай барацьбы ў творчасці беларускіх кампазітараў. Мн., 1961.

Ракова Е. Патриотическая тема в песенном творчестве белорусских композиторов //Музыкальная культура Белорусской ССР. М., 1977.

Дедюля Т. Белорусская советская песня. Мн., 1982.

Музычная літаратура для вывучэння:

«Радзіма мая дарагая» (сл. А. Бачылы), «На Палессі гоман, гоман» (сл. П. Броўкі), «Песня о Доваторе» (сл. А. Лозневого), «Лясная песня» (сл. А. Русака), «Песня о Брестской крепости» (сл. А. Лозневого).

Сімфанічная паэма «Партызанская быль».

Сімфанічная сюіта «Песні міру».

ГЕНРЫХ МАТУСАВІЧ ВАГНЕР (1922)

Г. М. Вагнер — народны артыст Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі, вядомы музычны дзеяч, прафесар.

Дзіцячыя гады ў Польшчы (г. Жырардаў). Вучоба ў Музычным інстытуце імя Манюшкі (1933), у Варшаўскай кансерваторыі па класу фартэпіяна (1936—1939). Пераезд у Мінск у сувязі з акупацыяй Польшчы гітлераўцамі і вучоба ў Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі.

Работа канцэртмайстрам у Таджыкскай дзяржаўнай філармоніі (г. Душанбэ, 1941—1943) і загадванне музычнай часткай франтавога тэатра (1943—1945).

Вяртанне ў Мінск і заканчэнне адукацыі ў кансерваторыі па класу фартэпіяна дацэнта Г.І. Шаршэўскага (1948) і па класу кампазіцыі прафесара А. В. Багатырова (1954). Педагагічная дзейнасць ў Дзяржаўным педагагічным інстытуце імя А. М. Горкага. Шматлікія паездкі за мяжу і ў саюзныя рэспублікі. Глыбокае вывучэнне музыкі савецкіх і замежных кампазітараў. Грамадская дзейнасць у Саюзе кампазітараў Беларусі ў якасці члена Праўлення і адказнага сакратара (1962—1974). Творчыя сустрэчы з працоўнымі. Выкананне твораў Г. Вагнера ў рэспубліцы і за яе межамі.

Характарыстыка творчасці Г. ВАГНЕРА

Шматграннасць творчага дыяпазону — оперы, балеты, сімфанічныя, харавыя, камерна-інструментальныя і вакальныя творы, музыка да драматычных радыё- і тэлепастановак, да кінафільмаў. Актуальнасць тэматыкі, цікавасць да сучаснасці і гістарычнага мінулага; гуманізм, патрыятызм, мяккі гумар і жорсткі гратэск музычных вобразаў яго твораў. Адточанасць кампазітарскага майстэрства, валоданне арсеналам тэхналогіі сучаснага пісьма, глыбокае веданне літаратуры, жывапісу, фальклору, сусветнага прафесійнага музычнага мастацтва. Роля ў фарміраванні кампазітара музычнага асяроддзя Варшавы (піяніста З. Джэвецкага і скрыпача М. Карловіча), а ў далейшым — дзеячаў савецкай музыкі.

Першыя творы — «Колыбельная» на словы таджыкскага паэта В. Акуджанава, музыка да кінафільма «Швейк супраць Гітлера». Студэнцкія работы: вакальна-сімфанічны твор «Маладзёжная сюіта» (сл. К. Кірэенкі, А. Астапенкі), Фантазія на тэмы польскіх народных песень (для секстэта домр), Фартэпіяннае трыо і Канцэрціна, інструментальныя мініяцюры, Струнны квартэт, эстрадныя п'есы, песні і рамансы.

Творчыя дасягненні кампазітара 1950—80-ых гадоў: «Беларуская сюіта» для скрыпкі і сімфанічнага аркестра, вакальна-сімфанічныя паэмы «Вечна жывыя», «Героям Брэста» і «Чытаючы Васіля Быкава», Святочная уверцюра, Сімфонія № 1, чатыры фартэпіянныя канцэрты (у тым ліку Канцэрт для двух фартэпіяна), канцэрты для віяланчэлі і цымбал. Балеты: «Падстаўная нявеста» (лібрэта Я. Рамановіча), «Святло і цені» (па матывах рамана П. Броўкі «Калі зліваюцца рэкі», лібрэта М. Алтухова), «Пасля балю» (па апавяданню Л. Талстога, лібрэта А. Дадзішкіліані). Оперы: тэлеопера «Ранак» (па паэме А. Куляшова «Песня аб слаўным паходзе», лібрэта Я. Шабана), лірыка-камічная опера «Пінская шляхта» (па п'есе В. Дуніна-Марцінкевіча), гераіка-патрыятычная опера «Сцежкаю жыцця» (па творы В. Быкава «Воўчая зграя», лібрэта А. Вярцінскага і С. Штэйна).

Некаторыя музычна-стылістычныя рысы буйных твораў Г. Вагнера: дакладнасць драматургічнай задумы, яркасць і выразнасць музычнай мовы, эмацыянальная насычанасць і дынамічны сімфанізм, жыццесцвярджальная, аптымістычная канцэпцыя ў паказе складаных перыпетый рэчаіснасці.

Вакальна-сімфанічная паэма «Вечна жывыя» (1959)

Твор для сімфанічнага аркестра і жаночага хору (без слоў), прысвечаны памяці герояў, якія аддалі сваё жыццё за шчасце народа. Характарыстыка асноўных тэм паэмы — павольнай, жалобнай (уступ), драматычна-напружанай тэмы барацьбы (галоўная партыя) і лірыка-працяглай тэмы жаночага хору (пабочная партыя), якая выраслa з мелодыі беларускай народнай песні «Павей, ветрык». Музычная драматургія паэмы, яе сімфанізм, эвалюцыя музычных вобразаў па лініі «прасвятлення», «амажорвання». Яркасць аркестравай партыі, выразнасць гармоніі.

Вакальна-сімфанічная паэма «Героям Брэста» (1975)

Паэма-рэквіем для сімфанічнага аркестра, змешанага хору, мецца-сапрана і чытальніка. Прысвячэнне твора бессмяротным подзвігам удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны. Выкарыстанне ў тэксце фрагментаў «Паэмы-балады аб Брэсцкай крэпасці» Р. Барадуліна. Трагічныя, драматычныя, эпічныя і гераічныя вобразы паэмы. Скразны прынцып развіцця кантрастнага музычнага матэрыялу ў трохчасткавай кампазіцыі твора.

Першы канцэрт для фартэпіяна з аркестрам (1964)

Лірыка-жанравы змест яго трох частак; танцавальная аснова музыкі, своеасаблівасць меладычнага і метра-рытмічнага рашэння, арыгінальнасць танальна-гарманічных фарбаў з «ігрой» і «пералівамі» дыятанічных і храматычных ладоў. Унутраны кантраст вобразаў у I частцы (Allegro non troppo, санатная форма); такатнасць тэмы галоўнай партыі і мудрагелістасць — пабочнай; вытанчана-церпкі характар II часткі (Andante amoroso, складаная трохчасткавая форма); народна-танцавальны склад музыкі III часткі — фіналу (Allegro vivo, ронда-саната); пераасэнсаванне беларускіх народных танцавальных напеваў у галоўнай партыі («Мікіта», «Янка-полька») і ў пабочнай («Бульба»).

Балет «Падстаўная нявеста» (лібрэта Я. Рамановіча, 1958)

Лірыка-камедыйны характар балета. Ідэйная накіраванасць твора — паказ няроўнасці людзей розных саслоўяў у Заходняй Беларусі ў пачатку XX стагоддзя. Народна-нацыянальны склад музыкі (выкарыстанне фальклорных мелодый і стварэнне тэм у духу беларускіх і польскіх танцаў). Песенна-лірычная замалёўка асноўных персанажаў — Насці і Андрэя; мяккі гумар у раскрыцці вобраза народнага веселуна і гаваруна Мацея, вострая сатыра ў характарыстыцы прадстаўнікоў свету багацеяў — пана-самадура Гонар-Гнюсевіча і яго акружэння. Карціны народнага быту («Беларускі танец», «Вяснянка», «Журавель», «Абэрак»).

Балет «Святло і цені» (лібрэта М. Алтухова, 1963)

Твор напісаны па матывах рамана П. Броўкі «Калі зліваюцца рэкі». Супрацьпастаўленне ў балеце музычных вобразаў — жыццярадаснай моладзі і змрочных, жорсткіх сектантаў. Характарыстыка галоўных персанажаў — Анежкі і Алеся: лейттэмы Анежкі (кранальная і задуменная) і Алеся (мужная, шырока-распеўная); адажыо Анежкі і Алеся (I і III дзеянні), драматычна напружаныя сцэны Анежкі, Алеся і бацькі Анежкі. Вобразы адмоўных персанажаў — бацькі Анежкі, фанатычнага сектанта і яго паплечнікаў, у тым ліку хітрай і каварнай Жанчыны ў чорным (II дзеянне. «Оргія сектантаў»). Гратэскнасць, вуглаватасць, зламанасць іх тэм. Масавыя харэаграфічныя сцэны, якія расказваюць аб жыцці савецкай моладзі. Нацыянальна-характэрныя танцы ў карцінах, якія абрамляюць твор.

Выкарыстанне ў музыцы балета мелодый беларускіх песень (напрыклад, «Ой, рэчанька»), латышскага фальклору (песня «Цырулe») і інш. Роля аркестра ў замалёўцы партрэтаў герояў.

Опера «Сцежкаю жыцця» (па матывах аповесці «Воўчая зграя» В. Быкава, лібрэта А. Вярцінскага, С. Штэйна, 1984)

Філасофска-драматычны змест сюжэта, які расказвае аб гадах Вялікай Айчыннай вайны, аб высокім гуманізме савецкіх людзей. Пранікнёнасць і духоўная прыўзнятасць музыкі твора, яе жыццесцвярджальная сіла. Характарыстыка галоўнага героя оперы Леўчука — воіна Савецкай Арміі, які выратаваў сына камандзіра Платонава. Прынцып раскрыцця сюжэту оперы, якая складаецца з дзвюх частак. Роля каментатара падзей — вакальнага квінтэта сучаснікаў («Дарога партызанская», «Яшчэ невядома, хто больш жывы» і «Сярод вайны вялікі свет свой...»); характарыстыка Леўчука (арыёза «Хто ты цяпер, Віктар Платонаў?»). Значэнне заключнай карціны «Плач спаленай вёскі» (жаночы хор «Мы сталі попелам») у драматургіі оперы.

Пытанні і творчыя заданні па тэме:

Назавіце асноўныя музычныя жанры, да якіх звяртаўся Г. Вагнер.

Які твор лёг у аснову балета Г. Вагнера «Пасля балю»? Ці ўдалося кампазітару раскрыць яго мастацкую задуму?

Што напісана кампазітарам для дзяцей?

Пералічыце некалькі беларускіх народных песень, якія творча выкарыстаны ў музыцы Г. Вагнера.

Азнаёмцеся з музыкай оперы Г. Вагнера «Сцежкаю жыцця», папярэдне прачытаўшы аповесць В. Быкава «Воўчая зграя».

Праслухайце Першы і Другі фартэпіянныя канцэрты Г. Вагнера і параўнайце іх у плане падабенства і адрознення.

Літаратура для чытання:

Нисневич С. Генрих Вагнер. Мн., 1969.

Коленько Р. О некоторых чертах драматургии оперы Г. Вагнера «Тропою жизни» // Вопросы культуры и искусства Белоруссии. Мн., 1988. Вып. 7.

Музычная літаратура для вывучэння:

Вакальна-сімфанічная паэма «Вечна жывыя».

Вакальна-сімфанічная паэма «Героям Брэста» (трагічная калыханка маці-Радзімы).

Фартэпіянны канцэрт № 1 (ч. III).

Балет «Падстаўная нявеста»: «Беларускі танец», «Вяснянка», «Журавель», «Абэрак».

Балет «Святло і цені»: Адажыо Анежкі і Алеся (I дзеянне і III дзеянне), «Оргія сектантаў» (II дзеянне).

Опера «Сцежкаю жыцця»: квінтэт сучаснікаў «Дарога партызанская», арыёза Леўчука «Хто ты цяпер...», жаночы хор «Мы сталі попелам».

ЮРЫЙ УЛАДЗІМІРАВІЧ СЕМЯНЯКА (1925-1990)

Ю. У. Семяняка — вядомы беларускі кампазітар-песеннік, аўтар рада опер, музычных камедый, кантат; народны артыст Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі.

Дзіцячыя гады кампазітара ў Феадосіі і Беластоку (нарадзіўся ў г. Мінску), вучоба ў агульнаадукацыйнай, музычнай школах і ў музычным вучылішчы.

Прызыў у Савецкую Армію (1944), удзел у баях супраць фашысцкіх захопнікаў. Работа пасля дэмабілізацыі з арміі канцэртмайстрам у Ансамблі песні і танца пад кіраўніцтвам Р. Шырмы ў г. Гродна. Першыя крокі ў галіне кампазіцыі.

Вучоба ў Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі па класу кампазіцыі прафесара А. Багатырова (1951—1956).

Сур'ёзнае вывучэнне беларускага музычнага фальклору, асноў кампазітарскай тэхнікі.

Пачатак актыўнай творчай дзейнасці пасля заканчэння кансерваторыі. Асаблівая цікавасць да жанраў вакальнай музыкі.

Узмацненне ўвагі кампазітара ў 1960—70-ыя гады да музычна-тэатральных жанраў. Стварэнне опер: «Калючая ружа» (лібрэта А. Бачылы) — аб жыцці савецкіх студэнтаў, «Калі ападае лісце» (лібрэта А. Бачылы) — пра маладых вучоных, «Зорка Венера» (лібрэта А. Бачылы) — пра беларускага паэта, дэмакрата М. Багдановіча і «Новая зямля» (лібрэта А. Петрашкевіча па матывах аднайменнай паэмы Я. Коласа) — аб гістарычным лёсе беларускага народа, яго мары аб свабодзе і шчасці.

Уклад кампазітара ў развіццё жанру беларускай музычнай камедыі («Рабінавыя каралі», «Спявае жаваранак», «Паўлінка», «Тыдзень вечнага кахання»).

Напісанне кампазітарам рада папулярных песень і хораў: «Явар і каліна» (сл. Я. Купалы), «Ой, шумяць лясы зялёныя» (сл. А. Сіткоўскага), «Дняпро» і «Не за вочы чорныя» (сл. А. Русака), «Я сэрцам з табой» (сл. А. Бачылы), «Люблю цябе, Белая Русь» і «Якая ты цудоўная, Радзіма» (сл. У. Карызны), «Беларусь — мая песня» (сл. М. Браўна), «Травы детства» (сл. В. Дзямідава). Работа ў жанры кантаты («Памяці Канстанціна Заслонава», «Горад юнацтва», «Велічальная Мінску»).

Напісанне твораў для сімфанічнага аркестра («Маладзёжная увертюра»), аркестра беларускіх народных інструментаў (Увертюра, музыка да паэмы А. Куляшова «Прыгоды цымбал»), кантаты «Зямля мая», музыкі для тэлебачання, тэатра і кіно.

Інтэнсіўная музычна-грамадская дзейнасць Ю. Семянякі ў якасці члена Праўлення, а таксама Старшыні Саюза кампазітараў Беларусі (1978—1983), члена журы алімпіяд і аглядаў народнай творчасці, кансультанта самадзейных кампазітараў.

Характарыстыка творчасці Ю. СЕМЯНЯКІ

Дэмакратызм і даступнасць музыкі, яе папулярнасць у шырокіх колах слухачоў. Вядучае месца жанраў вакальнай музыкі ў творчасці кампазітара.

Разнастайнасць тэматыкі і музычных вобразаў: аб Радзіме, сяброўстве, шчасці і любві, аб прыродзе, дзецях.

Зварот у песнях і рамансах да рускай паэзіі. Роля опернага жанру ў творчасці Ю. Семянякі. Лірычная накіраванасць музыкі опер пры

адрозненні іх жанравай асновы: лірыка-камічная «Калючая ружа», лірыка-сатырычная «Калі ападае лісце», лірыка-драматычная «Зорка Венера», лірыка-псіхалагічная «Новая зямля». Апора на традыцыі жанру савецкай песеннай оперы. Выкарыстанне ў музычнай мове опер элементаў гарадскога фальклору і сучаснай беларускай народнай песні. Тэндэнцыя лірычнай трактоўкі оперных персанажаў. Увага да ансамблевых і масавых сцэн, харавых партый.

«Якая ты цудоўная, Радзіма!» (сл. У. Карызны)

Лірыка-патэтычная песня аб Радзіме, яе шырокіх прасторах, прыгажосці прыроды. Велічнае разгортванне мелодыі песні, шырыня дыхання, распеўнасць, выразнасць — адметныя асаблівасці музыкі песні, абумоўленыя характарам паэтычнага тэксту.

«Явар і каліна» (словы Я. Купалы)

Пранікнёны, паэтычна натхнёны дуэт; яго блізкасць да інтанацый гарадскіх народных працяглых песень: секставыя меладычныя абароты, «рубленыя» канчаткі чатырохтактавых фраз, павялічаныя секунды гарманічнага мінорнага ладу. Павольнасць музыкі, што адпавядае характару купалаўскага верша.

Опера «Зорка Венера» (лібрэта А. Бачылы, 1969—1970)

Адлюстраванне ў оперы некаторых эпізодаў з жыцця беларускага паэта-дэмакрата М. Багдановіча. Лірычная трактоўка вобраза героя і паказ канфлікту яго светлых надзей з рэальным светам. Выкарыстанне ў лібрэта паэтычных вершаў М. Багдановіча.

Прынцыпы арганізацыі музычнага дзеяння оперы. Чаргаванне сольных і харавых нумароў, абрадавых сцэн. Своеасаблівасць вакальнага стылю оперы, уключэнне ў музычную канву сапраўдных народных мелодый («Ой, рана на Йвана», «Зорка Венера», «Калыханка»).

Драматургічная функцыя хору, які ўскосна характарызуе героя.

Шчырасць і задушэўнасць музыкі оперы. Некаторая статычнасць музычнай драматургіі ў цэлым.

Музычная камедыя «Паўлінка» (па п'есе Я. Купалы, лібрэта А. Бачылы, 1973)

Сюжэт твора. Яго лірыка-камічны і гратэскна-сатырычны змест. Раскрыццё сацыяльнай лініі купалаўскай п'есы — расказ аб настаўніку-рэвалюцыянеру Якіму Сароку. Значэнне музычнай драматургіі верша Я. Купалы «Мужык». Інтанацыйнае падабенства песні Якіма з рэвалюцыйнымі песнямі-маршамі. Лірыка-песенная характарыстыка Паўлінкі. Роля хору — аднаго з асноўных персанажаў оперы, які не толькі актыўна ўдзельнічае ў дзеянні, але і ўскосна малюе партрэт галоўнага героя — Якіма.

Пытанні і творчыя заданні па тэме:

Якія вы ведаеце найбольш папулярныя лірычныя сольныя, ансамблевыя і харавыя песні Ю. Семянякі?

Назавіце творы Ю. Семянякі, прысвечаныя тэме Вялікай Айчыннай вайны.

Які змест оперы «Новая зямля», створанай па матывах аднайменнай паэмы Я. Коласа?

Правядзіце параўнальную характарыстыку песеннай творчасці У. Алоўнікава і Ю. Семянякі.

Самастойна зрабіце аналіз песні «Люблю цябе, Белая Русь» Ю. Семянякі (на сл. У. Карызны).

У кнізе «Анталогія беларускай народнай песні» (укладанне, прадмова і каментарыі Г. Цітовіча. Мн., 1975) знайдзіце беларускую народную песню пра Канстанціна Заслонава, коратка ахарактарызуйце яе, вызначце яе асноўныя стылявыя рысы. Зрабіце параўнальную характарыстыку гэтай песні з кантатай «Памяці Канстанціна Заслонава» Ю. Семянякі.

Літаратура для чытання:

Жураулеу Д., Загародні Г. Юрый Семяняка. Мн., 1974.
Нісневіч С. Добры дзень, «Зорка Венера»! // Мінская праўда. 1970,8 снеж.
Ракова А. «Павлинка» в музыкальном театре // Муз. жизнь. 1974, № 1.
Ракава А. Аперэты Ю. Семянякі // Беларуская музыка. Мн., 1975.
Щербакова Т. Опера о белорусском поэте // Сов. муз. 1971, № 12.

Музычная літаратура для вывучэння:

Песні: «Явар і каліна» (сл. Я. Купалы), «Якая ты цудоўная, Радзіма!» (сл. У. Карызны).

Опера «Зорка Венера»: хор «Маладыя гады» (застаўка да I дзеяння); хор «Калыханка» (заключны хор); хор «Зорка Венера» (II дзеянне, 3-ая карціна).

Музычная камедыя «Паўлінка»: песня Якіма з хорам («Мужык»).

ЯЎГЕН АЛЯКСАНДРАВІЧ ГЛЕБАЎ
(1929)

Я. Глебаў — народны артыст СССР, аўтар вялікай колькасці твораў, сярод якіх найбольш значныя сімфанічныя, балетныя і вакальна-сімфанічныя; вядомы педагог, прафесар па класу кампазіцыі, актыўны грамадскі дзеяч.

Дзіцячыя і юнацкія гады Я. Глебава на Смаленшчыне (нарадзіўся ў Рослаўлі ў сям'і чыгуначніка). Праяўленне з дзяцінства любві да народных песень; самастойнае авалоданне ігрой на струнных народных інструментах, напісанне музыкі для самадзейных калектываў.

1950 год — пачатак творчага шляху. Роля І. Жыновіча ў лёсе маладога музыканта. Паступленне ў Беларускую дзяржаўную кансерваторыю ў клас прафесара А.В. Багатырова. Стварэнне ў студэнцкія гады твораў розных жанраў, сярод якіх — Балада для скрыпкі і фартэпіяна, Ронда для скрыпкі і Фантазія для фартэпіяна з сімфанічным аркестрам, Фантазія для народнага аркестра, Канцэрціна для цымбал, Святочная увертюра, Дзіцячая сюіта, сімфанічная паэма-легенда па матывах паэмы Я. Купалы «Магіла льва» і інш.

Сумяшчэнне вучобы ў кансерваторыі з выкладчыцкай дзейнас-

цю ў Мінскім музычным вучылішчы (1954—1963). Праца ў якасці музычнага кіраўніка ў Беларускім дзяржаўным тэатры юнага гледача; праца ў якасці музычнага рэдактара на кінастудыі «Беларусьфільм».

Запрашэнне на выкладчыцкую работу ў Беларускую дзяржаўную кансерваторыю ў 1964 годзе. Плённая дзейнасць Я. Глебава ў кансерваторыі па выхаванню маладых кампазітараў. Актыўны ўдзел у творчым жыцці Саюза кампазітараў БССР.

1960—80-ыя гады — перыяд росквіту творчай дзейнасці кампазітара. Прысуджэнне Я. Глебаву Дзяржаўнай прэміі Беларусі.

Характарыстыка творчасці Я. ГЛЕБАВА

Развіццё кампазітарам традыцый С. Пракоф'ева, Д. Шастаковіча, І. Стравінскага, а таксама беларускіх кампазітараў старэйшага пакалення. Значны ўклад Я. Глебава ў беларускую нацыянальную музыку, садзеянне яе карэннаму абнаўленню, павароту ў рэчышча ўзбагачэння сучаснай стылістыкай, новай тэхнікай кампазітарскага пісьма.

Шырыня мастацкіх інтарэсаў кампазітара, нястомная работа па ўдасканаленню майстэрства.

Разнастайнасць тэматычнага зместу творчасці. Зварот да сучаснай тэматыкі, гераікі Вялікай Айчыннай вайны, гістарычнага мінулага беларускага народа, да тэм грамадзянскага абавязку, лірыкі і інш. Выкарыстанне сюжэтаў з твораў сучасных беларускіх аўтараў (М. Танк, А. Астрэйка, В. Быкаў, П. Макаль, Э. Агняцвет і інш.) і з твораў класікаў (Я. Купала, Я. Колас, Г. Гейнэ, Шарль Анры дэ Кастэр і інш.).

Разнастайнасць жанраў у творчасці кампазітара. Вядучая роля балета і сімфанічнай музыкі. Балеты «Мара» (лібрэта Я. Рамановіча, 1961), «Альпійская балада» (лібрэта Р. Чарахоўскай па аднайменнай аповесці В. Быкава, 1966), «Выбранніца» (лібрэта А. Вярцінскага і А. Дадзішкіліані па матывах паэм Я. Купалы «Магіла льва» і «Сон на кургане», 1969), «Ціль Уленшпігель» (лібрэта А. Дадзішкіліані, 1974; В. Елізар'ева, 1976; па матывах аднайменнага рамана Шарля Анры дэ Кастэра), «Маленькі прынц» па матывах аднайменнай казкі Антуана дэ Сент Экзюперы (лібрэта Л. Глебавай, 1984). Стварэнне пяці сімфоній, некалькіх аркестравых сюіт з музыкі балетаў, а таксама кантат і араторый (з іх найбольш значныя — «Званы», 1967 і «Святі, зара», 1970), хораў, песень, рамансаў, камерна-інструментальных твораў, твораў для аркестра беларускіх народных інструментаў і эстраднага аркестра, музыкі да драматычных спектакляў, да кінафільмаў і інш.

Характэрныя рысы стылю музыкі Я. Глебава. Яркая нацыянальная прырода творчасці. Разнастайныя прыёмы выкарыстання фальклорных крыніц (цытаванне народных мелодый, стварэнне арыгінальных аўтарскіх тэм у духу народных, інкрустацыя характэрных фальклорных абаротаў у музычную тканіну твора).

Шырокае выкарыстанне вострых гарманічных абаротаў, поліфанічнай фактуры, своеасаблівых рытмаў, каларытнай аркестроўкі, выкарыстанне элементаў джазавай музыкі. Многасастаўнасць музыч-

най мовы ў залежнасці ад мастацкай задумы твора. Некаторыя своеасаблівыя стылявыя прыкметы музыкі Я. Глебава: тэрцавыя папеўкі з фрыгійскай афарбоўкай, квартакорды, асабліва на аснове павялічанага трохгучча, рытмічная маторнасць (такатнасць) і інш.

Папулярнасць твораў Я. Глебава ў Беларусі і за яе межамі. Пастаноўка балетаў «Мара», «Выбранніца», «Маленькі прынц» у Маскве, балета «Ціль Уленшпігель» — у Ленінградзе, Польшчы, Фінляндыі.

Другая сімфонія (Мі мінор — Мі мажор) (1963)

Псіхалагізм, дынамічная палётнасць, вобразны тэматызм, стройнасць формы сімфанічнага цыкла, які складаецца з трох кантрастных частак. Каларытнасць аркестроўкі, меладычнасць, эмацыянальная выразнасць музыкі, выяўленне ў ёй інтанацый беларускіх народных песень: «Я табун сцерагу», «На сенажаці медунічка», «Ды чаму ж ты, яліначка».

Песня «Я табун сцерагу», якая гучыць ва ўступе, — аснова тэматычнага матэрыялу ўсяго цыкла: у I частцы з яе вырастае светлая, натхнёная тэма галоўнай партыі санатнага алегра; у II частцы (трохчасткавая форма) — першая лірычная мелодыя ў флейты; у III частцы — фінале (ронда) — фігурацыя акампанементу ў другім эпізодзе.

I частка сімфоніі (Allegro, санатная форма).

Галоўная партыя, яе два кантрастныя вобразы: светлы, прамяністы і задорна-танцавальны (простая трохчасткавая форма). Яркасць тэмы пабочнай партыі. Відазмяненне ў распрацоўцы інтанацыі галоўнай партыі ад маторна-такатнай да насычана-дынамічнай. Паэтычнасць і пяшчотнасць асноўнай тэмы ў рэпрызе, магутнасць і пампезнасць у кодзе. II частка (Andante sostenuto) — лірычнае выказванне, яднанне з прыродай. Выкарыстанне народнага напеву «На сенажаці медунічка» і другой тэмы галоўнай партыі I часткі, якая набывае тут спакойны, паважны характар. Абнаўленне музычнай тканіны гучаннем віяланчэлі і званочкаў на фоне нізкіх тэмбраў кларнетаў. III частка (Allegro con brio, форма ронда). Рэфрэн — «абматораная» другая тэма галоўнай партыі I часткі. Уключэнне ў першы эпізод беларускай народнай песні «Ды чаму ж ты, яліначка», у другі — аўтарскай мелодыі шырокага распеўнага плана, у трэці — першай тэмы II часткі. Завяршэнне сімфоніі ўрачыстай музыкай коды.

Палеская сюіта (1964)

Глыбокае пранікненне ў беларускую народную музыку, адлюстраванне яе спецыфікі. Ператварэнне рытмічных, ладава-інтанацыйных, тэмбравых асаблівасцей нацыянальнага фальклору. Пяць кантрастных частак сюіты: «Дудары» — п'еса, якая перадае майстэрства народных умельцаў; «Балада» — расказ аб суровых буднях; «Галоп» і «Вячэрні пейзаж» — карціны народнага вяселля і беларускай прыроды; «Танец» — кульмінацыя сюіты, заснаваная на жніўнай лірычнай песні «Перапёлачка». Выкарыстанне ў сюіце драўляна-духавых (габой, кларнет), медных (валторна, труба,

трамбон), струнна-смычковых інструментаў, арфы і званочкаў для пераймання тэмбравага гучання народных інструментаў — жалейкі, дудкі, валынкі, скрыпкі.

Балет «Мара» (лібрэта Я. Рамановіча, 1961)

Аснова сюжэта трохактавага балета з пралогам — расказ аб жыцці сучаснай моладзі, аб міры і дружбе людзей, аб вяртанні беларускай дзяўчыны Марыі на Радзіму, аб ажыццяўленні яе мары працаваць балерынай у тэатры. Раскрыццё сюжэта ў двух планах: Марыя за мяжой (вулічны бар, багаты рэстаран, спарахнелае жыллё беднай дзяўчыны, марскі порт) і Марыя на Радзіме (Дварэц культуры, парк, тэатр). Характарыстыка галоўных герояў — Марыі і беларускага юнака Міколы: тэма кахання, «Хабанэра» (II дзеянне, 2-ая карціна), танец Марыі (II дзеянне, 3-ая карціна), адажыо Марыі і Міколы (III дзеянне, 1-ая карціна), дуэт Марыі і Міколы ў танцы касманаўтаў (III дзеянне, 3-ая карціна). Раскрыццё вобраза моладзі ў балеце: «Вальс», «Кола», «Бульба», (I дзеянне), «Касмічны танец» (III дзеянне). Замалёўка персанажаў чужога для Марыі свету — Карласа, танцоўшчыц бара: «Самба», «Танец манекенаў», «Танец масак» (II дзеянне, 1-ая карціна).

Драматургічная роля аркестра (яго сэнсавая нагрузка, маляўнічасць). Своеасаблівае адлюстраванне ў музыцы балета беларускага нацыянальнага фальклору і мелодый Лацінскай Амерыкі.

Балет «Альпійская балада» (лібрэта Р. Чарахоўскай па аднайменнай аповесці В. Быкава, 1967)

Адлюстраванне ў балеце тэмы мужнасці, бяспрыкладнай сілы духу, любві савецкага воіна, беларускага юнака Івана, і італьянскай дзяўчыны Джуліі, якія ўцяклі з фашысцкага канцлагера.

Кампазіцыя лірыка-драматычнага балета. Канфліктнасць драматургіі. Інтанацыйная сфера «ўцекачоў» — Івана (патэтычны маналог) і Джуліі («Бегства Джуліі» і «Тарантэла» з I часткі «Бегства»); іх агульная характарыстыка («Калыханка» з II часткі балета «Перавал», сцэна вадаспада з III часткі «Каханне»). Выкарыстанне прынцыпу лейтматыўнасці: лейтматыў Івана — мужная тэма маналога з I часткі балета; лейттэма Джуліі — песенна-танцавальная мелодыя тарантэлы, якая перадае характар юнай, гарэзлівай, прастадушнай дзяўчыны. Раскрыццё вобраза фашысцкіх карнікаў (тэма маршу). Адметная рыса балета — стварэнне паглыбленай псіхалагічнай замалёўкі герояў сродкамі сімфанічнага развіцця музычнай драматургіі.

Балет «Ціль Уленшпігель» (у першай рэдакцыі — лібрэта А. Дадзішкіліані, 1974; у другой — лібрэта В. Елізар'ева, 1976)

Звяртанне кампазітара і лібрэтыстаў да рамана «Легенда пра Ціля Уленшпігеля» Шарля Анры дэ Кастэра. Паказ жыцця нідэрландскага народа ў XVI стагоддзі ў эпоху іспанскага засілля, бязмежнай улады жорсткага і фанатычнага караля Філіпа II, стварэнне вобраза легендарнага народнага героя-весялуна і гарэзы Ціля Уленшпігеля. Рысы

філасофскай, лірыка-псіхалагічнай драмы балета, яго сацыяльная накіраванасць, высокі гуманізм і грамадзянскі пафас. Станоўчыя (Ціль, Нэле, Клаас, Сооткін, Ламе) і адмоўныя (Філіп II, Рыбнік, шпікі, інквізітары) персанажы балета, іх музычнае ўвасабленне.

Эмацыянальная напружанасць, дынамізм, рэльефнасць музыкі, якая характарызуе асноўныя персанажы; пластычнасць вядучых меладычных тэм; прымяненне ў балеце лейтматываў. Жанравыя народна-бытавыя сцэны: свята асенняга дня (пачатак і канец I дзеяння); сцэна ў таверні (II дзеянне); лагер гезаў (III дзеянне); выкарыстанне ў іх бельгійскіх і фламандскіх мелодый XV—XVIII стагоддзяў. Роля ў драматургіі прынцыпу «абагульнення праз жанр» (жыга, сарабанда).

Звяртанне кампазітара да традыцыйных формаў балета — лірычных адажыо, сольных танцавальных нумароў, пантамімы, скразных разгорнутых сцэн. Роля аркестра ў балеце.

«Ціль Уленшпігель» — значны ўклад у сучасную музыку.

Пытанні і творчыя заданні па тэме:

Раскажыце аб змесце балетаў «Мара», «Альпійская балада», «Ціль Уленшпігель».

Назавіце (сыграйце) асноўныя лейтматывы ўказаных трох балетаў.

Якія беларускія літаратурныя крыніцы ляглі ў аснову балетаў Я. Глебава, з якімі з іх вы знаёмы?

Пералічыце беларускія народныя мелодыі ў творчасці Я. Глебава (сімфоніях, араторыях, балетах).

Якія творы для эстраднага аркестра Я. Глебава вы ведаеце?

Параўнайце «Калыханку» з балета «Мара» ў аркестравым гучанні з аўтарскім пералажэннем яе для кларнета і фартэпіяна.

Вызначце ролю жаночага хору ў балеце «Альпійская балада».

Сфармулюйце асноўнае творчае крэда кампазітара Я. Глебава.

Праслухайце твор для аркестра беларускіх інструментаў «Палеская сюіта», запомніце назву яго частак.

Літаратура для чытання:

Ауэрбах Л. Белорусские композиторы. М., 1978.

Глущенко Г. Вторая симфония Е. Глебова // Советская симфония за 50 лет. Л., 1961.

Златковский Ю. Опыт семантического анализа инструментального речитатива на примере Третьей симфонии Е. Глебова // Вопросы культуры и искусства Белоруссии. Мн., 1983. Вып. 2.

Зубрыч У. Ціль Уленшпігель Я. Глебава // Беларуская музыка. Мн., 1975.

Мухаринская Л. Евгений Глебов. М., 1959.

Ракава А. Яўген Глебаў (старонкі творчасці). Мн., 1975.

Савицкая О. Оратория Е. Глебова «Приглашение в страну детства»: К вопросу эволюции стиля композитора // Вопросы культуры и искусства Белоруссии. Мн., 1984. Вып. 3.

Музычная літаратура для вывучэння:

Другая сімфонія (ч. I і III).

Палеская сюіта (ч. I і V).

Балет «Мара»: «Хабанэра» (дзеянне II), адажыо Марыі і Міколы (III дзеянне), танцы «Бульба» (I дзеянне) і Самба (II дзеянне).

Балет «Альпійская балада»: Калыханка (ч. II), Сцэна вадаспада (ч. III), лейтматывы Івана і Джуліі.

Балет «Ціль Уленшпігель»: лейтматывы Ціля, Нэле, Сооткін, Філіпа; адажыо Ціля і Нэле (I дзеянне), танцавальныя эпізоды (танец Ціля, «Жыга», «Сарабанда»), сцэны «Гезы», «Таверна» (I дзеянне).

СЯРГЕЙ АЛЬБЕРТАВІЧ КАРТЭС
(1935)

С. Картэс — таленавіты кампазітар, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (нарадзіўся ў Чылі ў горадзе Сан-Антоніо ў руска-чылійскай сям'і). Першая настаўніца музыкі — Е.А. Шастакоўская — руская спявачка і піяністка (бабка С. Картэса). Ранняя схільнасць да музычнай творчасці. Заняткі з кампазітарам Я. Фішарам — выхаванцам Петраградскай кансерваторыі. Стварэнне фартэпіянных п'ес (прэлюдыі, інвенцыі, сюіты), хораў; выступленне ў якасці піяніста, акампаніятара і чытача ў публічных канцэртах з праграмамі рускіх, савецкіх і замежных аўтараў.

Пераезд на пастаяннае месца жыхарства ў Мінск (1955). Вучоба ў Сярэдняй спецыяльнай музычнай школе-адзінаццацігодцы, а затым у Беларускай кансерваторыі на фартэпіянным і кампазітарскім аддзяленнях у класах прафесараў Г. Пятрова, М. Аладава, А. Багатырова. Вывучэнне савецкай рэчаіснасці — жыцця, быту, мастацтва, літаратуры, удзел у фальклорных экспедыцыях. Напісанне твораў розных жанраў. Павышэнне майстэрства: кансультацыі ў дацэнта Маскоўскай кансерваторыі Ю. Фартунава (1962), вучоба ў аспірантуры ў прафесара Дзяржаўнага музычна-педагагічнага інстытута імя Гнесіных М. Пяйко (1966—1969). Заняткі педагогікай (выкладанне кампазіцыі, інструментоўкі, гармоніі, аналізу музычных форм) у Мінскім музычным вучылішчы імя М. Глінкі; праца музычным рэдактарам у Беларускім акадэмічным тэатры імя Я. Купалы і студыі «Беларусьфільм». Другая палова 60-ых—80-ыя гады — перыяд творчай сталасці кампазітара. Стварэнне рада значных твораў. Шырокае прызнанне творчасці С. Картэса ў Беларусі і за яе межамі. Пастаноўка оперы «Матушка Кураж» у Малдавіі і Літве, «Джардана Бруна» ў Беларускім тэатры оперы і балета. Праца над балетам «Апошні Інка» (лібрэта Г. Эрэра, Р. Рэймена).

Характарыстыка творчасці С. А. КАРТЭСА

С. А. Картэс — сур'ёзны, удумлівы, мэтанакіраваны мастак. Вобразна-тэматычны змест творчасці — сучаснасць, гістарычнае мінулае, любоў народа да Айчыны, барацьба сіл розуму і святла супраць зла. Перавага ў музыцы драматычных, востродынамічных пачаткаў. Жанравая разнастайнасць твораў. Выкарыстанне сучаснай тэхнікі пісьма (серыйнасць, алеаторыка, санарыстыка): вакальна-сімфанічная паэма «Попел», сюіта «Кантрасты». Своеасаблівы падыход да фальклору — беларускага, рускага, кубінскага, аргенцінскага, італьянскага, французскага (адмаўленне ад цытавання, арганічнае пераўтварэнне ха-

рактэрных мелодыка-рытмічных элементаў народнай музычнай мовы); рысы тэатральнасці (у рамансах, інструментальных п'есах, музыцы да спектакляў, кінафільмаў, радыё- і тэлепастановак.

Жанры ў творчасці С. Картэса: творы для фартэпіяна (Саната, сюіта «Кантрасты», канцэрт «Капрычос» па сюжэтах Гоі; п'есы для віяланчэлі і габоя; для сімфанічнага аркестра (Фантазія на беларускія тэмы, «Музыка для струнных»); для аркестра беларускіх народных інструментаў (Увертюра, сюіта «Характары»); для цымбал і фартэпіяна (Сюіта), араторыя «Песня аб Кубе» (сл. Н. Гільена); вакальныя балады («Уходят матери», сл. Я. Еўтушэнкі, «Охота на людей», сл. Ж. Ленуара); вакальныя цыклы на вершы Г. Лоркі, М. Танка, А. Вярцінскага, У. Шэкспіра, Э. Межэлайціса, Ю. Друнінай; хоры на вершы Я. Коласа, С. Маршака; эстрадныя песні.

Этапныя творы: вакальна-сімфанічная паэма «Попел» (сл. Э. Межэлайціса), араторыя «Памяці паэта» (сл. Я. Купалы); оперы «Джардана Бруна» і «Матушка Кураж» (абодва лібрэта В. Халіпа).

Араторыя «Памяці паэта» (сл. Я. Купалы, 1972)

Прысвячэнне твора вялікаму песняру Беларусі Я. Купалу.

Вобразна-сэнсавая і музычна-стылёвая сувязь араторыі з музыкай кампазітара да тэлефільма «Па шчасце, па сонца» і тэлеспектакля «Раскіданае гняздо» па п'есе Я. Купалы.

Мастацкая канцэпцыя араторыі: увасабленне духоўнага свету паэта, яго роздуму аб сэнсе жыцця, вытоках творчасці, аб народзе і яго лёсе. Асноўныя вобразныя лініі араторыі: паэт-гусляр, Радзіма-маці, народ.

Прынцып скразнога развіцця мастацкай ідэі араторыі на аснове вобразна-кантрастнага супастаўлення розных частак. Героіка-драматычная, лірычная, жанрава-бытавая і эмацыянальна-вобразная сферы араторыі. Розныя тыпы вакальнай мелодыі, абумоўленыя асаблівасцямі паэтычнай канвы.

Рысы нацыянальнай своеасаблівасці музыкі, творчае выкарыстанне элементаў песеннага фальклору. Узбагачэнне музычнай мовы араторыі, выкарыстанне, побач з традыцыйнымі, навейшых кампазіцыйных прыёмаў (алеаторыка, серыйная тэхніка, акорды-кластары і інш.).

Пабудова твора: пралог і тры часткі (7 нумароў). Выканаўцы — чытальнік, 2 салісты (тэнар і мецца-сапрана), 2 хоры (змешаны і дзіцячы), сімфанічны аркестр (з уключэннем у партытуру дваіх цымбал). Свежасць музычна-выразных сродкаў (выкарыстанне дванаццацігучнага комплексу, пентатонная мелодыя, блізкая да беларускай народнай песні эпічнага складу, аркестравыя і харавыя каларыстычныя знаходкі). Перавага нацыянальных інтанацый у музыцы з уключэннем прыёмаў сучаснага кампазітарскага пісьма. I частка — «Мая навука», «Ваўкалак», «На Купалле». Нацыянальны каларыт музыкі першага і трэцяга нумароў, гукавыяўленчасць музыкі сярэдняга раздзела, дзе паказаны вобраз нячыстай сілы і панскага прыгнёту. II частка — некалькі хораў, найбольш яркія з якіх «Гусляр» і «Стукі-стук, малаток»; музыка першага з іх жыц-

цярадасная, звонка-пералівістая; музыка хору «Стукі-стук, малаток» — валявая, імклівая, рытмічна завостраная; III частка — фінал, які ўслаўляе народную перамогу, свабоду і шчасце. Кода араторыі — песня «На Купалле» ў выкананні дзіцячага хору, які сімвалізуе абнаўленне жыцця.

Опера «Джардана Бруна» (лібрэта В. Халіпа, 1977)

Сюжэт музычнай драмы, у якім расказваецца пра вялікага вучонага, філосафа, паэта. Перавага рэчытатыўнасці ў вакальных партыях. Песенна-арыёзныя эпізоды ў характарыстыцы Джардана Бруна, Паолы, Пісьма вадзіцеля. Замалёўкі вобразаў Інквізітара, Нунцыя, даносчыка Мачэніга змрочнай вычурнай музыкай. Народ (хор) — дзеючая сіла, каментатар падзей, які ўзнаўляе жыццёвыя бытавыя сітуацыі. Аркестр — адзін з галоўных «персанажаў» оперы, які перадае музычныя партрэты герояў, стварае музычнымі сродкамі атмасферу часу і месца падзей, у аркестры гучаць інтанацыі італьянскай музыкі XVI ст., танцы — павана, тарантэла; імітуюцца старажытныя інструменты (лютня). Выкарыстанне прыёмаў, уласцівых драматургіі кіно, — творчая ўдача кампазітара (прыём наплываў і інш.).

Маналог Бруна ў цямніцы, «Песенька Паолы» і заключная сцэна оперы — маналог Чытальніка і хор (іх драматургічная функцыя, музычна-выяўленчыя сродкі).

Пытанні і творчыя заданні па тэме:

Назавіце паэтычныя тэксты, якія ляжаць у аснове вакальных твораў С. Картэса.

Які змест вакальна-сімфанічнай паэмы «Попел»?

Да якіх драматычных спектакляў напісана музыка С. Картэсам?

Якія вершы Я. Купалы выкарыстаны ў араторыі «Памяці паэта»?

Праслухайце баладу «Уходят матери» на вершы Я. Еўтушэнкі і «Весёлые детские песенки» на сл. С. Маршака і ахарактарызуйце іх.

Прааналізуйце ролю Чытальніка ў араторыі «Памяці паэта».

Вывучыце асноўныя лейтматывы араторыі «Памяці паэта».

Вызначце форму «Песенькі Паолы» ў оперы «Джардана Бруна».

Праслухайце песню Матушкі Кураж з оперы «Матушка Кураж» і раскрыйце яе змест.

Літаратура для чытання:

Ауэрбах Л. Белорусские композиторы. М., 1979.

Юденич Н. Надежды и сомнения // Сов. музыка. 1967, № 5.

Журавлев Д. Союз композиторов БССР. Мн., 1978.

Друкт А. Об опере Сергея Картеса «Матушка Кураж» // Вопросы культуры и искусства Белоруссии. Мн., 1984. Вып. 3.

Музычная літаратура для вывучэння:

Араторыя «Памяці паэта» (сл. Я. Купалы): Пралог, ч. I («Мая навука», «Ваўкалак»), ч. II («Гусляр» і «Стукі-стук, малаток»), Кода (дзіцячы хор «На Купалле»).

Опера «Джардана Бруна»: маналог Бруна ў цямніцы, «Песенька Паолы», заключная сцэна — маналог Чытальніка на фоне хору «Джардана Бруна...».

ДЗМІТРЫЙ БРАНІСЛАВАВІЧ СМОЛЬСКІ (1937)

Д. Б. Смольскі — вядомы беларускі кампазітар, народны артыст Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі, прафесар.

Дзіцячыя і юнацкія гады кампазітара ў г. Мінску, страсная любоў да музыкі; вучоба ў Сярэдняй спецыяльнай музычнай школе пры Белдзяржкансерваторыі па класу фартэпіяна ў Г. Пятрова; урокі кампазіцыі ў Я. Цікоцкага. Першыя крокі ў музычнай творчасці (песні, фартэпіянныя п'есы). Гады вучобы на аддзяленні кампазіцыі спачатку ў Маскоўскай, а затым у Беларускай кансерваторыях (1955—1960; клас прафесара А. Багатырова). Удзел у студэнцкіх фальклорных экспедыцыях. Захапленне творчасцю М. Мяскоўскага, С. Пракоф'ева і асабліва Д. Шастаковіча. Далейшае ўдасканаленне прафесійнага майстэрства ў аспірантуры пад кіраўніцтвам прафесара Дзяржаўнага музычна-педагагічнага інстытута імя Гнесіных М. Пяйко.

Уступленне ў Саюз кампазітараў БССР (1961); праца выкладчыкам у Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі.

1960-ыя гады — перыяд інтэнсіўнай творчай дзейнасці, пошукаў і эксперыментаў, авалодванне асновамі высокай прафесійнай культуры, сучаснымі сродкамі музычнай выразнасці. Вялікая роля Л. Абеліёвіча ў фарміраванні Д. Смольскага-кампазітара. Варыяцыі на basso ostinato для флейты і фартэпіяна, камерная араторыя «Песні Хірасімы», санаты для флейты і фартэпіяна, фартэпіянная сюіта «Ігра святла», Музыка для струнных, дзвюх труб і баяна, Другая сімфонія і інш. Першы канцэрт для цымбал і аркестра беларускіх народных інструментаў (1961) і Першая сімфонія (1962) — творы, у якіх складваюцца характэрныя асаблівасці творчага аблічча кампазітара.

1970—80-ыя гг. — перыяд сталасці, росквіту таленту, дэманстрацыі высокага прафесіяналізму, выяўленне характэрных стылявых рыс. Узбагачэнне жанравай прыроды творчасці. Паяўленне вялікай колькасці па-мастацку значных твораў.

Павышаная цікавасць да вакальных і вакальна-сімфанічных жанраў, жанраў камерна-інструментальнай і сімфанічнай музыкі, да оперы. Стварэнне манументальнай араторыі «Мая Радзіма» (1970), вакальнага цыкла «Бабскі век» (1971) для мецца-сапрана і фартэпіяна (пазней і для струннага аркестра); «Паэмы аб Нёмане» (1975), «Паэмы аб Дняпры» (1975), араторыі «Паэт» (1979—1980); двух канцэрціна для скрыпкі (1971) і для віяланчэлі (1973) з аркестрам, Другога фартэпіяннага канцэрта (1975), Другога канцэрта для цымбал і камернага аркестра (1974), Рапсодыі для дваіх цымбал і народнага аркестра (1980), Трэцяга канцэрта для цымбальнага і струннага аркестраў (1983), Трэцяй, Чацвёртай, Пятай, Шостай і Сёмай сімфоній (1984—1990), опер «Сівая легенда» (1978) і «Францыск Скарына» (1982) і рада іншых твораў.

Глыбокае вывучэнне кампазітарам творчасці сучасных замежных і савецкіх кампазітараў. Шматлікія паездкі за мяжу, удзел у

фестывалях, з'ездах і пленумах кампазітараў нацыянальных рэспублік. Педагагічная дзейнасць у кансерваторыі, выхаванне маладых кампазітараў. Грамадская дзейнасць у Саюзе кампазітараў Беларусі ў якасці члена Праўлення.

Характарыстыка творчасці Д. СМОЛЬСКАГА

Рознабаковасць таленту, шырыня мастацкіх інтарэсаў, многажанравасць творчасці: оперы, сімфоніі, паэмы, уверцюры, канцэрты, вакальна-сімфанічныя цыклы, кантаты, араторыі, камерна-інструментальныя творы, творы для аркестра беларускіх народных інструментаў, музыка да драматычных спектакляў, кінафільмаў, радыёспектакляў, песні, хоры, рамансы, эстрадная музыка.

Выразнае праяўленне ў творчасці кампазітара тэндэнцыі ўзбагачэння жанраў, форм, музычнай мовы, характэрнай для беларускай музыкі 1960—80-ых гг. Творча смелае выкарыстанне нацыянальных элементаў, ініцыятыўнае, разам з тым стрыманае выкарыстанне прыёмаў і сродкаў выяўленчасці навейшых кампазіцыйных сістэм — дадэкафоніі, алеаторыкі, санарыстыкі. Сучаснасць вобразнага зместу і музычнага стылю кампазітара.

Асаблівы ўклад у развіццё жанру сімфоніі, інструментальнага канцэрта, вакальнай музыкі. Разнастайнасць тэматыкі і вобразнага свету, філасофская глыбіня зместу многіх твораў. Высокі прафесіяналізм. Папулярнасць многіх твораў.

Сімфанічная уверцюра До мажор (1963)

Святочны характар адначасткавай кампазіцыі; яе даступнасць шырокай аўдыторыі. Яркая вобразнасць музыкі. Традыцыйная трактоўка санатнай формы з кодай (на матэрыяле тэмы галоўнай партыі). Рысы нацыянальнай своеасаблівасці Уверцюры, яе папулярнасць. Асацыяцыі са Святочнай уверцюрай Д. Шастаковіча.

Першы канцэрт для цымбал і аркестра беларускіх народных інструментаў До мажор (1961)

Выразнасць тэматычнага матэрыялу, гарманічнай мовы і аркестроўкі. Сучаснасць меладычных інтанацый і танцавальных рытмаў. Форма канцэрта (санатнае алегра). Веданне і ўмелае выкарыстанне выяўленчых магчымасцей цымбал.

Другі канцэрт для цымбал і камернага аркестра Ля мінор (1974)

Прысвячэнне твора памяці народнага артыста СССР прафесара І. Жыновіча. Кантрастны прынцып драматургіі канцэрта пры адзінстве тэматычнага матэрыялу. Уступны раздзел канцэрта — прэлюдыя; першая частка — імклівая, актыўная; другая частка — павольная, у характары рэквіема. Сцвярджэнне аптымістычнага пачатку ў постлюдыі.

Канцэрціна для скрыпкі і струннага аркестра (1971)

Жыццярадасны характар твора. Выкарыстанне ў кампазіцыі беларускай народнай песні «Чаму ж мне не пець, чаму ж не гуд-

зець?». Рознабаковае развіццё тэмы варыяцыйнымі прыёмамі ў трох раздзелах канцэрціна: I ч. — Andante, molto allegro; II ч. — Adagio; III ч. — Andante. Allegro. Piu lento. Рэпертуарнасць твора, яго выкананне юнымі скрыпачамі.

Араторыя «Мая Радзіма (на словы беларускіх паэтаў і народныя, 1970)

Прысвячэнне араторыі гістарычнаму мінуламу Беларусі і сучаснаму жыццю народа. Патрыятычная накіраванасць твора. Яго сувязь з традыцыямі кантатна-аратарыяльнага жанру: апяванне Радзімы, зварот да яе гісторыі, выкарыстанне тыповай кампазіцыйнай схемы, заснаванай на чаргаванні кантрастных частак, жанравай разнастайнасці музыкі, скразнога развіцця, оперна-сімфанічных прыёмаў (арыёзнае спяванне, драматычны рэчытатыў, дыялог, хоры а капэла), песеннага фальклору. Змест араторыі, якая складаецца з дзевяці частак: «Мая мова» (сл. Р. Барадуліна), «Я песню прызнання табе складаў» (сл. Н. Гілевіча), «Дзе б ні быў я» (сл. А. Александровіча), «Скрыпка і бубен» (сл. А. Ставера), «Люблю зямлю» (сл. С. Грахоўскага), «Рэквіем» (сл. А. Вярцінскага), «Мы выцерпелі многа» (сл. П. Панчанкі), «Ой, крушына, крушына» (сл. народныя), «Не толькі таму ўзяў я гэту мову» (сл. М. Танка).

Разнастайнасць музычных вобразаў: драматычныя (ч. III), журботныя (ч. VI), пастаральныя (ч. V), лірычныя (ч. VIII), жанрава-бытавыя (ч. IV) і інш.

Важная роля чытальніка і аркестра ў раскрыцці зместу паэтычнага тэксту. Узбагачэнне аркестравай партыі сучаснай тэхнікай пісьма;выкарыстанне выяўленчых падгалоскаў саліруючых інструментаў (напрыклад, альтавай флейты ў ч. VI, скрыпкі і бубна, якія імітуюць народныя найгрышы, у ч. IV); прымяненне фанічных элементаў (аркестравых педалей, квінтавых паралелізмаў, незвычайных тэмбрава-гарманічных фарбаў і інш.). Творчае пераасэнсаванне мелодый народных песень «Ой, хацела ж мяне маці...» (ч. VI) і «Ой, крушына, крушына» (ч. VIII). Афарбаванасць музыкі фальклорнымі інтанацыямі IV і VII частак.

Найбольшая выразнасць і мастацкая значнасць V, VIII і IX частак араторыі.

V частка «Люблю зямлю» (арыёза тэнара) — пейзажная замалёўка беларускай прыроды. Мяккая, акварэльная гучнасць аркестра; шырокая распеўнасць і гібкасць сольнай тэнаровай партыі, яе дыятанічны склад, пераменная метрыка.

VIII частка «Ой, крушына,крушына» (жаночы хор а капэла) — расказ аб няшчасцях у гады Вялікай Айчыннай вайны (пераклічка са зместам VI часткі «Рэквіем»). Эмацыянальная напоўненасць хору выяўленчымі сродкамі імітацыйнай поліфаніі, вылучэнне секундавага выгуку-галашэння «Ой» (у сапрана і альтоў) і характэрнага для народных мелодый узыходнага квартавага абароту з наступным сыходным запаўненнем, што характэрна для народных песень.

IX частка «Не толькі таму ўзяў я гэту мову» (Чытальнік і зме-

шаны хор) — апафеоз Радзімы і народа (урачыстая прыўзнятасць музыкі, яе інтанацыйная блізкасць з II, III і IV часткамі).

Завяршэнне араторыі дэкламацыяй чытальніка, які выступае ад імя паэта — складальніка песень аб жыцці беларускага народа. Патрыятычная накіраванасць араторыі. Сувязь з традыцыямі кантатна-аратарыяльнага жанру беларускіх кампазітараў і рысы новага стылю. Выкарыстанне дасягненняў сучаснай музыкі. Скразны прынцып музычнага развіцця; кантрастнасць кампазіцыйнай структуры; творчае пераасэнсаванне песеннага фальклору.

Сімфонія № 5 для саліруючай скрыпкі і сімфанічнага аркестра (1986)

Адначасткавая форма сімфоніі з трыма раздзеламі. Тэндэнцыя да паглыбленага сімфанізму, раскрыццё ўнутранага свету чалавека, яго сутыкнення з рэальнай рэчаіснасцю. Маналагічны прынцып сімфоніі, выкарыстанне ў ёй саліруючага інструмента (скрыпкі) як выражэння індывідуальнага свету чалавека.

Драматычны характар кампазіцыі абумоўлены развіццём кантрастных вобразаў.

Пытанні і заданні па тэме:

Назавіце песні Д. Смольскага.

Тэксты якіх паэтаў Д. Смольскі выкарыстоўвае ў сваіх камерна-вакальных творах?

Да якіх драматычных спектакляў, кінафільмаў і радыёспектакляў напісаў музыку Д. Смольскі?

Зрабіце аналіз песні «Обелиски» на вершы М. Ясеня (1964). Раскрыйце яе ідэйна-вобразны змест, кола выяўленчых сродкаў. Вызначце сэнсавую ролю фрагмента мелодыі песні А. Аляксандрава «Священная война» ў песні Д. Смольскага. Якую творчую задачу паставіў перад сабою кампазітар?

На аснове слыхавога аналізу правядзіце параўнальную характарыстыку сімфанічнай уверцюры До мажор Д. Смольскага і Святочнай уверцюры Д. Шастаковіча.

Самастойна праслухайце і ахарактарызуйце Элегію і Такату памяці Д. Шастаковіча для скрыпкі і фартэпіяна Д. Смольскага (1975).

Літаратура для чытання:

Ауэрбах Л. Белорусские композиторы. М., 1978.

Хвісюк М. Араторыя Д. Смольскага «Мая Радзіма» // Музыка нашых дзён. Мн., 1972.

Смольскі Д. Сівая легенда (лібрэта оперы). Мн., 1980.

Смольский Д. Интервью // Творчество (Вестник композитора). М., 1976. Вып. 2.

Музычная літаратура для вывучэння:

Сімфанічная уверцюра До мажор.

Першы канцэрт для цымбал і аркестра народных інструментаў До мажор.

Другі канцэрт для цымбал і камернага аркестра Ля мінор.

Араторыя «Мая Радзіма» (чч. V, VIII, IX).

Канцэрціна для скрыпкі і струннага аркестра (чч. I, III).
Пятая сімфонія (ч. I).

АНДРЭЙ ЮР'ЕВІЧ МДЗІВАНІ (1937)

А. Ю. Мдзівані — вядомы сімфаніст, майстар харавога пісьма, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі.

Дзіцячыя гады ў г. Тбілісі. Вучоба ў сярэдняй школе ў г. Віцебску і Смаленскім музычным вучылішчы. Праца загадчыкам музычнай часткі ў драматычных тэатрах г. Смаленска, Дзяржынска Горкаўскай вобласці і Кірава (1961—1964).

Пераезд у Мінск і вучоба ў Беларускай кансерваторыі па класу кампазіцыі прафесара А. Багатырова (1964—1969). Глыбокае вывучэнне беларускага музычнага фальклору, літаратуры і мастацтва, твораў нацыянальных кампазітараў старэйшага пакалення. Удзел у фальклорных экспедыцыях. Творчая дружба і кантакты з Л. Абеліёвічам. Роля Л. Абеліёвіча ў станаўленні мастацкіх інтарэсаў маладога музыканта. Далейшае ўдасканальванне прафесійнага майстэрства ў асістэнтуры-стажыроўцы пад кіраўніцтвам прафесара Дзяржаўнага музычна-педагагічнага інстытута імя Гнесіных М. Пяйко (1970—1972). Праца выкладчыкам у Мінскім музычным вучылішчы і загадчыкам музычнай часткі ў Беларускім акадэмічным тэатры імя Я. Купалы, дацэнтам у кансерваторыі.

Паяўленне першых твораў у студэнцкія гады — Саната для віяланчэлі і фартэпіяна (1965), Сімфонія № 1 (1968) і інш.

Уступленне ў Саюз кампазітараў Беларусі (1970) і пачатак актыўнай творчай дзейнасці.

Сур'ёзныя, патрабавальныя адносіны да прафесіі кампазітара, пераадоленне пераймання, усведамленне самастойнага шляху развіцця, пошук індывідуальнага стылю. Узмацненне цікавасці да жанраў сімфанічнай, камерна-інструментальнай і харавой музыкі. Творы кампазітара ў гэтых жанрах: Другая і Трэцяя сімфоніі (1971, 1979), сімфанічная паэма «Пахаванне Хатыні» (1971), Канцэрт для сімфанічнага аркестра (1973), сімфанічная паэма «Дыялект» (1974), «Святочная паэма» (1978), Славянскае капрычыо для дзвюх скрыпак і сімфанічнага аркестра (1979), араторыі «Ванька-ўстанька» на словы Я. Еўтушэнкі (1972) і «Вольнасць» па кнізе А. Радзішчава «Падарожжа з Пецярбурга ў Маскву» (1975); цыкл хораў а капэла «Снапочак» (1976, сл. народныя), вакальны цыкл «Песні кахання» (1978, вершы Г. Апалінэра), рад хораў а капэла, п'есы для фартэпіяна, для аркестра народных інструментаў; музыка да кінафільмаў і інш.

Праяўленне самабытнага стылю ў творах 1970-ых гадоў; уступленне ў паласу росквіту кампазітарскага таленту.

Творчасць А. Мдзівані 1980-ых гадоў. Стварэнне значных, мастацка-закончаных твораў — Чацвёртай, Пятай і Шостай сімфоній, аперэты «Дзяніс Давыдаў», сюіты «Раёк» для аркестра беларускіх народных інструментаў і фантазіі «Лянок» для народнага аркестра, цыкла хораў памяці А. Свешнікава, харавых цыклаў на вершы Я. Купалы, на вершы рускіх паэтаў.

Прызнанне грамадскасцю рэспублікі музычнай творчасці А. Мдзівані. Прысуджэнне кампазітару Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1988).

Характарыстыка творчасці А. МДЗІВАНІ

Цікавасць кампазітара да гістарычнай тэматыкі, культурнай спадчыны беларускага народа; філасофская трактоўка мастацкіх задум (пятая сімфонія «Памяці Зямлі»; шостая сімфонія «Полацкія пісьмёны»; «Сімфонія ў стылі барока», араторыя «Вольнасць» і інш.). Вобразнасць музыкі, рэльефнасць тэматызму. Глыбокае пранікненне ў спецыфіку народна-песеннай творчасці; выкарыстанне народных паэтычных тэкстаў як вобразна-выяўленчага фактару. Аркестравае пісьмо з яркімі тэмбравымі знаходкамі. Пошукі ў галіне музычнай мовы, форм; даніна тэндэнцыі ўзбагачэння традыцый беларускай музыкі 1960 — 80-ых гг.; уклад А. Мдзівані ў абнаўленне нацыянальнага стылю. Мастацка-эпічная накіраванасць твораў кампазітара, іх патрыятычная мастацка-выхаваўчая функцыя.

Асаблівая цікавасць да сімфанічнага жанру. Творчая трактоўка класічных форм і сродкаў выразнасці: нетрадыцыйны склад аркестра (сімфанічная паэма «Дыялект»), замена распрацовачных прынцыпаў прыёмам супастаўлення кантрастных эпізодаў (другая сімфонія «Песні для аркестра», I частка). Узбагачэнне стылю на аснове мастацкага сінтэзу аркестравых і харавых жанраў. Дэманстрацыя высокай культуры ў харавой музыцы і творах для голасу з фартэпіяна (харавыя цыклы «Снапочак», «Вясельныя песні»; харавы канцэрт «Прымхі» і інш.).

Харавы цыкл «Снапочак» (1976)

Выкарыстанне ў цыкле тэкстаў адзінаццаці народных песень: «Снапочак», «Салавейка», «Ой, сівы конь бяжыць», «Пры Дунаёчку», «Маслінка», «Купалялё», «Перад Пятром», «Ой, пара дамоў, пара», «Вяснянка», «Гуселькі», «Там, за садамі» (Анталогія беларускіх народных песень. Запіс і каментарыі Г. Цітовіча. Мн., 1966).

Стылявыя асаблівасці і музычна-выразныя сродкі хораў, іх форма. Прынцып адзінства цыкла (перавага каляндарна-абрадавай сюжэтыкі, захаванне танальнасці арыгінала). Рысы, якія збліжаюць цыкл з сюітай (кантрастнае чаргаванне частак, самастойнасць кожнага хору, адсутнасць агульнага інтанацыйнага стрыжня). Папулярнасць твора, аналогія з хорамі Г. Свірыдава, С. Слонімскага, В. Гаўрыліна, А. Багатырова.

Шостая сімфонія «Полацкія пісьмёны» (1987)

Прысвячэнне сімфоніі 1125-годдзю горада Полацка. Значнасць мастацкай задумы сімфоніі, яе філасофска-маральны кантэкст: уваскрашэнне гістарычнага мінулага Беларусі, яе культурных каштоўнасцей; даніна памяці выдатным асветнікам беларускай зямлі.

Мастацкае адлюстраванне ў дзвюх частках сімфоніі вобразаў-абліччаў даўняй мінуўшчыны, велічнасці спраў асветнікаў Ефрасінні Полацкай, Сімяона Полацкага, Францыска Скарыны (ч. I — «Абліччы», ч. II — «Пісьмёны»).

Былінна-эпічныя і харальныя вобразы сімфоніі. Яркая вобразнасць, «бачнасць» музыкі.

Музычна-кампазіцыйны план Першай часткі, якая ўключае чаргаванне «сцэн»-эпізодаў; рысы тэатральнасці гэтай часткі. Драматургічна-сэнсавая роля хору ў Другой частцы, які дапаўняе і канкрэтызуе сэнсавы змест твора. Сінтэз вакальнага і інструментальнага пачаткаў як характэрная прыкмета ўзбагачэння традыцый сучаснага сімфанізму.

Сцвярджэнне музыкай сімфоніі высокіх маральных пачаткаў, выяўленне патрыятызму.

Музычная камедыя «Дзяніс Давыдаў» (1984)

Раскрыццё ў творы па п'есе В. Салаўёва героіка-патрыятычнай тэмы. Своеасаблівасць жанравай прыроды аперэты, якая мае рысы оперы і араторыі. Павышэнне ролі скразнога развіцця, прынцыпаў сімфанізму, масавых харавых сцэн. Яркасць, вобразнасць музыкі. Значная ўвага жанрава-бытавому пачатку. Музычна-партрэтная характарыстыка асноўных удзельнікаў дзеяння — Дзяніса Давыдава, Андрэя, Агнесы, Кутузава.

Пытанні і творчыя заданні па тэме:

Што вы ведаеце аб араторыі «Вольнасць» А. Мдзівані, якая створана па кнізе А. Радзішчава «Падарожжа з Пецярбурга ў Маскву»?

Пералічыце камерна-інструментальныя творы кампазітара.

Праслухайце ў тэатры музычную камедыю «Дзяніс Давыдаў». На пасяджэнні творчага гуртка «Беларуская музыка» прыміце ўдзел у абмеркаванні твора і спектакля.

Вывучыце на памяць народныя песні, тэксты якіх выкарыстаны ў харавым цыкле «Снапочак». Правядзіце параўнальны аналіз гэтых песень з адпаведнымі харавымі нумарамі цыкла «Снапочак».

Літаратура для чытання:

Аладова Р. Андрей Мдивани (буклет). Мн., 1980.

Брулон В. Духоўны пачатак // Наст. газ. 1988. 12 ліст.

Голикова Л. О типологии принципов программности // Вопросы культуры и искусства Белоруссии. Мн., 1985. Вып. 4.

Сергіенка Р. Звяртанне да тэмы героікі // Вяч. Мінск. 1985, 24 чэрв.

Сергіенка Р. Аб прыгажосці і велічнасці мінулага // Вяч. Мінск. 1988, 31 каст.

Музычная літаратура для вывучэння:

Шостая сімфонія: ч. I («Абліччы»).

Харавы цыкл «Снапочак»: «Гуселькі», «Салавейка», «Вяснянка», «Там, за садамі».

Музычная камедыя «Дзяніс Давыдаў»: Раманс Дзяніса, Хор гусараў.

ІГАР МІХАЙЛАВІЧ ЛУЧАНОК (1938)

І. М. Лучанок — народны артыст СССР, лаўрэат Дзяржаўных прэмій СССР і Беларусі, вядомы грамадскі дзеяч.

Дзіцячыя гады ў Мар'інай Горцы (Мінская вобл.), захапленне музыкай: ігра на цымбалах, гармоніку, фісгармоніі. Вучоба ў Сярэдняй спецыяльнай музычнай школе пры Белдзяржкансерваторыі ў класе цымбал у заслужанага артыста Беларусі А. Астрамецкага. Першы кампазітарскі вопыт — песня «О солдатской дружбе» на словы ваеннага лётчыка І. Шамава. Вучоба ў Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі ў класе кампазіцыі прафесара А. Багатырова і фартэпіяна — прафесара Г. Шаршаўскага. Далейшае ўдасканальванне прафесійнага майстэрства ў прафесара В. Салманава (Ленінград) і ў аспірантуры пад кіраўніцтвам прафесара Ц. Хрэннікава. Напісанне ў кансерваторскія гады Фантазіі для фартэпіяна, цыкла рамансаў «Сіні колер», Санаты для скрыпкі і інш. Дыпломная работа — кантата «Курган» на вершы аднайменнай паэмы Я. Купалы і дзве часткі сімфоніі (1961), вынік аспіранцкай вучобы (1968—1970) — кантата «Невядомы салдат» на вершы П. Харкова, вакальныя творы, Саната для фартэпіяна. Напісанне ў ленінградскі перыяд (1963—1965) інструментальных твораў — Струннага квартэта, Прэлюдыі для фартэпіяна (з выкарыстаннем серыйнай тэхнікі), Санаты для габоя і фартэпіяна, а таксама вакальных цыклаў.

Захапленне жанрам вакальнай музыкі, вывучэнне народнай песні ў фальклорных студэнцкіх экспедыцыях, зварот да песеннага жанру ў гады вучобы (хор «Балада аб салдацкім сэрцы»).

Творчае супрацоўніцтва І. Лучанка з выканальніцкімі калектывамі і асабліва з Дзяржаўным эстрадным ансамблем «Песняры», з ВІА «Верасы», з вядомымі спевакамі. Зварот кампазітара да беларускай паэзіі (Я. Купала, Я. Колас, М. Багдановіч, А. Куляшоў, М. Танк, А. Русак, П. Броўка, Н. Гілевіч, У. Някляеў, Г. Бураўкін, М. Ясень) і да вершаў савецкіх аўтараў (Я. Еўтушэнка, Р. Раждественскі і інш.).

Шырокая грамадская дзейнасць кампазітара: шматлікія сустрэчы з працоўнымі рэспублікі, паездкі за мяжу, удзел ва ўсесаюзных і міжнародных фестывалях, кіраўніцтва кампазітарскай арганізацыяй рэспублікі.

Характарыстыка творчасці І. ЛУЧАНКА

Працяг песенных традыцый беларускіх кампазітараў — У. Алоўнікава, Ю. Семянякі, І. Кузняцова, прыхільнасць да лепшых узораў песень І. Дунаеўскага, В. Салаўёва-Сядога, М. Блантэра, С. Тулікава, А. Пахмутавай і інш.

Яркасць меладычнага даравання, валоданне ўсім арсеналам выяўленчых сродкаў песеннага жанру, веданне магчымасцей пеўчага голасу, глыбокае пранікненне ў паэтычнае слова — галоўныя рысы, якія выявіліся ўжо ў ранняй творчасці кампазітара і сталі асноўнымі ў яго сталыя гады. Багацце і разнастайнасць палітры песенных вобразаў: гераіка-патрыятычныя, апавядальна-эпічныя, любоўна-лірычныя,жартоўна-сатырычныя, гнеўна-выкрывальныя, прастадушна-гумарыстычныя. Імкненне да абнаўлення музычнай мовы, сучасны песенны стыль, пошук новых форм драматургіі песні, адыход ад запеўна-прыпеўнай пабудовы і стварэнне песенных форм адзінага скразнога развіцця (свабодная баладная канструкцыя, трохчасткавая пабудова), роля акампанементу ў раскрыцці вобраза песні (гукавыяўленчасць, падк-

рэсліванне «галоўных» слоў тэксту). Зварот кампазітара да высокамастацкіх, змястоўных вершаў.

Баладная лінія ў песнях І. Лучанка: «Родник» (сл. А. Грачанікава), «Ветераны» (сл. С. Вікулава), «А мальчишки играют в войну» (сл. М. Алтухова), «Если б камни могли говорить» (сл. Р. Раждественскага), «Памяць сэрца» і «Письмо из 45-го» (сл. М. Ясеня), «Балада пра Чэ Гевару» (сл. Г. Бураўкіна), «Хатынь» (сл. Г. Пятрэнкі).

Лірыка-патрыятычныя песні: «Спадчына» (сл. Я. Купалы), «Мой родны кут» (сл. Я. Коласа), «Жураўлі на Палессе ляцяць» (сл. А. Ставера), «Мар'іна Горка» (сл. Б. Бруснікава), «Песня пра Мінск» (сл. П. Панчанкі), «Майскі вальс» (сл. М. Ясеня); любоўна-лірычныя: «Вераніка» (сл. М. Багдановіча), «Алеся» (сл. А. Куляшова), «Зачарованая мая» (сл. Г. Бураўкіна), «Заклинание» (сл. Я. Еўтушэнкі), «Дзе ты, зорка мая?» (сл. А. Русака), «И пока на земле существует любовь» (сл. Р. Раждественскага); маладзёжна-рамантычныя: «Брыганціны» (сл. В. Лукшы), «Дружба» (сл. Ю. Рыбчынскага), «Мы идем по стране» (сл. В. Фірсава); песні аб барацьбітах за мір: «Памяти Виктора Хары» (сл. Б. Бруснікава); дзіцячыя песні: «Мамина песенка» (сл. М. Пляцкоўскага), «Песенька пра бусла» (сл. А. Вярцінскага), «О доброте» (сл. Н. Тулупавай); жартоўна-гумарыстычныя: «Дударыкі» (сл. А. Грачанікава), «Ганулька» (сл. Я. Коласа), «Добры вечар, дзяўчыначка» (сл. народныя), «Матылі» (сл. Г. Бураўкіна).

Мастацкая каштоўнасць вакальных цыклаў «Человеку нужна тишина» (сл. М. Траата, М. Грыбачова, В. Нулеміна), «Война не нужна» (сл. В. Шэфнера, Г. Пажаняна, Ю. Каштаняна).

Песня-балада «Память сердца» (сл. М. Ясеня, 1966)

Папулярнасць твора (першае месца на Усесаюзным конкурсе на лепшую савецкую песню). Прысвячэнне песні ветэранам Вялікай Айчыннай вайны. Лірыка-драматычны характар музыкі. Выяўленчасць рэчытатыўна-эпічнага складу мелодыі; строгае суправаджэнне фартэпіяна ў першым раздзеле («Когда ночь город обнимает...»); дэкламацыйнасць і шырокія меладычныя ходы, маршавы рух фартэпіяннага суправаджэння і кульмінацыйная хваля — у другім раздзеле («И вновь уходят в тьму ребята...»); арыгінальнае па задуме заключэнне, пабудаванае на пачатковай фразе песні «Радзіма, мая дарагая» У. Алоўнікава.

Жураўлі на Палессе ляцяць (сл. А. Ставера, 1971)

Арыгінальнасць трактоўкі патрыятычнай ідэі сродкамі лірычнага выказвання. Маляўнічасць і гукавыяўленчасць акампаніруючага фону (фартэпіяна), які перадае карціну жураўлёў, якія ляцяць па небе. Кранальна-пяшчотная, задушэўная мелодыя тэнару, якая павольна развіваецца ў трох куплетах (пры размеры 12/8 і тэмпе Moderato cantabile).

Спадчына (сл. Я. Купалы, 1972)

Песня для хору ў духу купалаўскай паэзіі. Праграмны твор лірыка-эпічнага складу. Прастата інтанацый, блізкіх да народных напеваў, своеасабліва манатонны рытмічны малюнак (♩ ♪) пры размеры

12/8, «закалыхваючая» фігурацыя акампанементу — рысы, якія надаюць музыцы пачуццё непасрэднасці, давернасці.

Сувязь песні з інтанацыямі і абаротамі лірычных беларускіх напеваў, з паэтычным тэкстам, напоўненым высакароднымі, стрыманымі выказваннямі.

Пытанні і творчыя заданні па тэме:

Якія жанры найбольш папулярныя ў творчасці кампазітара І. Лучанка?

Якому чылійскаму паэту прысвяціў песню І. Лучанок, як яна называецца і з якімі падзеямі звязана?

Назавіце беларускіх паэтаў, на чые вершы напісаў песні І. Лучанок.

Якія песні І. Лучанка сталі лаўрэатамі ўсесаюзных конкурсаў песні?

Назавіце айчынных і замежных выканаўцаў песень І. Лучанка.

Складзіце пералік песень І. Лучанка па блізкасці тэматыкі.

Вывучыце мелодыю і акампанемент адной-дзвюх песень І. Лучанка.

Праслухайце песню «Письмо из 45-го» І. Лучанка і напішыце свае ўражанні пра яе.

Літаратура для чытання:

Ауэрбах Л. Белорусские композиторы. М., 1979.

Прокопцева В. К вопросу формирования жанра советской массовой песни в Белоруссии // Вопросы культуры и искусства Белоруссии. Мн., 1983. Вып. 2.

Ракова Е. Патриотическая тема в песенном творчестве белорусских композиторов // Музыкальная культура Белорусской ССР. М., 1977.

Сергіенка Р. Водгук часу (аб кампазіцыйных асаблівасцях песень І. Лучанка) // Мастацтва Беларусі. Мн., 1985. № 11.

Музычная літаратура для вывучэння:

Песні: «Жураўлі на Палессе ляцяць» (сл. А. Ставера), «Память сердца» (сл. М. Ясеня), «Спадчына» (сл. Я. Купалы).

Тэма III

ТВОРЧАСЦЬ БЕЛАРУСКІХ КАМПАЗІТАРАЎ МАЛОДШАГА ПАКАЛЕННЯ

(кароткі агляд па жанрах)*

Станаўленне творчай моладзі, выхаванцаў Беларускай кансерваторыі, у нацыянальнай музыцы другой паловы 1970 — 80-ых гг. Пераемнасць імі традыцый беларускай нацыянальнай культуры, творчасці кампазітараў старэйшага пакалення, а таксама савецкай і замежнай музыкі. Апора на перадавыя прынцыпы мастацтва, асновы беларускай народна-песеннай творчасці.

Жанравая і стылявая разнастайнасць творчасці маладых кампазітараў. Іх уклад у развіццё сімфанічнага жанру, оперы, балета, музычнай камедыі, кантаты, араторыі, вакальнай і харавой, камерна-інструментальнай і эстраднай музыкі, музыкі для аркестра народных і духавых інструментаў, тэатра і кіно.

Уключэнне лепшых твораў маладых аўтараў у рэпертуарны фонд нацыянальных выканальніцкіх калектываў, радыё і тэлебачання.

Неадназначнасць працэсу развіцця творчасці маладых кампазітараў, народжанай умовамі застойнага перыяду, супярэчнасцямі эканамічнага, грамадскага і ідэалагічнага жыцця краіны. Адсутнасць неабходнага мастацкага ўзроўню ў творах некаторых аўтараў. Паслабленне ўвагі да творчага пошуку, узбагачэння музычнага стылю, асваення сучасных сродкаў выяўленчасці. Недастатковае праяўленне творчай ініцыятывы, фантазіі, індывідуальнай самабытнасці.

§ 1. СІМФАНІЧНАЯ МУЗЫКА

Разнастайнасць жанраў: сімфоніі, сімфанічныя паэмы, уверцюры, сюіты, канцэрты. Увага некаторых аўтараў да драматычнай, філасофскай тэматыкі, праграмнасці; тэндэнцыя да выкарыстання музычна-выяўленчых сродкаў XX ст. (серыя, алеаторыка, санарыстыка, востра-экспрэсіўная гармонія, ускладненая фактура музычнай тканіны, мудрагелістая аркестроўка), наватарскіх прыёмаў у падыходзе да нацыянальнага фальклору. Асаблівая трактоўка жанру сімфоніі (камернасць, адначасткавасць цыкла). Паэма і сюіта — вядучыя жанры ў сімфанічнай музыцы 70—80-ых гадоў. Іх тэматычны і вобразны змест: аб героях Вялікай Айчыннай вайны (сюіта У. Дарохіна «Мемарыял»); аб гістарычных падзеях нашай Радзімы («Заслаўская легенда» В. Помазава, «Трубы трубяць гародзеньскія» У. Кандрусевіча, «Прысвячэнне старому гораду» В. Іванова); аб народных героях, апетых у літаратуры («Сымон-музыка» А. Хадоскі, «Бандароўна» Г. Гарэлавай); аб жыцці і быце народа («Заба-

---

* У гэтую тэму не ўключаны характарыстыкі тых кампазітараў, чыя творчасць разглядаецца ў манаграфічным раздзеле, не аналізуюцца творы кампазітараў, якія толькі пачынаюць сваю творчую дзейнасць.

вы» В. Войціка, «Ярмарачныя замалёўкі» Л. Шлег, «Арэшак» В. Помазава, «Крылы памяці» У. Кандрусевіча).

Нацыянальныя рысы паэм і сюіт, ператварэнне ў радзе твораў фальклорных крыніц, узбагачэнне музычнай мовы і форм, выкарыстанне сучасных прыёмаў тэхнікі пісьма.

Актыўная работа ў галіне сімфанічнага і канцэртнага жанраў: А. Соніна (чатыры сімфоніі, Канцэрт для клавіра і камернага аркестра), В. Войціка (дзве сімфоніі, Канцэрт для камернага аркестра і Канцэрт для кларнета), Л. Захлеўнага (дзве сімфоніі), Э. Зарыцкага (канцэрты для фартэпіяна, габоя, валторны з камерным аркестрам), У. Солтана (Сімфонія, Канцэрт для віяланчэлі і камернага аркестра), У. Дамарацкага (Канцэрт для аркестра), А. Елісеенкава (тры сімфоніі) і інш.

Сімфанічная сюіта «Мемарыял» У. Дарохіна (1984)

У аснове зместу твора — успаміны аб барацьбе савецкага народа з нямецкімі захопнікамі і яго перамозе над імі. Адлюстраванне ў сюіце тэндэнцый да камернізацыі, неакласіцызму, уласцівых беларускаму сімфанізму 1980-ых гадоў, побач з гэтым — сучасны падыход да рашэння мастацкай задачы, творчае выкарыстанне сродкаў музычнай выяўленчасці XX ст. Прынцып скразнога развіцця чатырох частак сюіты. Вобразны змест, асаблівасці формы і музычнай мовы кожнай часткі цыкла:

I — Інтрада (трохчасткавая форма; яе пачатковая тэма — інтанацыйная аснова твора).

II — Таката (свабоднае развіццё тэматычнага матэрыялу).

III — Сарабанда (трохчасткавая форма з уступам і эмацыянальна-напружанай сярэдзінай).

IV — Карагод (варыяцыйны прынцып развіцця).

§ 2. КАМЕРНА-ІНСТРУМЕНТАЛЬНАЯ МУЗЫКА

Любімы жанр многіх беларускіх кампазітараў. Разнастайнасць тэматыкі, вобразнага зместу, форм, выканальніцкіх саставаў, праграмнасць некаторых твораў, сувязь з нацыянальным меласам. Традыцыйныя сродкі музычнай мовы і форм (у большасці сольных і ансамблевых опусаў); эксперыментальныя творы (творы А. Соніна, А. Гурава, У. Капыцькі). Санаты, варыяцыйныя цыклы, прэлюдыі, сюіты, інструментальныя мініяцюры для розных інструментаў і ансамбляў у творчасці Л. Захлеўнага, У. Дамарацкага, Л. Мурашкі, У. Браілоўскага, В. Сярых; трыо, квартэты, квінтэты ў кампазітараў К. Цесакова, Л. Шлег, В. Войціка, В. Кузняцова, А. Кур'яна, А. Бандарэнкі, А. Залётнева, А. Навахроста, Л. Гуціна, Н. Усцінавай, А. Хадоскі і інш.

Санаты для фартэпіяна Л. Мурашкі, Трыо для скрыпкі, віяланчэлі і фартэпіяна В. Карэтнікава (аналіз твораў).

§ 3. КАМЕРНА-ВАКАЛЬНАЯ МУЗЫКА

Вакальныя цыклы, рамансы, маналогі. Узбагачэнне тэматычнага і жанравага зместу (вакальна-інструментальныя цыклы Л. Шлег

на вершы беларускіх паэтаў і Г. Гарэлавай — на вершы М. Багдановіча); узмацненне фальклорнай лініі, выкарыстанне літаратурных крыніц беларускіх (М. Багдановіч, Я. Купала), рускіх (Ф. Цютчаў, А. Пушкін) і замежных (Р. Бёрнс, П. Беранжэ) класікаў, сучасных паэтаў (М. Танк, Н. Гілевіч, У. Карызна, М. Ясень, А. Вярцінскі) і народных складальнікаў. Удачы Г. Гарэлавай («Дзявочыя песні», «Сумныя песні», «Хвала беднякам»), Л. Шлег («Вянок», «Голас зямлі»), Л. Захлеўнага («Памяць»), Э. Зарыцкага (вакальныя цыклы на вершы А. Вярцінскага і С. Маршака). Адметныя рысы камерна-вакальнай музыкі — глыбокая змястоўнасць тэкстаў, інтанацыйная разнастайнасць партый салістаў, фактурная «напоўненасць» суправаджэння.

Прызнанне выканаўцамі і слухачамі вакальнай музыкі Г. Гарэлавай. «Хвала беднякам» (сл. П. Беранжэ, 1983) — адзін з лепшых вакальных цыклаў кампазітара. Тэатралізацыя музыкі, мнагапланавасць музычнай драматургіі, партрэтаў; выкарыстанне разнажанравых кантрастных тэм; адзінства драматургіі, змацаванне яе лейттэмай лірычнага складу (I, II, VII часткі), лапідарнасць музычна-мастацкіх сродкаў; прысвячэнне цыкла паэту, які апявае высокія маральныя ідэалы.

§ 4. ПЕСНЯ

Разнастайнасць тэматыкі і форм; увага да эстраднай песні, харавых апрацовак народных песень. Аўтары папулярных песень — В. Іваноў, Э. Ханок, Л. Захлеўны, Э. Зарыцкі, У. Буднік, А. Залётнеў, М. Літвін, В. Раінчык, У. Прохараў. Песні для дзяцей (В. Сярых, А. Кочын, Э. Наско і інш.).

Песні для разбору: «Носите ордена» Л. Захлеўнага (сл. А. Коваля-Волкава) з цыкла «Памяць», «Я рисую людей» (сл. А. Папярэчнага, «То ли еще будет» (сл. І. Шаферана) Э. Ханка; «Развітальны вальс» В. Раінчыка (сл. У. Някляева), «Песня про Емелю» У. Прохарава (сл. А. Лягчылава).

§ 5. ХОР, АРАТОРЫЯ, КАНТАТА, ВАКАЛЬНА-СІМФАНІЧНАЯ ПАЭМА

Праяўленне нацыянальных асаблівасцей у музыцы і тэкстах твораў. Тэматыка твораў: сучаснасць, гераіка-патрыятычная барацьба беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны, памяць аб загінуўшых (кантата-рэквіем «Помните» Л. Шлег, кантата «Памяці Хатыні» В. Войціка і «В стенах Брестской крепости» Я. Касалапава, балада для дзіцячага хору «Священный курган» А. Навахроста), цікавасць да далёкага мінулага нашай Радзімы: Канцэрт для змешанага хору і салістаў на вершы Мітрапаліта Кіеўскага Іларыёна, XI ст.; «Похвала великому князю Владимиру Святославовичу» А. Бандарэнкі; араторыя «Песня об Игоре» Л. Шлег. Харавыя творы пра дзяцей і для дзяцей В. Войціка, А. Кочына, В. Сярых, Н. Усцінавай, Л. Мурашкі, У. Прохарава. Сярод яркіх твораў гэтага жанру — «Дзіцячыя гульні» (для хору хлопчыкаў) Л. Шлег, араторыя «Мальчыш-Кібальчыш» В. Раінчыка.

Апяванне ў харавой, кантатна-аратарыяльнай музыцы белару-

скага прафесійнага і народнага мастацтва (напрыклад, вакальна-сімфанічная паэма «Янка Купала» В. Помазава); замалёўка карцін прыроды, жыцця і быту народа («Жніўныя песні» Г. Гарэлавай, харавая сюіта «Лубок» і кантата «Трава-мурава» Л. Шлег).

Значная з'ява ў кантатна-аратарыяльным жанры — твор Г. Гарэлавай «В год мирового пожара» (для барытона, мецца-сапрана і сімфанічнага аркестра, сл. С. Кірсанава, В. Брусава, Л. Арагона, Г. Апалінэра, А. Рэмбо, А. Таркоўскага, П. Антакольскага; 1989). Ідэйна-мастацкі змест васьмі частак кантаты — паказ страшнага твару вайны, яе разбуральнай сілы, гора людзей, якія страцілі на полі бітваў сваіх блізкіх, любімых, родных. Роля жанравай накіраванасці ва ўспрыняцці музыкі слухачамі, напрыклад, глыбіні журботных пачуццяў у ціхай пасакаліі (ч. VIII — «Не зови меня», вершы П. Антакольскага, прысвечаныя паэтам загінуўшаму сыну). Асаблівае значэнне ў музычнай драматургіі жанра вальса (ч. III — «Париж 1940 года» на вершы Л. Арагона), які з'яўляецца кульмінацыяй усяго твора і своеасаблівай лейттэмай. У III частцы — вальс-рэфрэн у форме страфічнага ронда, у IV частцы («И если там я погибну» на вершы Г. Апалінэра) — вальс-водгулле, успаміны аб мінулым.

Высокая ацэнка харавога цыкла а капэла «Беларускі вянок» Л. Шлег (9 кантрастных хораў на беларускія народныя тэксты). Новы падыход кампазітара да фальклорнай тэматыкі, адлюстраванне эмацыянальна-вобразнага зместу паэтычных першакрыніц, арганічнае зліццё народнага і аўтарскага стыляў.

§ 6. ОПЕРА, БАЛЕТ, МУЗЫЧНАЯ КАМЕДЫЯ, МУЗЫКА ДА СПЕКТАКЛЯЎ, КІНАФІЛЬМАЎ

Характарыстыка беларускай оперы, балета, музычнай камедыі ў разглядаемы перыяд. Пошук новых стылявых тэндэнцый; сувязь з класічнымі традыцыямі (нацыянальны каларыт, меладызм, развітасць аркестравай партыі). Недастатковая ўвага кампазітараў Беларусі да музычна-тэатральных жанраў, цяжкасці іх асваення. Адзінкавыя ўдачы абмежаванага кола аўтараў у оперы, балеце, музычнай камедыі.

Значная падзея ў музычным жыцці рэспублікі — пастаноўка ў ДАБТ Беларусі оперы У. Солтана «Дзікае паляванне караля Стаха» (лібрэта С. Клімковіч па аднайменнай аповесці У. Караткевіча, 1989). Асаблівасці музычнай мовы оперы: вобразнасць, рэльефнасць замалёвак галоўных персанажаў. Пяшчотна-лірычныя, высакародныя інтанацыі ў характарыстыцы Яноўскай і Беларэцкага (дуэт, вальс); злавесная музыка ў паказе адмоўных персанажаў — уладальніка замка Дубатоўка і яго прыслужнікаў. Найбольш уражлівы эпізод оперы — сімфанічная карціна «Дзікае паляванне». Захапляючы напал, дынамізм сцэны, выкарыстанне ў музыцы выяўленчых элементаў (цокання капытоў, свісту ветру, пераклічкі паляўнічых рагоў, таямнічых шорахаў прывідаў замка).

Стварэнне радыё- і тэлеоперы (напрыклад, «Тараканище» Л. Шлег па казцы К. Чукоўскага, малюнкі Л. Шлег). Праяўленне ўвагі да дзіцячай оперы («Тайна старого замка» У. Кандрусевіча, «Трыццаць два асілкі» Н. Усцінавай, «Каваль — залатыя рукі» Л. Шлег).

Своеасаблівасць жанру народнай оперы «Калядкі» Л. Шлег (сл. народныя).

Стварэнне У. Кандрусевічам балета «Крылы памяці» (лібрэта Л. Стэйланд, 1988). Арыгінальнасць задумы балета, дзе апяваецца беларуская жанчына-маці, якая страціла ў гады Вялікай Айчыннай вайны пецярых сыноў; увасабленне ў творы памяці пакаленняў. Сімфанізм музыкі балета, характарыстыка галоўнай гераіні і яе сыноў; паказ ворагаў (лейттэма фашыстаў).

Праца іншых кампазітараў у жанрах балетнай музыкі: сюіта «Лялькі» В. Помазава, вакальна-харэаграфічныя карціны «Наваселле» В. Войціка, «Вясенняя кампазіцыя» У. Будніка і інш.

Музычная камедыя. Новыя аўтары, якія працягваюць традыцыі М. Чуркіна, Ю. Семянякі, Я. Глебава: А. Мдзівані («Дзяніс Давыдаў»), Р. Сурус («Несцерка», «Судная гадзіна»), У. Кандрусевіч («Нявесты для Марціна»), У. Палуэктаў («Кароль-алень», «Граф Монтэ-Крыста»).

Захапленне маладых кампазітараў напісаннем музыкі да драматычных спектакляў, тэле- і радыёпастановак, кінафільмаў. Разнастайнасць тэматыкі, стыляў. Сярод актыўных аўтараў — П. Альхімовіч, Э. Зарыцкі, Л. Захлеўны, У. Кандрусевіч, В. Кандрасюк, У. Капыцька, Л. Шлег, Э. Ханок.

§ 7. МУЗЫКА ДЛЯ АРКЕСТРА БЕЛАРУСКІХ НАРОДНЫХ ІНСТРУМЕНТАЎ

Адна з вядучых галін творчасці беларускіх кампазітараў другой паловы 1970—1980-ых гадоў. Нацыянальны склад твораў, разнастайнасць іх тэматыкі, шматжанравасць (сімфоніі, сімфаньеты, паэмы, канцэрты, сюіты, варыяцыі, рапсодыі, фантазіі, уверцюры і інш.). Своеасаблівасць музычнай мовы, прасякнутай фальклорнымі інтанацыямі, афарбаванай характэрнымі тэмбравымі, лада-гарманічнымі спалучэннямі; сюжэтная і несюжэтная праграмнасць («Кірмаш» Л. Гуціна, «Палескае свята» В. Іванова, «Купальская ноч» А. Залётнева).

Значны ўклад у рэпертуар аркестра беларускіх народных інструментаў В. Помазава: паэма «Заслаўская легенда» і сюіта «Батлейка». Самабытнасць кампазітарскага почырку В. Помазава: душэўная шчодрасць, неўтаймаванасць фантазіі, інтанацыйная свежасць, шчырасць музычных тэм. Праяўленне гэтых рыс у сюіце «Батлейка» (1983). Пяць кантрастных частак кампазіцыі: пралог «Бітва Аляксандра Македонскага», «Калыханка», «Карчмар», «Антон з казой і Антоніха». Роля ў музычнай драматургіі сюіты «батлеечнай» тэмы, блізкай да інтанацый беларускай танцавальнай мелодыі «Кросны».

«Сюіта ў старадаўнім стылі» В. Войціка (1976) — яркі ўзор спалучэння беларускіх народных інструментаў (цымбал) з інструментамі сімфанічнага (камернага) аркестра. Неакласіцысцкія тэндэнцыі, адлюстраванне стылістычных асаблівасцей музыкі барока, выкарыстанне традыцыйнай схемы XVII—XVIII стст. у пабудове сюіты: I частка — павольная Алеманда, II — рухомая Куранта, III — журботна-драматычная Сарабанда, IV — імклівая Жыга.

§ 8. ЭСТРАДНАЯ МУЗЫКА

Актыўны ўдзел кампазітараў у напісанні твораў гэтага жанру.

Віды эстраднай музыкі — песні, інструментальныя мініяцюры, сюіты і інш. Сярод твораў эстраднай музыкі — сюіта «Цудоўны дзень» В. Іванова, «Рэгтайм» для скрыпкі і фартэпіяна В. Кузняцова, «Канцэртная п'еса» для дзвюх домраў, ударных і фартэпіяна У. Кур'яна.

Найбольш папулярныя аўтары інструментальнай і вакальнай эстраднай музыкі — У. Мулявін, В. Раінчык, В. Іваноў, Э. Ханок, У. Буднік, Э. Зарыцкі, Л. Захлеўны, У. Прохараў, А. Елісеенкаў і інш.

ЗАКЛЮЧЭННЕ

СУЧАСНЫ СТАН БЕЛАРУСКАЙ ПРАФЕСІЙНАЙ МУЗЫКІ (ПРАБЛЕМЫ І ПЕРСПЕКТЫВЫ РАЗВІЦЦЯ)

Стварэнне нацыянальнай кампазітарскай школы і кадраў музыкантаў-выканаўцаў. Разнастайнасць жанраў нацыянальнай музыкі. Выкананне твораў беларускіх кампазітараў за мяжой. Грамадскае прызнанне найбольш яркіх твораў. Фарміраванне творчых індывідуальнасцей кампазітараў.

Развіццё беларускай музыкі ў пасляваенны перыяд.

Беларуская музыка на сучасным этапе. Складанасць і неадназначнасць творчых працэсаў ва ўмовах застойнага перыяду. Задачы беларускіх кампазітараў па далейшаму развіццю нацыянальнай музыкі і духоўнаму адраджэнню народа. IX і X з'езды кампазітараў Беларусі.

Пытанні і творчыя заданні па тэме:

Назавіце эстрадныя песні Э. Ханка.

Што напісана Л. Шлег для харавых калектываў?

Хто з кампазітараў актыўна піша для аркестра беларускіх народных інструментаў?

Які твор з'явіўся асновай для лібрэта оперы «Дзікае паляванне караля Стаха» У. Солтана?

Якія сімфанічныя творы беларускіх кампазітараў вы слухалі ў канцэртнай зале Беларускай дзяржаўнай філармоніі?

Складзіце праграму з вашых любімых эстрадных твораў беларускіх кампазітараў для канцэрта па радыё.

Зрабіце бібліяграфію творчасці Г. Гарэлавай або Л. Шлег (у бібліяграфічным аддзеле бібліятэкі).

Складзіце пералік твораў беларускіх кампазітараў, выкананых па беларускаму радыё і тэлебачанню ў адну з нядзель.

Літаратура для чытання:

Аладова Р. «Фольклорный» камерно-вокальный цикл в белорусской музыке 70-х гг. // Вопросы культуры и искусства Белоруссии. Мн., 1988. Вып. 7.

Аладова Р. «Детский» камерный вокальный цикл в белорусской музыке 70-х годов // Вопросы культуры и искусства Белоруссии. Мн., 1984. Вып. 3.

Антонович В. Народная песня в творчестве молодых белорусских композиторов // Вопросы культуры и искусства Белоруссии. Мн., 1983. Вып. 2.

Ермоченков Г. Новые тенденции в современной музыке для оркестра народных инструментов // Вопросы культуры и искусства Белоруссии. Мн., 1986. Вып. 5.

Загородний Г. Музыки высокое призванье. Мн., 1988.

Сергиенко Р. О фольклорной традиции в произведениях белорусских композиторов на народные тексты // Вопросы культуры и искусства Белоруссии. Мн., 1984. Вып. 3.

Музычная літаратура для вывучэння:

В. Кузняцоў. Камерная сімфонія.

У. Дарохін. Сімфанічная сюіта «Мемарыял».

В. Карэтнікаў. Трыо для скрыпкі, віяланчэлі і фартэпіяна (ч. I).
У. Кур'ян. Струнны квартэт № 2 (фрагмент).
Л. Мурашка. Саната для фартэпіяна.
Г. Гарэлава. Вакальны цыкл «Хвала беднякам» (сл. П. Беранжэ), кантата «В год мирового пожара» (ч. III, Вальс); Саната для скрыпкі і фартэпіяна (фінал).
Л. Шлег. Харавая сюіта «Беларускі вянок» (сл. народныя).
А. Друкт. «Тры набобы» (сл. М. Агніўцава).
В. Раінчык. Араторыя «Мальчиш-кибальчиш» (фінал).
У. Солтан. Опера «Дзікае паляванне караля Стаха» (сімфанічная карціна «Дзікае паляванне»).
У. Кандрусевіч. Балет «Крылы памяці» (сімфанічная сюіта).
В. Помазаў. Сюіта «Батлейка».
В. Войцік. Сюіта ў старадаўнім стылі.
Э. Ханок. Эстрадныя песні (дзве-тры па выбару настаўніка).

ДАДАТАК № 1

ЗМЕСТ ФОНА- І НОТНЫХ ХРЭСТАМАТЫЙ ДЛЯ КЛАСНАЙ І ПАЗАКЛАСНАЙ РАБОТЫ

Гукавыя і нотныя дапаможнікі для зручнасці настаўнікаў складаюцца па жанраваму прынцыпу і ўключаюць узоры як народнай, так і прафесійнай беларускай музыкі. У сувязі з абмежаваным аб'ёмам часу, які прызначаны для курса беларускай музычнай літаратуры ў ДМШ, у радзе выпадкаў у фона- і нотную хрэстаматыі ўключаны толькі асобныя часткі або фрагменты буйных твораў.

Пры вывучэнні беларускай музыкі рэкамендуецца побач з названымі хрэстаматыямі карыстацца таксама грампласцінкамі з запісамі твораў беларускіх кампазітараў, выданнямі партытур, клавіраў і інш.

Хрэстаматыі могуць быць таксама выкарыстаны ў музычных, музычна-педагагічных і культасветвучылішчах Беларусі, у Інстытуце культуры, на музычна-педагагічных факультэтах педагагічных інстытутаў, у сярэдніх агульнаадукацыйных школах.

Пералік твораў для класнай работы

1. Старадаўняя музыка

«Полацкі сшытак» — узор беларускай свецкай музыкі XVI—XVII стст. (тры-чатыры п'есы ў выкананні інструментальнага ансамбля «Кантабіле»).

Іосіф Шадурскі. Танец «Лявоніха» з музычнай камедыі «Тарас на Парнасе» (У зб.: С околиц Витебска. Этнографическое обозрение, 1912). Перадрукаваны ў кн.: Б. С. Смольскі. Беларускі музычны тэатр. Мн., 1963. С. 69—71.

2. Беларускія народныя песні і танцы

«Ой, рана на Йвана», «Кума мая, кумачка», «Рэчанька», «Ох, і сеяла Ульяніца лянок», «Ой, палын мой, палыночак», «Ой, у бары зязюлька кукавала».

«Юрачка». «Лявоніха». «Бульба».

3. Апрацоўкі беларускіх народных песень і танцаў

«Калыханка» (у выкананні дзіцячага фальклорнага ансамбля Віцебскай вобласці). «Касіў Ясь канюшыну» (у выкананні ансамбля «Песняры», апр. У. Мулявіна). «Дудары» (п'еса для ансамбля дудароў у апр. І. Кузняцова). «Беларуская мелодыя» І. Жыновіча (для аркестра беларускіх народных інструментаў). «Бульба» (танец для сімфанічнага аркестра з балета «Мара» Я. Глебава).

4. Вакальная музыка

Песні

Н. Сакалоўскі. «Песня пра Нёман» (сл. А. Астрэйкі).

У. Алоўнікаў. «Радзіма мая дарагая» (сл. А. Бачылы), «На Палессі гоман, гоман» (сл. П. Броўкі), «Лясная песня» (сл. А. Русака).

С. Палонскі. «Вечарынка у калгасе» (сл. Я. Купалы).

І. Лучанок. «Мой родны кут» (сл. Я. Купалы). «Память сердца» (сл. М. Ясеня), «Письмо из 45-го» (сл. М. Ясеня), «Дударыкі» (сл. А. Грачанікава), «Жураўлі на Палессе ляцяць» (сл. А. Ставера).

Ю. Семяняка. «Люблю цябе, Белая Русь», «Якая ты цудоўная, Радзіма!» (сл. У. Карызны), «Явар і каліна» (сл. Я. Купалы), «Дняпро» (сл. А. Русака), «Ой, шумяць лясы зялёныя» (сл. А. Сіткоўскага), «Беларусь — мая песня» (сл. М. Браўна).

В. Іваноў. «Где ты, детство мое» (сл. Р. Ахматавай).

Э. Ханок. «Я рисую людей» (сл. Вольгі Паляковай), «То ли еще будет» (сл. І. Шаферана).

В. Раінчык. «Развітальны вальс» (сл. У. Някляева) у выкананні дзіцячага хору Баранавіцкай СШ.

У. Прохараў. «Песня про Емелю» (сл. А. Лягчылава).

Л. Захлеўны. «Носите ордена» (песня з цыкла «Памяць», сл. А. Каваль-Волкава).

Рамансы

Г. Гарэлава. «Вакальны цыкл на вершы П. Беранжэ»: «Хвала беднякам», «Старый сержант»; «Вакальны цыкл на вершы М. Багдановіча» (для голасу, флейты і фартэпіяна): 2 рамансы на выбар.

Л. Абеліёвіч. «Ноч» (сл. М. Багдановіча).

А. Багатыроў. «Маладыя гады» (сл. М. Багдановіча).

Харавая музыка

А. Багатыроў. «Прыляцелі вятры» (сл. У. Дубоўкі), «Шумелі бярозы» (сл. М. Лужаніна).

Ю. Семяняка. «Хатынскія званы» (сл. А. Бачылы).

А. Мдзівані. «Снапочак» (сл. народныя): «Снапочак», «Купалінка», «Там, за садамі».

Л. Шлег. «Лубок» (сл. народныя); дзевяць хораў «Беларускі вянок» для жаночага хору а капэла: 2 хоры на выбар.

А. Бандарэнка. «Похвала великому князю Вл. Святославовичу» (харавы канцэрт, сл. Мітрапаліта Кіеўскага Іларыёна, XI ст.): фінал.

І. Лучанок «Спадчына» (сл. Я. Купалы).

5. Кантаты і араторыі

А. Багатыроў. «Сказка о Медведихе» (сл. А. Пушкіна): сола Мядзведзіхі «Ох, вы детушки-медвежатушки», хор «Медвежатушки испугалися»; «Беларускім партызанам» (сл. Я. Купалы), «Беларускія песні» (сл. народныя і Н. Гілевіча): ч. I і фінал.

Г. Вагнер. «Вечна жывыя»: уступ і заключэнне.

Д. Смольскі. «Мая Радзіма»: ч. V, VIII, IX.

В. Раінчык. «Мальчыш-Кібальчыш» (сл. У. Някляева): фінал у выкананні вакальна-інструментальнага ансамбля школьнікаў г. Віцебска.

Л. Шлег. «Песня пра Ігара»: ч. IX.

С. Картэс. «Памяці паэта»: фінал.

Г. Гарэлава. «В год мирового пожара»: ч. III.

6. Сімфанічная музыка

М. Чуркін. Сімфаньета Сі-бемоль мажор: ч. I, IV.

Я. Цікоцкі. «Песня пра Буравесніка».

М. Аладаў. Сімфонія № 9: ч. III.

А. Багатыроў. Сімфонія № 1: ч. I.

Я. Цікоцкі. Сімфонія № 4.

Я. Глебаў. Сімфонія № 2: ч. I, III; «Палеская сюіта»: ч. I, V.

А. Мдзівані. Сімфонія № 6 («Полацкія пісьмёны»): адна частка на выбар.

В. Дарохін. «Мемарыял».

Г. Вагнер. Канцэрт для фартэпіяна з аркестрам № 1: фінал.

Л. Абеліёвіч. Сімфонія № 3: фінал.

Д. Смольскі. Сімфонія № 5 для саліруючай скрыпкі і аркестра: ч. I; Канцэрціна для скрыпкі і струннага аркестра.

Ф. Пыталеў. Сімфонія № 7: ч. I.

Д. Камінскі. Канцэрт для фартэпіяна з аркестрам: ч. I.

П. Падкавыраў. Другі канцэрт для скрыпкі з сімфанічным аркестрам: фінал.

7. Камерна-інструментальная музыка

М. Аладаў. Фартэпіянны квінтэт: ч. II.

М. Чуркін. «Калыханка».

А. Багатыроў. Фартэпіяннае трыо: ч. III (Балада).

П. Падкавыраў. 24 прэлюдыі для фартэпіяна (№ 6, 20).

Л. Абеліёвіч «Фрэскі»: п'есы № 1, 2 (сшытак I).

Д. Смольскі. Струнны квартэт: ч. I.

Д. Камінскі. Прэлюдыі і фугі: 1—2 на выбар; фантазія для фартэпіяна «Юрачка».

8. Оперы, балеты, музычныя камедыі

Я. Цікоцкі. «Міхась Падгорны»: арыя Міхася (дз. II), песня Міхася з хорам (дз. III).

А. Багатыроў. «У пушчах Палесся»: арыя Кузьміча (дз. I), хор партызан «Гэй, у лесе» (дз. III).

С. Картэс. «Джардана Бруна»: арыя Дж. Бруна, сцэна спальвання на кастры.

У. Солтан. «Дзікае паляванне караля Стаха»: сімфанічная карціна «Дзікае паляванне».

В. Залатароў. «Князь-возера»: дуэт Надзейкі і Васіля (дз. I), адажыо Надзейкі і князя (дз. II).

Г. Вагнер. «Падстаўная нявеста»: Беларуская полька, «Абэрак»; «Святло і цені»: танцы моладзі (дз. I), адажыо Анежкі і Алеся (дз. III).

Я. Глебаў. «Альпійская балада»: маналог Івана (карціна I), «Тарантэла», «Марш фашысцкіх карнікаў»; «Ціль Уленшпігель»: «Фландрыя», танец Ціля, лірычнае адажыо Ціля і Нэле (дз. I), «Таверна» (дз. II).

У. Кандрусевіч. «Крылы памяці» (балетная сюіта).

Ю. Семяняка. «Паўлінка»: арыя Паўлінкі, песня Якіма з хорам («Мужык»).

А. Мдзівані. «Дзяніс Давыдаў»; раманс Дзяніса, хор гусараў.

Р. Сурус. «Несцерка»: хоры «Ой, ляцелі гусанькі» і «Сваток», песня Несцеркі.

9. Музыка для народных інструментаў

Д. Камінскі. Першы канцэрт для цымбал і сімфанічнага аркестра (Соль мажор).

Д. Смольскі. Першы канцэрт для цымбал і аркестра народных інструментаў До мажор; Другі канцэрт для цымбал і камернага аркестра (Ля мінор): ч. II.

В. Войцік. Сюіта ў старадаўнім стылі.

В. Помазаў. Сюіта «Батлейка»: «Бітва Аляксандра Македонскага», «Калыханка», «Антон з казой і Антоніха».

10. Эстрадная музыка

А. Елісеенкаў. «Рэтра».

В. Іваноў. «Рамантычны вальс», «Прагулка».

У. Прохараў. «Сувенір».

Р. Сурус. «Добры настрой».

Пералік твораў для пазакласнай работы

1. Старадаўняя музыка

Ананімны зборнік «Куранты» — узор вакальнай лірыкі XVIII ст., якая бытавала на тэрыторыі Беларусі і іншых славянскіх краін: два-тры нумары (у выкананні Мінскага дзяржаўнага камернага хору пад кіраўніцтвам І. Мацюкова).

Камічная опера Вардоцкага «Апалон-заканадаўца, або Рэфарміраваны Парнас» — прыклад оперна-тэатральнай практыкі канца XVIII ст. на тэрыторыі Беларусі: два-тры фрагменты.

2. Беларускі фальклор у творчасці кампазітараў

Г. Вагнер. «Юрачка» (з балета «Святло і цені»).

Р. Пукст. «Саўка ды Грышка» (з оперы «Марынка»).

У. Кур'ян. «Капыльскія дудары» (для фальклорнага аркестра).
А. Мдзівані. «Бульба» (для аркестра народных інструментаў); «Рэчанька» (з рэпертуара ВІА «Песняры»).

3. Вакальная музыка

Песні

Р. Пукст. «Шоўкавыя травы» (сл. А. Астрэйкі).
Д. Лукас. «Сінічка» (сл. М. Клокавай).
Э. Зарыцкі. «Песні на сатырычныя вершы С. Маршака».
К. Цесакоў. «Вясёлыя дзіцячыя песні на вершы С. Маршака».
Н. Усцінава. «Песня про Фому» (сл. С. Міхалкова).
Я. Цікоцкі. «Піянерская гама» (сл. Э. Агняцвет).
Э. Тырманд. «Піянерская гама» (сл. Э. Агняцвет).
М. Мацісон. «Слуцкія ткачыхі» (сл. М. Багдановіча).
Л. Шлег. «Дзіцячыя гульні» (для хору хлопчыкаў, сл. народныя).

Рамансы

Э. Тырманд. «Афрыканскія балады» (сл. Б. Дадзье): «Осуши свои слёзы, Африка», «Это я знаю», «Чернота моей кожи».
Д. Лукас. «Стаяла я і слухала вясну» (сл. Л. Украінкі).

4. Інструментальная музыка

М. Аладаў. Сімфаньета До мажор: ч. I.
Л. Абеліёвіч. Першая сімфонія: ч. I.
У. Алоўнікаў. Сімфанічная сюіта «Песні міру»: ч. III (Песня адзінства).
Р. Пукст. Шостая сімфонія: ч. II (Вальс).
К. Цесакоў. Квартэт № 2: ч. I.
А. Багатыроў. Фартэпіянныя п'есы: «Роздум».
Я. Глебаў. «Фантастычныя танцы»; калыханка з балета «Мара» (у выкананні сімфанічнага аркестра і ў пералажэнні аўтара для скрыпкі і фартэпіяна).
В. Помазаў. Сюіта «Арэшак».
В. Карэтнікаў. Трыо для скрыпкі, віяланчэлі і фартэпіяна: ч. I.
Л. Мурашка. Саната для фартэпіяна.
У. Кур'ян. Струнны квартэт № 2: фрагмент.
У. Солтан. «Мелодыя» (для ансамбля скрыпачоў); Канцэрт для віяланчэлі: ч. I.
У. Дамарацкі. Парціта для дзвюх труб, валторны, трамбона і трубы.
У. Кандрусевіч. П'есы для гітары: на выбар.
А. Сонін. Сюіта для фартэпіяна «7 п'ес з Крыма»: 2 п'есы на выбар.
В. Залатароў. «Музычная табакерка».
